№ 26 (480) 21 ліпеня 2006

www.nn.by

# Наша Ніва

А Я Б Е Л А Р У … З Э Т А

ISSN 1819-1614

З… …ападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Фонд выданьня … …ева, у пятніцы




Студэнт-міжнароднік Артур Фінькевіч будзе працаваць чорнарабочым на будоўлі. Рэпартаж з магілёўскай “хіміі”. Старонка 4.

# Клён Фінькевіча

### Паказальны прысуд Казуліну

Карэспандэнт “НН” прысутнічаў у судзе ўсе дні працэсу. **Старонка 14.**

### Манія мізэрнасьці

Апэляцыі апазыцыі да краінаў Захаду і да Пуціна перад самітам G8 выклікалі неадназначныя пачуцьці. Піша Віталь Тарас. **Старонка 5.**

### Божая кара

за маўчаньне ксяндзоў падчас барбарскай рэканструкцыі Горадні? Вэрсіі пажару ў Фарным касьцёле разглядае Ірына Чарняўка. **Старонка 22.**

### Рэвалюцыя ў шашачкі

Бунт менскіх таксістаў. **Старонка 16.**



### Вялікі трускалкавы шлях

Большасьць жыхароў Лунінеччыны жыве з клубніцаў. Рэпартаж Сямёна Печанка. **Старонка 40.**

### Дамавік у Плястыляндыі

“Газэтка дзеткам” — **старонка 42.**






# Адзін дзень у Расеі

Чаму Расея, мяжуючы з Захадам і маючы такую доўгую гісторыю кантактаў зь ім, застаецца фатальна адрознаю, нават варожаю і процістаўляе сябе яму? У дзень пецярбурскага саміту G8 **Барыс Тумар** і **Сяргей Мікулевіч** выправіліся ўздоўж межаў Беларусі па той палосцы Заходняй Расеі, што калісьці належала Рэчы Паспалітай, а пасьля ўваходзіла ў рысу аседласьці. Рэшткі велічных барочных храмаў, распуста прыдарожных кавярняў і дзікія нетры пакінутых сёлаў – сафары за тры гадзіны язды ад Менску. **Старонка 8.**



## у нумары

### люстра дзён

Клён Фінькевіча ........ 4
Паказальны прысуд Казуліну ........ 14
«Арышт Казуліна быў толькі пытаньнем часу» ........ 15
Рэвалюцыя ў шашачкі ........ 16
Маральнасьць як палітычны чыньнік ........ 16
Ці гатовыя камуністы сысьці ў падпольле? ........ 17
Актывізаваліся нацболы ... 17
Як здароўе Бураўкіна і Тарасава? ........ 21
Гадавіна Грунвальду ў Горадні ........ 21
Божая кара ........ 22

### рэпартажы

Адзін дзень у Расеі ........ 24
Вялікі трускалкавы шлях . 40

### камэнтары

Віталь Тарас. Манія мізэрнасьці ........ 5
Аляксандар Класкоўскі. Інтым з Пуціным ........ 24

### хроніка

Павал Севярынец. Разарэньне рэжыму ........ 18
Хроніка ўціску і супраціву 4—17 ліпеня ........ 18

### культура

Дыскаграфія ........ 23
У Гомелі зь пяску вылупіцца цмок ........ 45
«Кінафармат «4х4» ........ 46
Да Купалы зь вершамі ...... 47

### газэтка дзеткам

Дамавік у Плястыляндыі .. 42

**КАМЭНТАР РЭДАКЦЫІ**

# Фонд Каліноўскага: шкода ці карысьць?

Адзін лоўкі малады чалавек, курсуючы між Польшчай і Беларусьсю, наладзіў выгадны бізнэс. Ён прапаноўваў моладзі за энную суму грошай вырабіць… вартыя рэкамэндацыі для атрыманьня стыпэндыі Каліноўскага ў Польшчы. І кліенты знаходзіліся. Бо што такое пара дзясяткаў даляраў, калі ты здаў у Беларусі тэсты на 30 балаў, а вучыцца хочацца.

Актывісты Праграмы Каліноўскага ў Польшчы выявілі махляра, змусілі пакаяцца і зьвярнуліся ў Рэдакцыю з просьбай агучыць ягонае імя. Ня будзем таго рабіць. Дамо шанец выправіцца яшчэ зусім маладому чалавеку.

Выезд студэнтаў на вучобу ў замежныя ўнівэрсытэты набыў настолькі масавы маштаб, што кранае розныя пытаньні — як этычныя, так і палітычныя.

«Людзі, што маглі прыносіць карысьць, разьехаліся зь Беларусі», — з горыччу кажа Артур Фінькевіч карэспандэнтам «НН», якія наведалі яго на «хіміі». Ён прыводзіць прыклад Барыса Гарэцкага, былога прэс-сакратара «Маладога фронту». «Але Гарэцкага яшчэ можна зразумець — яго хацелі «закрыць» па крыміналцы. Кепска, што сярод стыпэндыятаў праграмы імя Каліноўскага шмат людзей, якім зусім нічога не пагражала», — мяркуе палітвязень.

Фонд — адна з самых яркіх ідэяў апошняга часу — узьнік з жаданьня салідарнасьці. З ідэі даць эўрапейскую адукацыю будучай беларускай інтэлігенцыі. Па ўзорах дзейнасьці польскага нацыянальнага руху 80-х. Адрозьненьне 2000-х ад 1980-х, а Беларусі ад Польшчы ў тым, што сьвет глябалізаваны, а нацыянальная ўкарэненасьць многіх беларусаў нізкая. Адсюль і непакой: ці спрацуе ў нас схема, што апраўдала сябе ў Польшчы? Ці ня стануць стыпэндыі каналам адтоку мазгоў? Чаго больш ад дзейнасьці Фонду — карысьці ці шкоды?

На гэтае пытаньне адкажа толькі час. Але гэты адказ залежыць ад супрацоўнікаў Фонду. Іх дзейнасьць гісторыя ацэніць па тым, які працэнт стыпэндыятаў Фонду будзе вяртацца ў Беларусь. Гэты адсотак, у сваю чаргу, залежыць ад крытэраў адбору. І калі на стыпэндыі ў пагоні за колькасьцю будуць трапляць студэнты, якім на Беларусі не залежыць, якім яна фіялетавая, кажучы папросту, якія ня маюць намеру вяртацца на радзіму пасьля навучаньня, тады вынік дзейнасьці Фонду будзе мізэрным.

Апісаная вышэй сытуацыя з маладым чалавекам — першы трывожны званочак. Трэба пільнасьць. Бо толькі-толькі ў Фонд Каліноўскага пранікнуць карупцыя і кумаўство, толькі-толькі «мост салідарнасьці» ў сяброўскія краіны будуць выкарыстоўваць аматары высокіх спажывецкіх стандартаў, не заробленых уласным мазалём, гэта стане ня проста шкодай, а прысудам Фонду.

«НН» будзе адсочваць сытуацыю з выездам актывістаў нацыянальнага руху на вучобу за мяжу. А маладыя людзі няхай думаюць…

Рэпартаж пра жыцьцё А.Фінькевіча ў Магілёве — старонка 4.

у кнігарнях з 14 ліпеня




ПАДПІСНЫ ІНДЭКС 00345

# Клён Фінькевіча

Карэспандэнты «НН» пабывалі ў наймалодшага зь беларускіх палітвязьняў.

Магілёўская «хімія» месьціцца ў раёне рабочых інтэрнатаў. Толькі заўважыўшы краты на вокнах, зразумееш, што палову аднаго з гэтых шэрых савецкіх будынкаў займае пэніцыярная ўстанова. У другой палове жывуць свабодныя людзі. Два сьветы пад адным дахам, два ўваходы з розных бакоў.

Усярэдзіну наведнікаў не пускаюць, сустракацца з «хімікамі» можна ў альтанцы перад ганкам. Там мы і знайшлі Артура. Абапал яго сядзелі дзьве прыгажуні: сяброўкі-магілёўкі прынесьлі клубніцаў.

Мясцовыя юнакі і юначкі прыходзяць на праспэкт Пушкіна, 65 штодзень. А вось з сталіцы мы наведаліся да Артура першыя. «Колькі чалавек прыйшло падтрымаць Казуліна ў суд?» — было першае Фінькевічава пытаньне. Кароткахвалёвага прымача, па якім ён мог бы слухаць «Свабоду», у яго пакуль няма. Няма й тэлевізарчыка. Дарэчы, Артур не адмовіўся б, калі б хтосьці з магілёўцаў падкінуў які старэнькі «Сапфір».

У адным пакоі з Артурам жывуць яшчэ двое. 40-гадовы магілёўскі шафёр, які ўчыніў дэбош у краме, і 20-гадовы хлопец з Быхава — раней судзімы. Гэты сядзіць за галабурду: прабраўся да свайго непрыяцеля дахаты, выбіўшы шыбу, і наклаў на кухні кучу.

Пакой памерам мэтраў дзесяць. Душа й туалета, вядома, няма. За такую «кватэру» з Артура будуць вылічваць па 20 тысячаў на месяц.

Кантынгент на гэтай «хіміі» пераважна тутэйшы, магілёўскі. Зь Менску тут усяго пяць чалавек, у тым ліку тры — зь Фінькевічавай Чыжоўкі.

Па рэжыме гэта адна з самых строгіх «хіміяў» у краіне, амаль як калёнія. Дзякуй Богу, што хоць крымінальная герархія ў турмах развальваецца. Гэтая савецкая спадчына ў незалежнай Беларусі адмірае, прыкладна як і дзедаўшчына ў войску.

Калі Артура трымалі на Валадарцы, аднойчы яго паказалі па БТ на мітынгу з мэгафонам, дык ён стаў героем камэры.

Вядома ж, і тут на «хіміі» ўсе ў курсе, што Артур палітычны. Усіх уразілі чамаданы, зь якімі ён прывалокся, здзіўляюць штодзённыя наведнікі. Нампаліт жорстка засьцерагае Артура ад любых формаў палітычнай агітацыі. А ну ж самаарганізуюцца?!. А тут яшчэ ў суседнім з «хіміяй» будынку пражывае вядомая актывістка Плошчы Крысьціна Шацікава.

«Краіна зьмянілася, пакуль я сядзеў на Валадарцы. Я быў у шоку, колькі людзей на вуліцах носяць значкі «За Свабоду». Нават брат майго дзеда, адстаўны генэрал КДБ, слухае цяпер радыё «Свабода».

Аднак ня ўсё ў цяперашнім стане беларускага дэмакратычнага руху Артуру даспадобы. «Людзі, што маглі прыносіць карысьць, разьехаліся зь Беларусі», — з горыччу кажа ён. І прыводзіць прыклад Барыса Гарэцкага, былога прэс-сакратара «Маладога фронту». Але Гарэцкага яшчэ можна зразумець — яго хацелі «закрыць» па крыміналцы. Кепска, што сярод стыпэндыятаў праграмы імя Каліноўскага шмат людзей, якім зусім нічога не пагражала.

«Зубры» няправільна зрабілі, самараспусьціўшыся, мяркуе ён. «Бунт», на ягоную думку, ня мае пэрспэктываў: большасьць яго сяброў уцякла з краіны пасьля першага ж ціску…

Артур мае права даваць ацэнкі.

У «Маладым фронце» Фінькевіч з 2001 году. У арганізацыю ён прыйшоў сам. Шукаў яе, бо ня мог цярпець прыгнёту беларушчыны. Ягоныя бацькі ў 1994-м галасавалі за Пазьняка. А сам ён, дзесяцігадовае дзіця, плакаў пасьля рэфэрэндуму 1995 году, калі здавалася — Беларусі канец.

Гэтак жа знаходзілі арганізацыю і ягоныя калегі. Зьміцер Дашкевіч у 2001 годзе прыехаў з Горадні, каб адшукаць «зуброў». Блукаў па вялізным незнаёмым Менску, блукаў, шукаў, шукаў — не знаходзіў. Урэшце на вуліцы Варвашэні пабачыў на адным з дамоў бел-чырвона-белы сьцяг. Зайшоў — а там Севярынец…

«Мы штогод з Дашкевічам сустракаліся на сутак 10—15 на Акрэсьціна. Там усе нашы стратэгіі й тактыкі абмяркоўваліся», — успамінае Артур, нібы даўняе мінулае. Тут іншы сьвет, тут іншы клопат.

На мінулым тыдні вырашылася, на якую працу Фінькевіча пашлюць. Артур два гады адвучыўся па спэцыяльнасьці «Міжнародныя адносіны», але такой працы яму ў Магілёве дакладна ня сьвеціць. Першыя ягоная адукацыя — мясьнік. Аднак і сякеру «хіміку» не давераць. Артура чакае некваліфікаваная праца на будоўлі. Будоўля-турма-будоўля-турма…

Артур характэрна падціскае вусны. Яму нялёгка тут. Яму 21 год.

Натхняе хіба тое, што прэстыжная ўкраінская Кіева-Магілянская акадэмія прыняла яго на дыстанцыйнае навучаньне. Ён зьбіраецца штудзіраваць падручнікі і здаваць экзамэны пісьмова. Ён марыць калісьці паслужыць Беларусі ў якасьці дзяржаўнага чыноўніка. Калі краіне будуць патрэбныя ўрадоўцы-патрыёты. Што прывезьці? Кніг, кніг, часопісаў! — просіць ён.

У верасьні чакаецца чарговая амністыя. Калі Артур падпадзе пад яе, ён мае шанцы вызваліцца ўжо ў сьнежні.

Вые сырэна. Гэта значыць: 19.00. Час спатканьняў скончаны. Вязьняў зьбіраюць на вечаровае шыхтаваньне.

Артур паціснуў нам рукі, двойчы паціснуў, а мы яшчэ хвіліну стаім. Глядзім на ягонае акно — трэцяе справа на другім паверсе.

Над альтанкаю для спатканьняў плешча лісьцем клён. Верыцца, што праз сто гадоў гэтых пачварных савецкіх шэрых будынкаў ня стане, а клён будзе шумець, і пад ім пакладуць валун: «Тутака ў 2006-м адбываў катаргу змагар за свабоду Беларусі Артур Фінькевіч. Пад гэтым дрэвам ён сустракаўся зь людзьмі, якія яго адведвалі».

**Барыс Тумар, Сяргей Мікулевіч**




**Да Артура Фінькевіча штодзень прыходзяць магілёўцы.**

# Манія мізэрнасьці

Апэляцыі апазыцыі да краінаў Захаду і да Пуціна перад самітам G8 выклікалі неадназначныя пачуцьці. Піша **Віталь Тарас.**

Падчас фіналу Чэмпіянату сьвету па футболе, на вачох у мільярдаў тэлегледачоў, капітан зборнай Францыі Зыдан ударыў галавой у грудзі італьянскага футбаліста Матэрацы. Гэта сталася галоўнай падзеяй ня толькі ЧС-2006, але сусьветнай палітыкі.

Некалькі дзён запар самыя буйныя інфармацыйныя кампаніі плянэты бясконцую колькасьць разоў паўтаралі кадры відэазапісу, на якіх высьвятляюць паміж сабой адносіны дзьве футбольныя зоркі.

### Скажыце «чы-ы-ыз»!

Інтэрвію Зыдана, у якім ён тлумачыў, чым яго гэтак зьняважыў італьянец, падавалася ў тэленавінах Сі-Эн-Эн і Бі-Бі-Сі адразу за паведамленьнем пра ваенную апэрацыю Ізраілю ў Лібане (фактычна, пачатак новай вайны на Блізкім Усходзе) і наступствы крывавых тэрактаў у Бамбэі.

Ня можа быць ніякіх прэтэнзіяў да тэлеканалаў. Актуальнасьць навінаў вызначаецца тым, што цікавіць найбольшую колькасьць гледачоў у пэўны момант. Мільярды футбольных заўзятараў больш цікавіць, што скажа Зыдан, чым тое, што скажуць ці зробяць Эхуд Ольмэрт, Ахмадзініжад ці нават Буш.

З гэтага гледзішча цалкам зразумела, што тэма саміту «вялікай восемкі» ў Пецярбурзе калі й прысутнічала ў выпусках навінаў, дык далёка не на першых месцах. За выключэньнем, зразумела, расейскіх каналаў, дзе інфармацыя даўно саступіла месца прапагандзе.

Сустрэчы лідэраў сямі найбольш індустрыяльна разьвітых краін сьвету, да якіх далучылася Расея, нічога, насамрэч, не вырашаюць і нікога ні да чаго не абавязваюць. Нефармальная сустрэча ёсьць нефармальнай сустрэчай, і ня больш за тое, нават калі сустракаюцца кіраўнікі супэрдзяржаваў. Гісторыя падчас такіх самітаў, як правіла, ня робіцца. Часьцей за ўсё, кіраўнікі дзяржаваў на іх проста

**Працяг на старонцы 6.**

# Манія мізэрнасьці

**Працяг са старонкі 5.**

фатаграфуюцца «для гісторыі».

Зразумела, для мэнтальнасьці былых савецкіх грамадзянаў, выхаваных на шанаваньні высокага начальства, прыезд у былую сталіцу Расейскай імпэрыі кіраўнікоў дзяржаваў Захаду — моцнае ўзрушэньне.

А для заходняга ж абываталя сам па сабе саміт G8 — малацікавая падзея. Вастрыні ранейшым самітам дадавалі «антысаміты» антыглябалістаў. Сутычкі анархістаў і «зялёных» зь сіламі правапарадку на подступах да месцаў, дзе праводзяцца сустрэчы ў вярхах, выклікаюць куды большую ўвагу прэсы, чым самі перамовы.

Расейскім спэцслужбам, аднак, удалося навесьці ў Санкт-Пецярбургу ўзорны парадак. У выніку горад на Няве цалкам нагадваў бы Маскву падчас Алімпіяды-80, калі ўсе «падазроныя элемэнты» — прастытуткі, алькаголікі і дысыдэнты — былі выселеныя ажно за 100-ты кілямэтар. І толькі 38 чалавек, якія спрабавалі перакрыць рух у цэнтры Санкт-Пецярбургу, у тым ліку беларусы, уратавалі гонар антглябалісцкага руху.

З улікам таго, што на дварэ 2006 год, грамадзкім актывістам і праваабаронцам з Расеі, а таксама Беларусі ўдалося усё ж такі напярэдадні саміту сабрацца разам, каб паспрабаваць зьвярнуць увагу Захаду на аўтарытарны характар рэжымаў абедзьвюх краін. Зь некаторымі актывістамі нават сустрэўся прэзыдэнт Буш. Ён запэўніў удзельнікаў сустрэчы, што не зьбіраецца чытаць натацыяў наконт дэмакратыі «свайму сябру» Пуціну. А калі й закране вострыя тэмы, дык толькі ў прыватнай размове.

Такім чынам, калі Буш і зьбіраўся пры сустрэчы з Пуціным закрануць тэму Беларусі, то мы, хутчэй за ўсё, аб гэтым ніколі дакладна не даведаемся. А калі даведаемся — дык з другасных крыніц.

Але наколькі вялікае значэньне варта надаваць словам кіраўнікоў Захаду адносна Беларусі? Ці варта было ўвогуле ўскладаць вялікія спадзяваньні на саміт «восемкі» — на тое, што Захад націсьне на Пуціна, каб той перастаў падтрымліваць рэжым Лукашэнкі?

### Будзем лічыць да васьмі...

З аднаго боку, саміт ствараў добрую падставу для беларускіх палітыкаў і праваабаронцаў, каб чарговы раз нагадаць сьвету пра існаваньне Беларусі, прыцягнуць увагу да парушэньня правоў чалавека і сытуацыі ў краіне пасьля сакавіцкіх выбараў. І гэтая нагода была ў пэўнай ступені выкарыстаная.

Але ж пастаянныя апэляцыі беларускай дэмакратычнай апазыцыі да краінаў Захаду і да Пуціна цягам апошніх тыдняў — апэляцыі, у якіх часам адчуваліся амаль гістэрычныя ноткі, выклікалі, мякка кажучы, неадназначныя пачуцьці.

Па-першае, апэляваць да ўдзельнікаў нефармальнай (нагадаем) сустрэчы — значыць ня проста ўскладаць спадзяваньні на тое, што нехта звонку, вялікія дзядзькі, вырашаць праблемы маленькай Беларусі. Форма «саміту», да якога зьвярталіся беларускія дэмакраты, азначае, што пытаньні міжнароднай палітыкі (а таксама двух- ці шматбаковых стасункаў паміж рознымі краінамі) па-ранейшаму можна вырашаць кулюарна, у свайго роду клюбе абраных. Гэтак вырашыліся лёсы народаў Эўропы ў Ялце і Патсдаме.

Лідэры G7, трэба аддаць ім належнае, заўсёды падкрэсьліваюць нефармальны характар сваіх самітаў, неабавязковы характар прынятых на іх нават не рашэньняў, але падыходаў, каб ня быць западозранымі ў непавазе да астатніх краінаў. Ёсьць жа, урэшце, Рада Эўропы, Эўразьвяз, Сусьветная гандлёвая арганізацыя...

А вось дэмакратычныя сілы ў Беларусі надавалі саміту ў Санкт-Пецярбурзе непрапарцыйна вялікае значэньне.

Па-другое, той факт, што саміт «вялікай восемкі» адбываўся ў Расеі, зрабіў загадзя бессэнсоўнымі заклікі да гасьцей саміту крытыкаваць яго гаспадара. Сам па сабе гэты факт азначаў, што Захад гатовы заплюшчыць вочы на Чачэнію, на Хадаркоўскага, на вяртаньне расейскіх СМІ пад поўны кантроль дзяржавы, на ўзаемаадносіны Расеі і Беларусі, урэшце і на прысуд экс-кандыдату ў прэзыдэнты Беларусі Казуліну.

Апэляцыя да сяброў «восемкі», у тым ліку да Пуціна, азначала, фактычна, што беларуская апазыцыя прызнае легітымнасьць старшынства ў ім Расеі (чаго не прызнаюць многія на Захадзе), а значыць — яе маральнае права дыктаваць свае ўмовы правядзеньня саміту. Што Крэмль з бляскам і прадэманстраваў.

Ёсьць у гэтай падзеі, безумоўна, і другі бок. Гэта тыя сем краінаў, якія пайшлі на паклон да Пуціна.

Але, крытыкуючы іх кіраўнікоў,



Калі прадстаўнік Эўразьвязу гаворыць аб неэфэктыўнасьці палітыкі санкцыяў, дык апазыцыя мае права парыраваць: пасьля «казусу Зімоўскага» — так!

трэба ўвесь час памятаць, што ў сваіх перадвыбарных праграмах гэтыя дэмакратычна абраныя лідэры нікому не абяцалі, што яны пачнуць дапамагаць Беларусі стаць вольнай. Яны ўвогуле нідзе і ніколі не казалі, што дэмакратызацыя Беларусі ёсьць прыярытэтам у іхнай палітыцы. Мільёнам амэрыканцаў, немцаў, французаў, італьянцаў няма справы да правоў чалавека ў Беларусі. Гэта факт. Тым больш, што да іх няма справы пераважнай большасьці саміх беларусаў.

Падчас сакавіцкіх падзеяў у Менску Плошча не сыходзіла з экранаў замежных тэлекампаніяў. Але не таму, што замежныя журналісты раптам прасякнуліся спачуваньнем да беларусаў. А таму што беларусы (няхай маленькая іх купка) паспрабавалі рабіць гісторыю самі для сябе, а не чакаць, што скажуць пра іх Буш з Пуціным. Бясстрашша купкі людзей зьдзівіла сьвет. Больш за тое, пацьвердзілася правіла: этычны ўчынак — гэта, перш за ўсё, прыгожы ўчынак. Прыгажосьць Плошчы не магла не зачараваць сьвет нармальных людзей.

Але ён, чужы сьвет, не абавязаны ўвесь час памятаць пра чужы ўчынак. Пра яго абавязаная памятаць апазыцыя — для таго, каб самой рабіць учынкі.

## Казус Зімоўскага

Ліст эўрапарлямэнтара Вірсмы Мілінкевічу, дзе выказваецца зьдзіўленьне наконт частых паездак лідэраў апазыцыі ў эўрапейскія сталіцы, можа выклікаць крыўду. Лідэры апазыцыі самі, без падказак эўрапарлямэнтароў здольныя вырашыць, якую стратэгію ім абіраць і куды езьдзіць. Але што запярэчыць на словы, што не ў эўрапейскіх палацах заваёўваюць сымпатыі беларускіх выбарцаў?

Выпадак з выдачай візы кіраўніку Белдзяржтэлерадыё ў партугальскім кансуляце ў Маскве, насуперак забароне Эўразьвязу на ўезд, выклікае сумненьні ў здольнасьці гэтай структуры кантраляваць выкананьне ўласных рашэньняў. Але ці так ужо трэба было апазыцыі выказваць падзяку з нагоды прыняцьця абмежаванага сьпісу чыноўнікаў? Калі недзе ў прыстойным доме лічаць непрыстойным прымаць у сябе махляроў і нягоднікаў, дык гэта нармальныя паводзіны. Санкцыі — з маральнага гледзішча — найперш патрэбны былі заходнім краінам, каб не выглядаць крывадушнымі. А не апазыцыі. Калі яна, зразумела, не разьлічвала распраўіцца з айчыннымі чыноўнікамі рукамі чыноўнікаў заходніх.


WWW.SVABODA.ORG

**Згода на правядзеньне саміту ў Расеі зрабіла бессэнсоўнай крытыку гаспадароў.**

З другога боку, калі сьпіс «неўязных» быў прыняты ў якасьці, так бы мовіць, падарунку апазыцыі, «дзеля адчэпнага», каб хоць неяк, фармальна адрэагаваць на парушэньні правоў чалавека ў Беларусі, тады гэтаму дакумэнту грош цана і трэба на яго проста забыцца. Калі ж ён разглядаецца ў якасьці інструмэнту палітыкі Захаду з мэтай рэальна паўплываць на сытуацыю ў Беларусі, то Эўразьвяз павінен несьці адказнасьць за свае дзеяньні. І апазыцыя можа і павінна адкрыта крытыкаваць краіны Эўразьвязу за нядбайнасьць ужо яго чыноўнікаў.

Так што калі прадстаўнік Фінляндыі, якая старшынюе цяпер у Эўразьвязе, гаворыць аб неэфэктыўнасьці палітыкі санкцыяў што да Беларусі, дык апазыцыя мае поўнае права задаць пытаньне ў адказ: а як вы маглі дапусьціць «казус Зімоўскага»?

Прыкладаў неадэкватнай, неэфэктыўнай і нават, калі называць рэчы сваімі іменамі, проста баязьлівай палітыкі заходніх урадаў у дачыненьнях з афіцыйным Менскам назапасілася за апошнія гады шмат. І аб гэтым трэба ўжо казаць уголас.

Але спачатку апазыцыя павінна навучыцца паважаць саму сябе.

Любыя замежныя кантакты надзвычай важныя. Заручыцца падтрымкай кіраўнікоў Захаду, найперш — «вялікай сямёркі», зусім ня лішне. Але разьлічваць на тое, што спачатку Захад ці нехта яшчэ забясьпечыць апазыцыю рэсурсамі на разьвіцьцё дэмакратыі, а потым ужо трэба пачынаць за яе змагацца, — значыць, ня толькі не паважаць саміх сябе, але ня верыць у посьпех сваёй справы.

А калі сам сабе ня верыш, як разьлічваць на тое, што табе павераць і пойдуць за табой астатнія?

І яшчэ ёсьць пытаньне: цікава, як бы склаўся лёс амэрыканскай дэмакратыі, калі б айцы—заснавальнікі ЗША чакалі б дапамогі ў справе незалежнасьці ад караля і парлямэнту Англіі?

# Адзін дзень

Чаму Расея, мяжуючы з Захадам і маючы такую доўгую гісторыю кантактаў зь ім, застаецца фатальна адрознаю, нават варожаю і процістаўляе сябе яму? У дзень пецярбурскага саміту G8 карэспандэнты «НН» выправіліся ўздоўж межаў Беларусі па той палосцы Заходняй Расеі, што калісьці належала Рэчы Паспалітай, а пасьля ўваходзіла ў рысу аседласьці. Рэшткі велічных барочных храмаў, распуста прыдарожных кавярняў і дзікія нетры пакінутых сёлаў — сафары за тры гадзіны язды ад Менску.

Масква — гэта не Расея. А Пецярбург — тым больш. Памятаючы гэтую расейскую прымаўку, мы вырашылі ў дзень саміту «вялікай восемкі» пабачыць Расею глыбінную. Ці гатовая яна да ўдзелу ў элітарным клюбе?

Выяжджаем зь Віцебску раненька. Наш плян — праехаць уздоўж мяжы аж да Краснай Гары, райцэнтру на Браншчыне, які дзевяць гадоў таму прасіўся ў склад Беларусі.

Лёзна — апошні беларускі горад на смаленскай шашы. Славуты ня толькі тым, што тут стрэліла беларуская «Аўрора». Тутака нарадзіўся Марк Шагал, Лёзна ён бясконца сьніў і маляваў. Дух мястэчка не зьмяніўся з часоў Шагала: тыя самыя хаты з маляванымі аканіцамі, а паўсюдныя кабеткі на роварах маглі б гэтак жа добра лётаць у шагалаўскіх нябёсах, як памятныя мастаку закаханыя.

Да Другой сусьветнай вайны ўсе навакольныя мястэчкі былі спрэс жыдоўскія. Самае знакамітае зь іх — Любавічы, месца паломніцтва габрэяўхасыдаў.

Кантроль на мяжы для легкавікоў застаецца фармальным. Але заўважыць пачатак Расеі было б няцяжка і без чарады фураў на мытні. Папросту зьнікае дарожная разьметка і на асфальце зьяўляюцца выбоіны.

Першы расейскі горад на дарозе, Рудня, сустракае навюткай царквой у нэамураўёўскім стылі. У макаўку ёй прыцэліўся гвардзейскі мінамёт «Кацюша». Тут «Кацюша», выяўляецца, зрабіла першы залп. Праўда, беларусаў вучылі, што той залп быў пад Воршай.

Помнік «Кацюшы» навюткі. Мы яшчэ ня раз будзем бачыць у Расеі гэтыя пуцінскія мэмарыялы. Савецкія гіпсавыя абэліскі зьмянілі капітальныя мэталічныя салдаты з аўтаматамі. Акрамя «Кацюшы», у невялікай Рудні яшчэ два салідныя помнікі. Пад бюстам Ягорава, таго самага, што ўзьняў чырвоны сьцяг над Райхстагам, кучкуюцца падпітыя дзядзькі.

## Завсынагогай

Любавічы сустракаюць



Першае фота
ў Любавічах.

# у Расеі



Першы расейскі горад сустракае царквой, у макаўку якой цэліцца «Кацюша».

указальнікамі па-расейску і па-габрэйску. Яны вісяць на бярозах, на дзесяцімэтровай вышыні — відаць, былі прэцэдэнты. Хасыдзкі малельны дом абнесены глухім плотам. Вароты на замку. Іх падпірае кумпанія, што яўна не Ягову тут шукае. Кітайскія спартовыя штаны, пляжныя тапці, цёмныя ад загару і алькаголю твары, гарэлка ў плястыкавых кубачках. «Яўрэі? Цяпер няма нікога. За магазынам жыве Анатолій. Сынагогай ён заведуе. Да яго едзьце».

Ля магазыну другая кампанія прыстасавала пад стол і дом пажарную скрынку зь пяском.

Завсынагогай разьбірае старую пуню. Дакладней, на драбінах з ломам шчыруе знуджданы мужчынка, а Анатолій зьнізу камандуе. Анатолію 55 гадоў, у яго кароткая фрызура, вялізны жывот і поўны рот залатых зубоў. Гэта высокі і яшчэ вельмі крэпкі чалавек. Моладзь, што п’е пры хасыдзкім доме, Анатолія пабойваецца, паважліва называючы «дзядзькам» (ня «дядей»!).

За савецкім часам дзядзька працаваў у Смаленску на авіязаводзе. Пасьля заняпаду ВПК вярнуўся ў родныя мясьціны. Ён адзін зь нямногіх тутэйшых мужчынаў, ня хворых на алькагалізм. Таму, відаць, на ім і спынілі свой выбар хасыды.

Малельны дом паўстаў у 2000 годзе. Жанчыне, што жыла на гэтым пляцы, габрэі выкупілі іншы дом, перанесьлі таксама пошту. Малельня, складзеная з таўсьцючых бёрнаў, звонку выглядае як клясычная «ізба». Усярэдзіне ж — як «ІКЕА». Некалькі пакойчыкаў, душ з гарачай вадой, малельная — яна ж «канфэрэнц-» — заля. На сьценах партрэты рабінаў любавіцкае дынастыі, мапа сьвету, на якой сьвецяцца кропкі хасыдзкіх асяродкаў. Іх няма толькі ў Антарктыдзе. Побач — малюнкі, на якіх пяе і весяліцца залаты век любавіцкага хасыдызму. Час, калі кожная жыдоўская грамада зь песьнямі й танцамі выпраўляла паломнікаў у Любавічы. Адчуваецца, што хасыды — габрэйскія пратэстанты — далёкія ад артадаксальнасьці.

## Нет!

Усіх любавіцкіх габрэяў пабілі ў вайну немцы. На месцы расстрэлу, у рове за вёскай, студэнты з Германіі паставілі камень з надпісам, што тут будзе помнік. Да брацкае магілы прадзіраемся праз паўтарамэтровае бадыльлё. У адрозьненьне ад пампэзных руднянскіх помнікаў, за гэтым ніхто не глядзіць. «Трэба папрасіць каго, каб скасілі», — зьбянтэжана бурчыць Анатолій.

Гэткі самы бур’ян стаіць і на габрэйскіх могілках, вакол капліччкі, дзе пахаваны заснавальнік хасыдызму рэбэ Шнэерсон. Яго надмагільле засыпанае аркушамі з словамі малітваў, якія прынесьлі пілігрымы. «Моляцца, пасьля рвуць і кідаюць сюды — сур’ёзная такая вера», — расказвае нам Анатолій. Ён пасьцяліў у капліцы драўляную падлогу — раней пілігрымы маліліся на цэмэнце босыя, незалежна ад пары году. «Разуваюцца ў сьнезе, і сюды заходзяць — на гадзіну, на дзьве, на цэлы дзень».



Колішняя ўніяцкая сьвятыня глядзіцца як касьмічны карабель зь іншае галяктыкі.

Перад намі завітвалі дзяўчаты з Амэрыкі. Прыяжджаюць групкамі па некалькі чалавек, моляцца ў доме, наведваюцца да магілы рэбэ і зьяжджаюць. Пэўна, збудаваўшы для іх міні-гатэльчык з рэстарацыяй, можна было б добрыя грошы рабіць. «Нет! — рашуча круціць галавой Анатолій. — Яны нічога нашага есьці ня будуць. Мяса пастаіць гадзіну — выкідаюць. У краме купляюць адну кока-колу. Дзе расейскаму кухару дагадзіць ім?..»

Анатолій глядзіць БТ і «Лад». Прэзыдэнт Лукашэнка падабаецца яму як палітык, але «ў Расеі жыць лепей». Таму Анатолій супраць інтэграцыі. «Яднацца трэба з тым, у каго грошы, — сьмяецца. — Напрыклад, з Ізраілем».

## Горшыя часы

Яшчэ адзін свабодны ад алькагалізму чалавек жыве адразу за хасыдзкім домам. І ён таксама, як і Анатолій, працуе ў нядзелю. Любавіцкі бацюшка айцец Уладзімер з матушкай сушаць сена.

Сьвятар як сышоў зь бізантыйскае іконы. Аскетычны твар, тонкі профіль, пукаты лоб, валасы віюцца, але мала іх ужо. Ён выйшаў да нас як быў — у трыко, выцягнутым на каленях. Яго храму 350 гадоў. Дзьве белыя вежы, высокія скляпеньні — чыстае віленскае барока. Сярод навакольнага бур’яну колішняя ўніяцкая сьвятыня за каваным парканам глядзіцца як касьмічны карабель зь іншае галяктыкі. «У пачатку мінулага стагодзьдзя ў Любавічах быў найбольшы ў Магілёўскай губэрні кірмаш, — кажа айцец Уладзімер. — У храм зьбіралася паўтары тысячы

Працяг на старонцы 10.

# Адзін дзень

**Працяг са старонкі 9.**

чалавек. Цяпер сюды па нядзелях пяць бабулек ходзяць». Парадаксальна: сьвятар з настальгіяй успамінае і савецкі час. Калі на ўвесь раён было дзьве царквы. Вернікаў было болей. Сёньняшні ж прыбытак — кропля ў моры патрэбаў. Дах аднаго з прэзбітэрыяў абрынуўся пад цяжарам сьнегу — так і ляжыць. Ад столі праз муры ідуць расколіны, драбіны на вежах упалі. Япархія ж укладае сродкі ў экстэнсіўнае пашырэньне веры — ставіць дзяшовыя і сярдзітыя цэркаўкі, кшталту руднянскай.

У 20-х гадах тут быў пажар. Выгарала ўся сярэдзіна, акрамя старога барочнага абраза сьвятога Пятра. Пасьля пажару ў Любавічы перавезьлі выдатны іканастас з зачыненага манастыра Аўрамія Смаленскага — з разьблёнымі барочнымі анёламі па версе.

А ў 1941 годзе у храм пацэліў нямецкі снарад, але не разарваўся. Так і тырчыць у сьцяне балванка.

У прытворы — тыповая каталіцкая спавядальня, зробленая як нішы ў сьцяне. Цяпер у ёй ляжыць брыкет. Галоўныя дзьверы наглуха замкнёныя зьсярэдзіны таўшчэзным брусом, упушчаным проста ў мур — як у XVII ст. Людзі заходзяць у храм праз бакоўку.

На разьвітаньне бацюшка прызнаецца, што сам родам зь Менску і прозьвішча ягонае Лагода, а свой духоўны шлях пачынаў у Жыровічах пры цяперашнім япіскапу Пінскім Стафане…

Поп бласлаўляе нас і бадзёра ўсьміхаецца: «Нічога! Бывалі і горшыя часы — пры палякаў ці немцах... Перажывём!» Проста пад ногі яму па царкоўнай падлозе скача жаба.

## Таксама і нічога

Заходняя Смаленшчына працяглы час знаходзілася пад уплывам Захаду. Гэта пакінула архітэктурныя сьляды, памяць пра габрэйскую прысутнасьць і… усё. Бо наваkольная запушчанасьць — не празь беднасьць. Якая беднасьць, калі апівохі ў Любавічах маюць грошы на штодзённую гарэлку, а чалавек, які ня хоча адбываць радоўку, можа заплаціць пастуху 250 рублёў за дзень — каля 20 тысяч беларускімі. Як, чаму пры нармальных заробках такая кепская інфраструктура? Якасьць жыцьця ня цэніцца як вартасьць? Цэніцца іншае — магчымасьць гуляць, весяліцца.



**Загадчык сынагогай Анатолій у хасыдзкім доме.**

Праклён Усходу вісіць над усёй Цэнтральнай Эўропай. Усходняя Нямеччына бяднейшая за Заходнюю. «Сьцяна ўсходніх ваяводзтваў» — галоўны боль варшаўскага ўраду. Румынская Мунтэнія намнога больш адсталая за Трансыльванію. Усходняя Славаччына — за Заходнюю. На ўсходзе Латвіі, у Латгаліі, беспрацоўе сягае траціны працаздольнага насельніцтва. У Беларусі ўсход ператварыўся ў зону бедзтва, пасьля таго як яго пакрылі чарнобыльскія выкіды. У Расеі няма падзелу на захад і ўсход, ёсьць толькі цэнтар і пэрыфэрыя. І замежжа — на пэрыфэрыях пэрыфэрый.

Жыхары Любавіч старанна пераконваюць нас, што сьцяжынка-павуцінка, якая вядзе да беларускае мяжы, — фікцыя. «Ня верце мапе!» Але куды ж кіруюць праз Любавічы іншамаркі зь беларускімі нумарамі? Яўна да апошняе вёскі перад мяжой зь ісьцінна расейскай назвай «Цегельня». Кантрабандысты перастрахоўваюцца, хоць граніца і адкрытая.

Той сьцежкай праз Цагельню сплыла некалі ўся маёмасьць любавіцкага калгасу. Тады нейкі ўкраінец, расказваюць, узяў у арэнду кавалак лесу на памежжы…

Беларускі парадак тут хваляць. Пра нябачны беларускі кардон ходзяць легенды. З павагай апавядаюць, як аўтаматчыкі сканфіскавалі сякеру ў любавіцкага дзядзькі, што паехаў у Беларусь сьсячы пару ялінак.

Гутарка руднянцаў захоўвае «г» фрыкатыўнае і іншыя беларускія рысы. Старэйшыя людзі кажуць не «нічево» — «нічога», не «тожэ» — «таксама».

## Вечныя госьці

Празь Любавічы цячэ Бярэзіна. З рэчак Бярэзін на крывіцкіх землях мог бы атрымацца нішто сабе гаёк. Хасыды, як прыязджаюць у Любавічы, умываюцца ў ёй. Для іх тут усё вакол — сьвятое. Поруч ідзе і ўсьведамленьне таго, што яны тут цяпер — вечныя госьці. Адсутныя, пустка па якіх зарастае бадыльлём у рост чалавека.

Мы пакідаем Любавічы. Пад мастом дзеці купаюць каня. Успамінаецца Пятроў-Водкін, сучасьнік Шагала. Думаецца пра час, калі пачалася доўгая сьмерць Любавічаў.

## Асноўныя кліенты

Вяртаемся ў Рудню, да трасы. З абслугоўваньня кіроўцаў-транзытнікаў горад жыве: тут плойма крамак, кавяранек. Бар насупраць помніка Ягораву сустракае гуч-



**Ганаровая варта ля сынагогі.**

# у Расеі

най папсой. Пры дзьвярах рытмічна танчыць афіцыянтка — кліентаў няма, і дзяўчына выйшла праветрыцца. Яе валасы і вейкі фарбаваныя ў радыкальны чорны колер. Яна скончыла школу і плянуе паступіць на трохмесячныя курсы. Яе несьціханы сьмех і палкія інтанацыі наводзяць на думку пра прынятыя псыхатропныя сродкі. Замаўляем салаты і яечню і адмаўляемся ад шашлыкоў, якія яна прапануе амаль з той самай навязьлівасьцю, што і сябе. Афіцыянтка разумее, што мы не яе кліенты. «А хто вашы асноўныя кліенты?» «Асноўныя кліенты ноччу», — рагоча яна.

Распытваем, ці шмат турыстаў праяжджае праз іх у Любавічы. Якія Любавічы? Яны нічога ня чулі пра іх, хоць і жывуць за дзесяць кілямэтраў.

Яечню гатуюць пры табе. Маладая кухарка, чыстая прыбіральня. Праўда, на кухні хмары мух. Пад шкляной покрыўкай ляжаць катлеты. Ад мух асобна.

## Ой, бярозы ды сосны

Кіруем уздоўж беларускай мяжы, балянсуючы на тонкай паласе Заходняй Расеі, што калісьці належала Рэчы Паспалітай, а пасьля ўваходзіла ў рысу аселасьці. Па адзінай частцы Расеі, што працяглы час жыла пад уладай Захаду.

Што так бянтэжыць на смаленскай трасе? Спачатку ня можам зразумець. Убогія дарогі — гэта чакана. Кожны ведае, што ў Расеі благія дарогі. Спустошаныя вёскі — таксама. І толькі па вяртаньні ў Беларусь асягаем: лес! Нячышчаны, зарослы, дзікі ў параўнаньні з акуратным беларускім. Бо нашто даглядаць смаленскія бары, калі ў Сібіры стаяць бяскрайнія пушчы? Так, Расея вялікая дзяржава. Занадта вялікая,


Апошні рэбэ любавіцкай дынастыі. Фота з картачкі, што ў малельным доме.


У маўзалейчыку на могілках пахаваны заснавальнік хасыдызму рэбэ Шнэерсон.



магчыма.

## Завялікая Расея

Яшчэ сто гадоў таму не было ніякай розьніцы між Любавічамі й Лёзнам. Сёньня гэта два розныя сусьветы. Адзін — з дарожнай разьметкай, другі — безь яе і, галоўнае, без патрэбы ў ёй.

Чаму такі кантраст між імі, як і між Эстоніяй і Пецярбургам, між Літвой і Калінінградам?

Ёсьць тэорыя, што Масква адмыслова інвэставала ў залежныя ад сябе дзяржавы болей, чым у мэтраполію, каб заахвоціць іх да каляніяльнага існаваньня. Аднак гэтыя інвэстыцыі спыніліся пасьля падзеньня СССР, а разрыў, наадварот, расьце з паскарэньнем. Справа ў нечым іншым. Культура — так, напэўна, у сваёй аснове. Але этнічна Любавічы й Лёзна сто гадоў таму былі ідэнтычнымі — жыдоўска-расейскімі мястэчкамі ў атачэньні дамадэрнай патрыярхальнай вёскі, якая гаварыла на аднолькавай беларускай мове, але была пазбаўленая выразнай нацыянальнай ідэнтычнасьці. Большую частку гэтага стагодзьдзя тут ажыцьцяўлялася савецкая ўлада — толькі ў Лёзьне зь Менску, а ў Любавічах — з Масквы. І менская была больш жорсткая ды зашпіленая на ўсе гузікі. Розьніца толькі ў тым, што ў Лёзьне гэтыя сто гадоў прышчаплялася — сяк-так — беларуская сьвядомасьць, а ў Любавічах, беззаганна, — расейская.

Гэты кантраст між малой эўрапейскай краінай (хай сабе аўтарытарнай) і вялікай эўраазіяцкай дзяржавай можна патлумачыць спэцыфікай улады ў Расеі. Або самім памерам Расеі, калі хочаце.

Можа быць, варта ладзіць саміты вялікіх дзяржаваў асобна, а занадта вялікіх дзяржаваў асобна?

Працяг на старонцы 12.

# Адзін дзень у Расеі

Працяг са старонкі 11.

## Прастытуткі ў Катыні

Праяжджаем Катынь. Мэмарыял знаходзіцца з правага боку ад дарогі Віцебск—Смаленск.

Тут, у Катыні (правільна ставіць націск на першы склад — К*а*тынь), у 1940 годзе НКВД расстраляла 15 000 палонных Войска Польскага — палякаў, беларусаў, габрэяў. Месца было абрана надзейнае: закрытая тэрыторыя дачнага комплексу НКВД. Які пасьля стаў комплексам КГБ. І цяпер вакол стаяць дачы ФСБ — і ніякіх комплексаў.

У Катыні ўспамінаеш Курапаты. Цішыня. Птушкі. Жывіца на хвоях. Жалеза, якое наўмысьля пакінулі ржавець. Брук. Трава. Крыж каталіцкі, крыж праваслаўны, мусульманскі паўмесяц і Давыдава зорка. Нічога патэтычнага. Цяжкія жалезныя крыжы ляжаць на брацкіх магілах. Вялікі, вялікі, меншы — магіла генэралаў каля самага манумэнта. Саветы, як і нацысты, пачыналі з вынішчэньня адукаванага слою заваяваных нацыяў. Шарагоўцаў адпускалі, а інтэлігенцыю, афіцэраў, чыноўнікаў мардавалі, каб пазбавіць краіны эліты, якая магла б ачоліць супраціў.

Нечаканы рэзкі гук: у звон, схаваны за жалезнымі скрыжалямі з прозьвішчамі ахвяраў, можа біць кожны.

Звоняць смаленскія турысты. «Польшчу называлі палітычнай прастытуткай. Гэта не мая думка, гэта меркаваньне аўтарытэтных палітолягаў, — далятае да нас урывак зь лекцыі іхнай экскурсаводкі. — Яна ўсім здраджвала. То на бок Расеі пераходзіла, то на бок немцаў. Армія Андэрсэна (так і кажа — Андэрсэна) увогуле дэзэрціравала, хоць мы яе ўзбройвалі. Уцякла празь Сярэднюю Азію на Блізкі Ўсход». «Іх зразумець можна: калі да цябе ўвесь час на танках уяжджаюць», — заўважае ёй малады расеец зь лічбавай камэрай.



**Вакол Катыні як былі, так і ёсьць дачы ФСБ.**

## Іншы сьвет

Праяжджаем Смаленск. Маляўнічы горад на высокім беразе Дняпра, з шматкупальнымі цэрквамі і добра адбудаваным крамлём. Хто б аднаўляў гістарычную частку беларускіх гарадоў пасьля вайны... Смаленск робіць уражаньне ўтульнасьці і — ха! — на цэнтральных вуліцах ёсьць разьметка. Калі яе адсутнасьць за горадам мала турбавала, дык хаатычны рух на не ашчасьліўленых ёй гарадзкіх праспэктах нагадвае язду па афрыканскім мэгаполісе.

У горадзе шмат прыватных крамак, і яны працуюць у нядзелю. Рэч нечуваная ў Савецкім Саюзе, поступ прыватніка. Нават кнігарня адчыненая. Замкнёныя толькі банкі. Аднак і гэта не праблема: любы смалянін падкажа, дзе стаяць валютчыкі. Або дзе знайсьці фірму, якой, «можа быць, трэба даляры». Гаспадар такой фірмы, палічыўшы на калькулятары, дастае расейскія рублі з бляшанай пушкі, абклеенай залацістай фольгай — у такія савецкія кабеты ссыпалі рыс і крупы. І сам гаспадар, і ўсе яго супрацоўнікі — каўказцы.

У Смаленску на вуліцах сьмецьце. Заўважна, што прыбіраюць тут рэдка. Пустыя бутэлькі валяюцца вакол помніка паэту Аляксандру Твардоўскаму і ягонаму пэрсанажу Васілію Цёркіну. Радзіма Твардоўскага, Пачынкаўскі раён, застаецца ў нас зьлева па курсе, як і Гжацк, адкуль першы касманаўт Гагарын, і Наваспаскае — радзіма аўтара «Жыцьця за цара» Глінкі.

Вёскі Смаленшчыны спрэс захавалі беларускія назвы Манюкі, Лынды, Дзяньгубава. У нас бы такія паперайменоўвалі, мільгае думка.

## «Жыгулі» і «Ака»

Дарога кружляе сярод тургенеўскіх пэйзажаў: даліны, пералескі, ставы. У нядзелю Смаленшчына здаецца вымерлай. Рэдка-рэдка разьмінесься з абавязкова т'юнінгаванымі «Жыгулямі» ці маляўкаю «Акой». Калі ж насустрач вам едзе «фальксваген» ці «опэль» — 90% верагоднасьці, што ён будзе мець беларускія нумары.

Аднолькава спустошаныя вёскі тонуць у кустоўі і «максімцы» — танным сьпірце, які разводзяць вадою. Сельгасдзейнасьць засяроджаная ва-



**Апошняя вёска перад Амсьціславам з расейскага боку.**

кол буйных паселішчаў. Але і яны аднастайныя: ні царквы, ні Дому культуры. Сельская адміністрацыя ды крама насупраць, што забясьпечвае жыцьцёвыя (некалькі гатункаў кілбасы, сала па 78 расейскіх рублёў за кілё, гарэлка, марозіва, побытавая хімія) і пасьмяротныя патрэбы — у куце сумуе пахавальны вянок. Пад самай столльлю ў нішы сьцяны — дзіўнае прыстасаваньне з грубага ўслона, саракалітровага кана і ўвараных у яго трубаў — паравое аціпленьне, скляпанае мясцовым ляўшом.

Жыцьцё райцэнтраў аднолькава зводзіцца да крамаў і бараў. У прыдарожных кавярнях пад гром аднолькавай папсы завіхаюцца дазваньня фарбаваныя афіцыянткі.

Стан Расеі — вынік адсутнасьці структураў грамадзянскай супольнасьці. Дзяржава, эканамічныя сувязі аслаблі, і ўсё пасыпалася, бо няма амартызатара — грамадзтва. Мала мець моцную нацыянальную тоеснасьць для выбудовы нармальнага грамадзтва, калі яна не падмацоўваецца ніткамі, што лучаць людзей зьнізу — царквы, асацыяцый, супольнасьцяў… Ня трэба грошай, каб скасіць двор вакол любавіцкай царквы і прыбраць брацкую магілу.

## Эпізод з пагоняй

Усякае жаданьне начаваць у Расеі прападае, пасьля таго як на дарозе між Смаленскам і Манастыршчынай нам сустракаюцца зэкі. Яны стаялі на дарозе — два напаўголыя татальна татуяваныя мужчыны няпэўнага веку — і размахвалі каністрай. Мы прыцішылі хуткасьць, але пры набліжэньні вырашылі-такі не спыняцца. І не памыліліся, бо — о-ёй! — іхны «Жыгуль» кідаецца за намі наўздагон. Пасажыр энэргічна жэстыкулюе, высунуўшыся з акна. Магчыма, мы сапраўды пакрыўдзілі іх сваім недаверам, але ўсё ж такую рэакцыю прызнаём не зусім адэкватнай. На шчасьце, на асфальце наша жвавая «Кіа Прайд» мае яўную перавагу перад іхнай гарбачоўскіх часоў «Ладай», што гучна раве, але адстае, адстае і праз пару кілямэтраў зьнікае зь віду.

Здарэньне нас палохае, але ня дзівіць. Мы толькі дзякуем Богу, што гэта здарылася не на гравійцы, у якую пераходзіць дарога за наступным райцэнтрам, Манастыршчынай, дзе гонка была б небясьпечнай.

Чаму Краснагорскі раён Бранскай вобласьці прасіўся ў склад Беларусі, нам і так ясна. Чырвонае сонца сядае і нясьцерпна рэжа вочы. Мы бярэм курс на Беларусь самым кароткім маршрутам.

## Беларусь пачынаецца з асфальту

Праз жвір праступаюць выспачкі цьвёрдага пакрыцьця. Відаць, пры Брэжневу дарога яшчэ была бітумнай і спачатку пяском проста засыпалі ямы. Паступова адны яны і засталіся ад шашы. У вёсках дарога лепшае, выбоіны шчыльна закладзеныя будаўнічай цэглай. А часам, проста сярод палёў, выжбурне з-пад жвіру новы асфальт — рэшткі калгасу-мільянэра ці дар нувярыша малой радзіме? — каб кілямэтры праз два зноў зьмяніцца абрыдлымі калдобінамі.

Праскакаўшы по гравійцы кілямэтраў пятнаццаць, трапляем у… Любавічы. Па іроніі лёсу гэты аднафамілец хасыдзкае сьвятыні аказваецца апошнім больш-менш населеным пунктам Расеі ў нас на дарозе. Над вёскай пануе руіна праваслаўнай царквы. Дзьверы расчыненыя, рэшткі абрынутага купалу пагрозьліва навісаюць над дарогай. Побач — вясковая адміністрацыя з расейскім трыкалёрам над ганкам. Разьбітая шыба ў сенцах замененая кавалкамі дыхты.

…Роўна пад вялікім шчытом зь дзяржаўнай атрыбутыкай Беларусі на дарозе Манастыршчына—Мсьціслаў пачынаецца асфальт. Памежны слуп стаіць толькі беларускі. Канец і пачатак Расеі пазначаныя адно знакам «Няроўная дарога на працягу 21 км». Нейкі жартаўнік зьверху крэйдай прымаляваў да лічбы яшчэ тры нулі.

**P.S.** Віцьбічы і магілёўцы, галасуючы за Лукашэнку, працістаўляюць яго не заходнім каштоўнасьцям, пра якія маюць цьмянае ўяўленьне, а невыноснаму расейскаму безуладзьдзю, якое маюць перад вачмі. Яны галасуюць за наяўнасьць улады, а дыктатуру атрымліваюць у нагрузку.

**P.P.S.** Па прашэсьці часу тыя палеткі на мяжы Беларусі й Расеі зь беларускага боку ўспамінаюцца як трохі карцінныя. Мабыць, іхную акуратнасьць правяраюць асабіста старшыні райвыканкаму. Мілая паказуха. Так, як у добрым рэстаране ў Парыжы шэф-кухар асабіста правярае смак віннага соўсу.

**P.P.P.S.** Узровень і арганізацыя жыцьця ў Лёзьне й Рудні розьняцца настолькі, што ўсур'ёз разважаць пра аб'яднаньне Беларусі й Расеі сёньня можа толькі фантаст.

**Барыс Тумар і Сяргей Мікулевіч**
**Фота Андрэя Лянкевіча**



**Купаньне чырвонага каня.**

# Паказальны прысуд Казуліну

На працэсе супраць экс-кандыдата ў прэзыдэнты прысутнічаў **Сяргей Будкін.**

У навюткі будынак суду Маскоўскага раёну трапіць падчас слуханьня справы Аляксандра Казуліна было няпроста. Нэрваваліся ўсе. Ахоўнікі ня ў сілах былі стрымліваць хвалю апазыцыянэраў-«нахабнікаў» і ў кожнай старой мабілцы бачылі схаваную фатакамэру: «Э! Ты куды? Вунь там твае сядзяць», — каржакаваты лейтэнант з кепска прыхаванай агідай скіроўвае да дзьвярэй задуменнага актывіста. Высокі дзяцюк з рацыяй у кішэні падлятае да мяне, калі я разматваю дыктафонны шнур: «Тут эта нільзя!» «Што нельга? Здымаць?» — «Нільзя!» — «Гэта ж дыктафон?» — «Нільзя!» — «А нататнік?» «Нільзя», — зачаравана паўтарае той. У такім жа рэчышчы працаваў судзьдзя Рыбакоў, калі адвакаты Казуліна задавалі пытаньні сьведкам, толькі замест «нільзя» ён зацята паўтараў: «Пытаньне здымаецца». І так некалькі дзясяткаў разоў запар.

## Праўнік-выдатнік

Казуліна судзіў праўнік-выдатнік, партрэт якога месьціўся на дошцы гонару Міністэрства юстыцыі. Палітычных справаў дагэтуль ён ня вёў і ад першых хвілінаў згубіў ініцыятыву, пачаў нэрвавацца і штохвіліны церабіць рукаво мантыі. Насамперш ён выдаліў з залі ўсіх фотакарэспандэнтаў, а пасьля воплескаў у гонар палітзьняволенага заявіў: «Услых сьмяяцца няможна». У апошні дзень працэсу ён выдаліць з залі ўсіх, улучна са сваякамі і самім падсудным, і зачытае прысуд у прысутнасьці адных адвакатаў. Казулін некалькі разоў хадайнічае, каб Рыбакоў узяў адвод, той адхіляе. Судзьдзю падтрымлівае дзяржабвінаваўца — пракурор Сяргей Бортнік, немалады чалавек са змарнелым тварам, які ніколі не глядзіць у залю: «Я ня бачу асабістай зацікаўленасьці судзьдзі ў гэтай справе». Казулін падсумоўвае: «Гэта фарс, і прысуд у вас ужо гатовы». Сьведкі-спэцназаўцы мэтадычна даюць паказаньні. Калі Казулін прарываўся ў Палац чыгуначнікаў, кажа адзін, ён сам біўся галавой аб падлогу з мэтай нанясеньня сабе пашкоджаньняў. Пратэсты абароны лунаюць як галашэньне ў пустэльні.

## Прафэсар-крымінальнік

Сам падсудны ва ўсім сьветлым зьўляецца гэтак жа эфэктна, як калісь на сьвяце БДУ. Толькі тады ён спускаўся зь верталёта, а цяпер заходзіць пад канвоем. Казулін заўважна схуднеў, але рашучасьці не згубіў — глядзіць пры размове ў вочы, з кожным словам падвышаючы тон. На яго з прыхаванай цікавасьцю глядзяць ахоўнікі.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Пасла Вялікай Брытаніі Браяна Бэнэта ў суд не пусьцілі.**


PHOTO.BYMEDIA.NET

**Ірына Казуліна да канца спадзявалася на апраўданьне.**


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Судзьдзя забараніў сьмяяцца падчас паседжаньня.**


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Пракурор стараўся не глядзець у залю.**


WWW.SVABODA.ORG

**Журналісты здагадаліся аб прысудзе па крыках маці Казуліна.**

Просьбу быць у залі пры гальштуку суд адхіляе, а на сьнядане перад трэцім днём яму даюць селядзец (на дварэ — болей за 30 градусаў), пры гэтым вады ў залі не падаюць. Пасьля чарговага ўсплёску эмоцыяў яго выдаляюць з залі. У адказ ён кідае Рыбакову: «Я буду зьяўляцца да вас па начох».

### Адвакаты не ўратавалі

Абаранялі Казуліна два адвакаты. Мелася да іх далучыцца і дачка Казуліна Вольга, прафэсійны праўнік, аднак суд ёй гэтага зрабіць не дазволіў. Адвакат Гарачка спыняецца на дробных дэталях: што Казулін не псаваў дзьвярэй Нацыянальга прэсцэнтру, што разьбіў не партрэт прэзыдэнта, а толькі пашкодзіў шкло і г.д. Адвакат Рынкевіч выходзіць у сваіх выступах за межы канкрэтных эпізодаў. Ён у першы ж дзень акрэсьліў працэс як «Казулін супраць дзяржавы» і адкрыта казаў пра справу Казуліна як палітычную і чарговую ў шэрагу перасьледу дзеячаў апазыцыі. «Яго ўзялі ў закладнікі тыя, хто мусіць змагацца з тэрарызмам!» — грыміць Рынкевіч.

Абвінаваўца Бортнік парыруе — Казулін — крымінальнік, і ня трэба тут палітызаваць.

Былога супрацоўніка «Алмазу», сьведчаньні якога апублікаваныя на сайце Казуліна, судзьдзя слухаць адмаўляецца: «Ня трэба мне ананімных лістоў з Інтэрнэту».

Жонка Казуліна актыўнічае: раздае дзясяткі інтэрвію, робіць заявы, усьміхаецца назіральнікам. У перапынку яна парадаксальна акрэсьлівае свае адчуваньні: яна ведае, што такое беларускае правасудзьдзе, але верыць у справядлівасьць. Дочкі Казуліна — Юлія і Вольга — трымаюцца нязмушана і як мага падтрымліваюць бацьку: узмахам рукі, усьмешкай.

Апошні дзень выдаўся самым нэрвовым. Судзьдзя, такое ўражаньне, усяляк сьпяшаўся ўправіцца за чацьвер (да пачатку піцерскага саміту?). Прысуд быў агучаны каля 20.00. Пра тое, што Казулін атрымаў амаль максымум — пяць з паловай гадоў калёніі, журналісты, выгнаныя на двор, здагадаліся па крыках маці палітвязьня. Палітыкі, што дзяжурылі ля суду, неяк усе адначасова ўцягнулі плечы.

# «Арышт Казуліна быў толькі пытаньнем часу»

Так цьвердзіць у сваім лісьце былы супрацоўнік спэцпадразьдзяленьня МУС «Алмаз» Ігар Макар. Ён мусіў прыехаць з-за мяжы, каб удзельнічаць у працэсе ў якасьці сьведкі, аднак судзьдзя адхіліў хадайніцтва абароны А.Казуліна аб выкліку яго ў суд.

У сваім лісьце былы «алмазавец» сьцьвярджае, што на зьмену СОБРу Паўлічэнкі прыйшоў «Алмаз» Карпянкова. Адмыслова створаная з шэрагу супрацоўнікаў «Алмазу» група праявіла сябе падчас падзеяў 2 сакавіка, калі А.Казуліна зьбілі і арыштавалі пры спробе зарэгістравацца кандыдатам на так званы «ўсебеларускі зьезд».

І.Макар, які працаваў у «Алмазе» каля 5 гадоў, пра арганізацыю выказваецца як пра структуру, што выконвае несвае функцыі і задачы, у тым ліку — выкарыстаньне грубай сілы для барацьбы з апанэнтамі рэжыму. Пры гэтым ён даводзіць, што ня ўсе «алмазаўцы» згодныя зь існым становішчам, іх стрымлівае пагроза страты працы.

Паводле сьцьверджаньня І.Макара, перад выбарамі кіраўнік «Алмазу» М.Карпянкоў неаднаразова шукаў зь ім сустрэчы, а падчас адной зь іх, калі прысутнічаў і Навумаў, быў зроблены запіс гутаркі, які ён гатовы падаць у судзе. Сэнс той размовы такі: арышт Казуліна і наступны за гэтым прысуд непазьбежныя. Маўляў, «гэтая машына («Алмаз») усіх і ўсё перамеле».

Апазыцыйныя сайты ня раз друкавалі лісты ананімных «патрыётаў» зь ліку супрацоўнікаў спэцслужбаў, што папярэджвалі пра пагрозу гвалтоўнага зыходу акцыяў пратэсту, агучвалі прозьвішчы сваіх калегаў, што спрычыніліся да гучных палітычных скандалаў са зьбіцьцём палітычных апанэнтаў улады. Апошні ліст не паведамляе амаль нічога новага, аднак мае аўтарства, што надае яму больш вагі і даверу.

**Сямён Печанко**



**Паказальны выступ «Алмазу»...**



**... і суровыя будні: Мікалай Карпянкоў страляе па машыне Юр'я Радзівіла 2 сакавіка.**

**Ігар Макар**

былы супрацоўнік спэцыяльнага антытэрарыстычнага падразьдзяленьня «Алмаз», старшы лейтэнант міліцыі ў запасе. Камандаваў адным з падразьдзяленьняў, якое займалася аховай вышэйшых дзяржаўных асобаў, падтрымкай парадку падчас найважнейшых справаў, што разглядаліся ў Вярхоўным судзе. Тры гады таму звольніўся з уласнай ініцыятывы падчас працэсу над былым кіраўніком Беларускай чыгункі Віктарам Рахманькам, якога называў сваім сябрам.

Падчас апошняй прэзыдэнцкай кампаніі быў актывістам ініцыятыўнай групы Аляксандра Казуліна, займаўся пытаньнямі збору подпісаў і бясьпекі. Пасьля інцыдэнту ў ДК чыгуначнікаў у СМІ трапілі прозьвішчы задзейнічаных у ім супрацоўнікаў «Алмазу». Пасьля гэтага на адрас І.Макара, зь ягоных словаў, пайшлі пагрозы пра магчымае зьбіцьцё, завядзеньне справы і г.д. Ён мусіў зьехаць за мяжу, дзе і знаходзіцца на гэты момант.

# Рэвалюцыя ў шашачкі

Бунт менскіх таксістаў: «052» змагаецца за права працаваць.



PHOTO.BYMEDIA.NET

У мінулы чацьвер кіраўніцтва прыватнай фірмы «Набат», уладальніцы таксовак «052», паведаміла сваім супрацоўнікам пра спыненьне дзейнасьці і масавае звальненьне. У панядзелак у службы «052» мусілі ануляваць ліцэнзію на выкарыстаньне прафэсійнай радыёчастаты. Прычынай гэтага стаўся арышт дырэктара фірмы, якога падазраюць ва ўтойваньні падаткаў.

Ініцыятыва пазбавіць «Набат» ліцэнзіі зыходзіла ад Камітэту дзяржаўнага кантролю. Ягоны дэпартамэнт фінансавых расьсьледаваньняў выявіў парушэньні ў дзеяньнях ранейшага кіраўніцтва аб’яднаньня. Пасьля гэтага Мінсувязі й вырашыла адклікаць ліцэнзію.

Кіроўцы ня сталі чакаць панядзелка: у пятніцу блізка паўсотні таксовак заблякавалі пад’езд да будынку АНТ на вул.Камуністычнай. Таксісты патрабавалі жывога этэру, каб зьвярнуць увагу на пагрозу масавага звальненьня. Пад аховай міліцыі да іх выйшла здымачная група, якая запісала патрабаваньні маніфэстантаў. Пасьля таксісты паслухмяна разьехаліся на загад ДАІ, пагразіўшы наастатак: будзе вам каляровая рэвалюцыя — жоўтая ў чорныя шашачкі.

Кіраўніцтва «Набату» прыкладае ўсе намаганьні, каб знайсьці выйсьце з сытуацыі. І пэўныя посьпехі ёсьць. Прынамсі гэты панядзелак ня стаў апошнім для прадпрыемства — дыспэтчарская служба прымае замовы. Як патлумачыла адна зь яе супрацоўніц, таксоўкі карыстаюцца другім каналам радыёчастотаў — аматарскім. «Вырашэньне пытаньня зь ліцэнзіяй можа расьцягнуцца на некалькі дзён, аднак мы маем надзею, што ўсё скончыцца добра», — з аптымізмам заначыла яна.

«052» — найбуйнейшая менская служба таксовак: аўтапарк яе налічвае паўтысячы аўтамабіляў, на якіх працуе каля 700 кіроўцаў.

Сытуацыя з таксоўкамі «052» не адзінкавая ў Беларусі. У Берасьці ад 5 ліпеня працягваецца галадоўка уладальнікаў маршрутных таксовак. 13 чалавек пратэстуюць супраць рэспубліканскага збору за ўвоз транспарту ў камэрцыйных мэтах. Уладальнікі маршрутак набылі свой транспарт да ўступленьня ў сілу адпаведнага дэкрэту, аднак падатковыя інстанцыі працягваюць накладаць на іх велізарныя штрафы.

**СП**

## ПРАЦЯГ ТЭМЫ

### Галоўнаму рэдактару газэты «Наша Ніва»

У №25 Вашай газэты быў надрукаваны матэрыял «Грамада шукае замену Казуліну» з фатаздымкам намесьнікаў старшыні партыі А.Ляўковіча і У.Нісьцюка.

Даводзім да Вашага ведама, што выкладзеная ў матэрыяле інфармацыя цалкам не адпавядае рэчаіснасьці, дзеля яе публікацыі не было і няма ніякіх падставаў.

Лічым, што газэта нанесла партыі, яе лідэру і ўсяму кіраўніцтву Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) абразу. Асабліва цынічна гэта выглядае падчас жорсткага судовага працэсу над кіраўніком і лідэрам беларускіх сацыял-дэмакратаў А.Казуліным.

Патрабуем надрукаваць нашу заяву і абвяржэньне распаўсюджанай ілжывай інфармацыі ў наступным нумары газэты.

У іншым выпадку пакідаем за сабой права зьвярнуцца ў суд дзеля абароны свайго гонару і дзелавой рэпутацыі.

**Першы намесьнік старшыні БСДП (Грамада) Анатоль Ляўковіч**

**Намесьнік старшыні БСДП (Грамада) Уладзімер Нісьцюк**

# Маральнасьць як палітычны чыньнік

Ліст кіраўніцтва сацыял-дэмакратычнай партыі мяне як аўтара згаданага артыкулу парадаваў. Тым, што палітыкі надаюць увагу прэсе, яна для іх мае значэньне. Тым, што зьвяртаюцца да такіх паняткаў, як «маральнасьць» і «сумленнасьць».

Інфармацыя, пададзеная ў артыкуле «Грамада шукае замену Казуліну», была атрыманая з вартых даверу крыніцаў, і газэта мела права яе зьмяшчаць, сумленна пазначыўшы, што яна грунтуецца на чутках, і ўстрымаўшыся ад ацэнак.

Мы ня ставілі на мэце ўзьняць скандал напярэдадні суду над лідэрам сацыял-дэмакратаў. Скандалы ўвогуле не па нашай частцы.

Просім зьвярнуць увагу і на тое, што тэма артыкулу «НН» неўзабаве атрымала разьвіцьцё на сайце «Euramost.org»: пра факт свайго вяртаньня і прыхільнасьць да сацыял-дэмакратыі заявіў Леанід Сініцын. А Мікалай Статкевіч заявіў, што перамовы наконт прыходу да кіраўніцтва партыі вядуцца зь ім і зь Сяргеем Калякіным.

Дарэчы, Статкевіча на Казуліна БСДП(Г) памяняла паўтара году таму ў абсалютна аналягічнай сытуацыі: лідэр партыі чакаў суду за «арганізацыю вулічных беспарадкаў». Тады такі крок не здаваўся лідэрам партыі «цынічным».

Так, дым без агню бывае. (Агню, дарэчы, увогуле ў дзейнасьці палітычнай апазыцыі апошнім часам было малавата.) Калі чуткі акажуцца проста чуткамі — мы ня спынімся пра гэта паведаміць.

Гэта ўнутраная справа сацыял-дэмакратаў — мяняць лідэра ці не. Але і ў першым, і ў другім выпадку мы будзем пра гэта інфармаваць. А грамадзтва само будзе рабіць высновы. Выходзячы з матываў, якімі будзе кіравацца партыя ў сваім выбары.

**Аркадзь Шанскі**







**Бел-чырвона-белы сьцяг крочыць па плянэце. На тыдні акцыі салідарнасьці зь Беларусьсю прайшлі ў Варшаве (на фота справа), Стакгольме, Маскве. У Нью-Ёрку адбыўся традыцыйны Марш паняволеных народаў, у лік якіх усё яшчэ залічваюць і беларусаў (фота зьлева. У цэнтры — старшыня Беларуска-амэрыканскага задзіночаньня Антон Шукелойць.)**

# Ці гатовыя камуністы сысьці ў падпольле?

На апошніх прэзыдэнцкіх выбарах камуністы з ПКБ зарэкамэндавалі сябе як адданыя змагары супраць самадзяржаўя. Гэта не магло падабацца ўладам, якія неўзабаве зьніцыявалі гэтак званы аб'яднаўчы зьезд КПБ і ПКБ. Праўладныя камуністы закідвалі калякінцам партнэрскія дачыньні з партыямі і арганізацыямі правага толку. Сапраўды, цяпер ужо нікога ня дзівяць добрыя адносіны між ПКБ і ПБНФ. Камуністы сталі цесна зьвязаныя зь беларускім нацыянальным рухам, як некалі было ў Заходняй Беларусі з КПЗБ.

У зьвязку з суботнім зьездам Міністэрства юстыцыі імаверна можа ліквідаваць ПКБ, дык ці гатовыя камуністы сысьці ў падпольле, як гэта было з КПЗБ? З такім пытаньнем «НН» зьвярнулася да дзеячаў камуністычнага руху.

**Віктар Капульцэвіч**, былы старшыня барысаўскага гарвыканкаму: «Канечне! Можа, каму і здаецца, што нас ніхто чапаць ня будзе, але я ня маю з гэтай нагоды ілюзій, бо тады навошта ўладам быў трэба той зьезд? У нас у Барысаве з ПКБ ня выйшаў ніводзін чалавек, хоць сяброўства ў нашай партыі пагражае людзям звальненьнем. Будзем працаваць у падпольлі: іншага выбару ў нас не застаецца».

**Дзьмітры Яненка**, лідэр камсамолу: «Будзем працаваць у любых умовах, хоць, зрэшты, ніякіх падставаў ліквідоўваць нашу партыю няма. На зьезьдзе КПБ удзельнічалі толькі два былыя сябры ПКБ, якія ўжо былі выключаны з партыі. Мы зьбіраемся дзейнічаць як легальная структура, але, калі нас урэшце ліквідуюць, то гэта будзе горш найперш для ўладаў. Камуністы ўмеюць працаваць у падпольлі».

**Сяргей Возьняк**, галоўны рэдактар газэты «Товарищ»: «Пакуль што не стаіць пытаньне аб ліквідацыі, бо аб'яднаўчы зьезд адбыўся толькі фармальна, а фактычна там было ўсяго некалькі сяброў ПКБ».

**Валер Ухналёў**, сакратар ПКБ : «Гатовыя, хоць ня думаю, што гэта спатрэбіцца».

**Іван Акінчыц**, прафэсар, доктар філязофскіх навук, Берасьце : «Гатовыя. Кропка».

**Апытваў Зьміцер Панкавец**

# Актывізаваліся нацболы

На гэтым тыдні адразу двое адрасатаў атрымалі надзвычай падобныя лісты. Штопраўда, падпісаныя рознымі арганізацыямі.

У аўторак, 18 ліпеня, галоўны рэдактар баранавіцкай незалежнай газэты «Intex-press» Уладзімер Янукевіч, як заўсёды, першым прыйшоў на працу і быў шакаваны ўбачаным: «Рэдакцыйныя дзьверы былі залепленыя ўлёткамі, дзе гаварылася, што супрацоўнікі газэты — агенты ЦРУ, — кажа рэдактар. — Таксама быў суправаджальны ліст, які паведамляў: калі мы ня спынім даваць на старонках газэты слова прадстаўнікам апазыцыі, то нас чакае сьмерць. Пад подпісам НБП». Каля рэдакцыі на асфальце была намаляваная сымболіка арганізацыі (фашыстоўскі арол зь сярпом і молатам) і надпісы «Intex-press — прадажная пресса». Рэдактар упэўнены, што далей пагрозаў справа ня дойдзе, але зазначае, што ўсё адно інцыдэнт непрыемны.

Такі ж ліст надоечы атрымала віцебская актывістка АГП Алена Залеская. Яе палохаюць актывісты расейскіх нацыстаў з РНЕ. У лісьце, які яна атрымала праз пошту, гаворыцца, што РНЕ мэтанакіравана падтрымлівае палітыку дзейнай улады, і спн.Залеская цягам тыдня мусіць стаць у шыхты РНЕўцаў, інакш яе чакае пакараньне. «Не запалохаюць яны мяне такой лухтой», — кажа А.Залеская.

Дзіўным чынам абодва лісты надзвычай падобныя стылістычна, нібыта іх пісаў адзін і той жа чалавек.

Трэба адзначыць, што за апошнія гады падобныя пасланьні атрымлівалі шмат хто зь беларускіх дзеячаў і арганізацыяў, але далей за пустыя словы справа не пайшла. Адрасаты гэтых лістоў таксама не палохаюцца магчымых наступстваў.

**ЗП**

# Разарэньне рэжыму



**Павал Севярынец** — у 1998—2004 лідэр незарэгістраванага «Маладога фронту». Асуджаны за арганізацыю акцыяў пратэсту пасьля рэфэрэндуму 2004 году. Цяпер у высылцы ў Малым Сітне, на поўначы Полаччыны.

## ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ

У першую ліпеньскую ноч у Малым Сітне адбылася чарговая п’яная сьмерць. Хлопцы, што папрыяжджалі з гораду на выходныя, паўпіваліся ў сельскім клюбе («максімку» прадаюць проста на дыскатэцы) ды наладзілі гонкі на матацыклах па вёсцы. 29-гадовы палачанін на «Яве» наляцеў на дзяўчыну, што працуе касіркай у канторы леспрамгасу. Дзяўчыну зьвезла «хуткая»; апэрацыя ішла 6 гадзінаў, жыцьцё, дзякуй Богу, уратавалі. Хлопца, які з матацыклам праляцеў да бліжэйшых дрэваў, павезьлі хаваць у Полацак.

Вы слушна падумалі, што піць у вёсцы пасьля гэтага менш ня сталі. Такая сьмерць сіценскіх аматараў «максімкі» не палохае: значна больш іх палохае цьвярозае жыцьцё.

«Піць або ня піць?» — для большасьці сіценцаў не пытаньне. Парадыгма іншая: «Колькі?», «З кім?», «За што?», «Зь якой нагоды?». І ўрэшце канцавую кропку ў гэтым рытарычным шэрагу ставіць раптоўная сьмерць-атручваньне, п’яная бойка, пажар, угар, самагубства.

«Куды ж глядзіць улада?!» — абурыцеся вы.

Глядзіць у самы корань.

Спойваньне народу — справа надзвычай выгодная. Апроч ладнае долі бюджэту, алькагалізацыя ўсяе краіны забясьпечвае грамадзкую пасіўнасьць. Топіць пратэстныя настроі (дастаткова пагразіць спажыўцу сьпіртнога, які «качае правы», што будзе звольнены з працы «паводле артыкулу») і гарантуе мутны позірк на рэчаіснасьць. Якія мы, бач, расцудоўныя, нам і мора ніжэй калена. Заадно рабацягі ледзь дажываюць да пэнсійнага ўзросту — і павольна мруць. Эканомія, не раўнуючы як у Трэцім Райху. Такім чынам, апроч лядовых палацаў ды бібліятэчнага *ромбададэкаэдру*, наша эпоха пакіне Новай Беларусі яшчэ й алькагольную залежнасьць мільёнаў, здольную разбурыць любыя грамады рэформаў.

Дзяржаўныя абмежаваньні, забароны й рэпрэсіўныя меры рады не дадуць. Неяк на перакуры ў Алёшчы брыгада абмяркоўвала, як выкручваліся падчас «гарбачоўскае кампаніі», калі з крамаў пазьнікалі гарэлка ды «чарнілы». «Самагон тады ўсёй вёскай гналі... Адэкалён нічога быў, гэты, як яго, трайны — хоп і пахнеш, як прынц... А памятаеш, Сямёныч, ад лясьёнаў такая пена была, во мылам адрыгалася!.. Ага, а як дыхляфосам у піва пшыкалі... А клей на сьвердзел намотвалі!..»

Попыт нараджае прапанову, а Беларусь ужо цяпер захлынаецца ў багне таго попыту. Вядома, пасьля зьмены рэжыму будуць патрэбныя масавыя агітацыйныя кампаніі за здаровы лад жыцьця, падвышэньне коштаў і якасьці сьпіртнога, поўны спэктар стымулаў цьвярозасьці ад спрыяньня дробнаму й сярэдняму бізнэсу да ліквідацыі схаванага беспрацоўя. Але агульнапрызнана, што найлепшыя вынікі ў антыалькагольнай тэрапіі даюць высілкі абуджанага, ахопленага энтузіязмам грамадзтва: усталяваньне высокага маральнага стандарту праз моцныя цэрквы, трывалыя сем’і й адраджэньне нацыянальнай культуры. На пачатку XX ст. фэнамэнальных посьпехаў у

## ХРОНІКА РЭПРЭСІЙ І СУПРАЦІВУ 4 — 17 ЛІПЕНЯ

### Маладафронтаўцу паказалі раздрукоўкі падслухоўваньняў

5 ліпеня ў Менску ў пракуратуру выклікалі на допыт **Насту Палажанку** і **Аляксея Янушэўскага**. Позвы на допыт атрымаў таксама **Кірыла Шымановіч**. 12 ліпеня выклікалі **Зьмітра Хведарука**. У Бабруйску 13 ліпеня на допыт выклікалі **Валера Мацкевіча**: хлопцу паказалі раздрукоўкі (на 40 аркушах) тэлефонных размоваў паміж моладзевымі актывістамі. 14 ліпеня ў нясьвіскай пракуратуры дапыталі **Насту Азарку**.

13 ліпеня маладафронтаўцы атрымалі адказ з ГУУС Менгарвыканкаму на патрабаваньні сваёй **20-дзённай галадоўкі**: яна названая несанкцыянаванай, бо арганізатары «масавай акцыі» не паведамілі пра месца і час, таму выканаць патрабаваньні галадоўнікаў гарвыканкам адмовіўся.

### Працэс Казуліна: хроніка

Судовы працэс над экс-кандыдатам у прэзыдэнты распачаўся 6 ліпеня. Ад самага пачатку ў залю перашкаджалі патрапіць журналістам і замежным дыплятам. Сьмех у залі выклікала забарона **Юліі Казулінай**, дачцэ абвінавачанага, выступаць у якасьці абаронцы: судзьдзя (Аляксей Рыбакоў) скарыстаў шум як падставу для таго, каб выдаліць усіх гледачоў.

6 ліпеня каля суду затрымалі **Крысьціну Шацікаву** (на ёй была чырвоная саколка з партрэтам Казуліна) і наступнага дня аштрафавалі на 2 базавыя велічыні (62 тыс.).

Судзьдзя адмовіўся выклікаць сьведкаў з боку Казуліна, у тым ліку былога байца падразьдзяленьня «Алмаз».

12 ліпеня Казуліна выдалілі з залі суду, пазбавіўшы апошняга слова. Пракурор Сяргей Бортнік запатрабаваў 6 гадоў пазбаўленьня волі. 13 ліпеня суд прысудзіў 5,5 году калёніі агульнага рэжыму.

14 ліпеня разглядалася скарга адвакатаў на незаконнае затрыманьне палітыка 25 сакавіка. Суд адхіліў скаргу.

### Працэс Аўтуховіча

7 ліпеня суд Кастрычніцкага раёну Горадні абвесьціў вырак ваўкавыскаму прадпрымальніку **Мікалаю Аўтуховічу**: 3 гады й 6 месяцаў калёніі ўзмоцненага рэжыму з канфіскацыяй маёмасьці і 5-гадовай забаронай зай-

змаганьні з п'янствам дасягнуў Каталіцкі Касьцёл: прыкладам, у 1911—1912 гг. манапolькі на Гарадзеншчыне зачыняліся адна пры адной праз адсутнасьць ахвотнікаў выпіць. Але вайна, рэвалюцыя й бальшавіцкае бязбожжа атруту на Гарадзеншчыну хутка вярнулі. У наш час сярод паводкі пітва праглядваюць адно выспачкі цьвярозасьці — той жа Мосар на Глыбоччыне, дзе самаахвярны Юзаф Булька прамаўляў казаньні, арганізоўваў жанок ды біў бутэлькі да тае пары, пакуль усе пітушчыя прылюдна ня выракліся свайго грэху.

А што рабіць усім астатнім, хто апынуўся па-за Мосарам? Калі дзяржава спойвае людзей мэтанакіравана? Калі гарэлка таньней за закуску? Калі хрысьціянскі актывізм не настолькі пашыраны ды яшчэ й прыцiснуты?..

Хлопец, які разьбіўся ў Сітне на матацыкле, быў мой аднагодак. Паводле сацыялёгіі, такія нават у вёсцы падтрымліваюць апазыцыю. Але ж вось — п'юць страшэнна.

Сустракаўся з гэтым парадоксам паўсюдна — і ў Менску, і ў Віцебску, і ў Малым Сітне. Прыхільнікі дэмакратыі — студэнты, прадпрымальнікі, інтэлігенцыя, службоўцы — п'юць у масавым парадку. Кажуць, ад безнадзёгі. Можна, вядома, уважаць гэта за крутое выяўленьне пратэсту. Бярэш тую бутлю за горла, як гранату, — а вось вам за ўсё, гады!.. Толькі лічбы даводзяць, што такое піцьцё — найлепшы спосаб падтрымаць рэжым. Мяркуйце самі: нашыя адукаваныя, кваліфікаваныя, культурныя (і збольшага гарадзкія) прыхільнікі рэгулярна ўжываюць зусім ня свойскі самагон і не шатляндзкае віскі, а, як правіла, дзяржаўную гарэліцу. Той самы прадукт, вытворчасьць якога нашаму «Белдзяржхарчпраму» абыходзіцца ў капейкі, але дае найвялікшы адсотак прыбытку ў бюджэт. А цяпер палічым. Возьмем 3—4 мільёны тых, хто звычайна галасуе за апазыцыю, і памножым на 10—15 літраў чыстага алькаголю, якія, згодна са статыстыкай, штогод прыпадаюць на сярэднюю беларускую душу, улічым, што гэтыя літры разводзяць да $40^0$ і прадаюць у дыяпазоне ад 5 да 20 тысячаў беларускіх рублёў за паўлітровую бутэльку... Хто ня верыць — спраўдзіце з калькулятарам: беларускія прыхільнікі дэмакратыі, п'ючы, штогадова субсыдуюць рэжым сама менш на *паўмільярда даляраў.*

Дарагія дэмакраты, эўрапейцы, нацыяналісты, рынкавікі! Можа, годзе ўжо чакаць вызваленьня ад дыктатуры праз расейскую газавую трубу? Мо пара ўжыць рычаг эканамічнага й палітычнага ціску параўнальнай магутнасьці?!

Увага! Прапаную ўсім супраціўнікам аўтарытарызму адмовіцца ад набыцьця й ужываньня алькаголю да поўнай перамогі над рэжымам. Сьвядомым беларусам і дысцыплінаваным партыйцам раю падрахаваць хаця б свой месячны вінна-гарэлачны бюджэт, скінуцца на 10-мільённы наклад антыалькагольных улётак з адпаведнай палітычнай аргумэнтацыяй (падлічана: хопіць на каляровы друк, фінскую паперу ды яшчэ на транспартныя выдаткі) — і раскруціць кампанію «разарэньне рэжыму» па ўсёй краіне. Замест тосту — тур па квартале з улёткамі. Плюс маральны эфэкт. Мінус пахмельле.

«Я ня п'ю, бо супраць Лукашэнкі!» — гучыць, га?!

...А чарачку за перамогу можна будзе падняць і пасьля. Вядома, калі захочацца. Бо насамрэч з пазбаўленьня ад усякага дурману й пачынаецца поўнае нацыянальнае абуджэньне.

*в.Малое Сітна*

Беларускія прыхільнікі дэмакратыі штогод субсыдуюць рэжым на паўмільярда даляраў.

## ХРОНІКА РЭПРЭСІЙ І СУПРАЦІВУ 4 — 17 ЛІПЕНЯ

мацца прадпрымальніцкай дзейнасьцю. **Юр'я Лявонава** асудзілі на 3 гады й 5 месяцаў калёніі ўзмоцненага рэжыму і забаранілі 5 гадоў займаць адміністрацыйна-гаспадарчыя пасады. Апрача таго, яны павінны сплаціць штраф у памеры 1,32 млрд руб.

### Пад Мядзелам

3 ліпеня на сьвяткаваньні Дня Рэспублікі падчас раздачы ўлётак з заклікам зьвяртацца ў АГП наконт развязаньня набалелых праблемаў затрымалі **Андрэя Абалевіча**. У пастарунку зь яго ўзялі пісьмовае тлумачэньне.

### 4 ліпеня: справа Дзянісава-Елавой

У Віцебску распачатая крымінальная справа ў дачыненьні да актывістаў «Бунту» **Дзяніса Дзянісава** (АГП) і **Тацяны Елавой** па сьлядах падзеяў 18—19 чэрвеня.

У Менску ў парку імя Горкага міліцыянты затрымалі моладзевых актывістаў **Зьмітра Хведарука** і **Аляксея Янушэўскага** за «незарэгістраваную сымболіку» на вопратцы.

### 5 ліпеня: галадоўка ў Берасьці

Калегія Магілёўскага аблсуду не задаволіла скаргі моладзевага актывіста **Сержука Нягаціна** і актывіста ПБНФ **Мікалая Малахава**, аштрафаваных увесну за распаўсюд улётак.

Адміністрацыйная камісія Першамайскага раёну Менску аштрафавала **З.Хведарука** на 2 б.в. за распаўсюд 13 чэрвеня ўлётак «без выходных зьвестак».

У Берасьці пачалі бестэрміновую галадоўку **ўладальнікі і работнікі маршрутных таксовак**: яны пратэстуюць супраць рэспубліканскага збору за ўвоз у краіну транспартных сродкаў з камэрцыйнымі мэтамі. На 17 ліпеня ў ёй удзельнічалі 13 чалавек.

### 6 ліпеня: штраф у Гомелі

Гомельскіх актывістаў АГП **Андрэя** і **Кацярыну Толчыных** выклікалі да судовага выканаўцы: на іх яшчэ 11 траўня адміністрацыяй Савецкага раёну завочна накладзены штраф у 5 б.в. на кожнага за «незаконны распаўсюд друкаваных матэрыялаў».

Салігорскі суд вынес папярэджаньне

**Працяг на старонцы 18.**

**Працяг са старонкі 15.**

бацькам 16-гадовага **Яўгена Мядзьведзева**, затрыманага ў сярэдзіне чэрвеня падчас пікету супраць суду.

### 7 ліпеня: палітычная псыхіятрыя

У Віцебску за распаўсюд недзяржаўнай прэсы затрымалі **Барыса Хамайду**. Яго зьвінавацілі ў гандлі ў неналежным месцы й супраціве міліцыі ды арыштавалі на 2 сутак. 10 ліпеня яго зноў затрымалі й аштрафавалі за гандаль у неналежным месцы на 1 б.в. 12 ліпеня затрыманьне скончылася толькі пратаколам.

У Менску разагнаны жывы ланцуг у памяць аб Зьмітры Завадзкім. Затрыманыя каля 10 удзельнікаў, якіх выпусьцілі без пратаколаў. Сярод затрыманых **Наталька Харытанюк, Аляксандра Худасоўцава, Сьцяпан Навасяльчан, Сяргей Вакуленка, Мікалай Пекар**.

У Горадні на такой самай акцыі затрымана 6 чалавек. **Паўла Язерскага** пасьля допыту ў міліцыі завезьлі ў псыхіятрычную лякарню: на ўсе пытаньні міліцыянтаў ён адказваў «ня памятаю». Дактары кажуць, што выпусьцяць 26-гадовага хлопца толькі праз месяц. Раней хлопец ніколі на псыхіятрычным уліку не стаяў.

Стала вядома, што суд над актывістамі незарэгістраванай арганізацыі «Партнэрства» **Цімохам Дранчуком, Міколам Астрэйкам, Энірай Браніцкай** і **Аляксандрам Шалайкам** перанесены з 20 на 28 ліпеня і будзе закрытым.

### 8 ліпеня: Статкевіч

**Міколу Статкевічу**, адпушчанаму ў Менск на 2-тыднёвы адпачынак, затэлефанаваў кіраўнік Баранавіцкай спэцкамэндатуры і паведаміў, што палітвязьню нельга перасякаць мяжу Першамайскага раёну сталіцы: палітык хадзіў на суд над Аляксандрам Казуліным.

### 10 ліпеня: суд над вандалам

Басманны суд Масквы пачаў разгляд крымінальнай справы грамадзяніна Беларусі **Юрася Іванюковіча**: яго вінавацяць у вандалізьме за тое, што напісаў на беларускай амбасадзе «Жыве Беларусь» і «БТ хлусіць». Працэс адкладзены да 20 ліпеня: хлопцу шукаюць беларускамоўнага перакладчыка.

Актывіста АГП **Івана Крука** з Астраўца, засуджанага на 6 месяцаў арышту, адправілі адбываць пакараньне.

У Воршы за расклейку плякатаў «Свабоду Казуліну» затрымалі **Ігара Крыштона**. У пастарунку ён прабыў 8 гадзінаў, бо не было каму дапытаць затрыманага. На яго склалі партакол за «парушэньне правілаў добраўпарадкаваньня і ўтрыманьня населеных пунктаў і разьмяшчэньне аб'яваў у неадпаведных месцах».

### 9 ліпеня: а чаго яны езьдзяюць

У Беларусь не пусьцілі трох польскіх сэнатараў, у тым ліку кіраўніка бюро сэнатараў **Артура Казлоўскага**, а таксама кіраўніка «Wspolnoty Polskiej» **Анджэя Стэльмахоўскага**: яны ехалі на сустрэчы зь непрызнаным уладамі Саюзам палякаў Беларусі.



WWW.CHARTER97.ORG

**Разгон акцыі пратэсту ля расейскай амбасады 16 ліпеня, напярэдадні саміту G8.**

### 11 ліпеня: спыненьне «Химика»

Недзяржаўная газэта **«Химик»** у Наваполацку прыпыніла выхад на няпэўны тэрмін. Выданне, выключанае з падпісных каталёгаў і «Саюздруку», ня здолела арганізаваць сыстэму распаўсюду праз перашкоды ўладаў. Гарвыканкам таксама адмовіўся даць калектыву газэты ліцэнзію на раздробны гандаль.

Магілёўскай суполцы **прафсаюзу РЭП** управа юстыцыі гарвыканкаму чарговы раз адмовіла ў рэгістрацыі. Афіцыйная прычына — ня ўзгоднены з уласьнікам юрыдычны адрас. Раней суполка падавала заяўку на пікет на знак пратэсту ў адмове рэгістрацыі: ад яе запатрабавалі аплаціць у тым ліку і арэнду зямлі, на якой меўся адбыцца пікет.

### 12 ліпеня: а дзе там Сівец?

Наваполацкія актывісты падалі скаргу старшыні Віцебскага аблвыканкаму Ўладзімеру Андрэйчанку на кіраўніцтва Наваполацкага гарвыканкаму. Актывісты меліся ладзіць штодзённыя **пікеты падтрымкі палітвязьняў** каля Палацу культуры з 26 красавіка па 26 чэрвеня. Ім далі дазвол толькі на адзін такі пікет, а на астатнія — у гарадзкім парку.

У Гомелі 12 і 13 ліпеня капітан міліцыі Гарбаценка прыходзіў дадому да маладзевай актывісткі **Юліі Сівец** і цікавіўся, ці ў горадзе яна. Дзяўчына лічыць, што гэта зьвязана з тым, што КДБ перадаў у пракуратуру матэрыялы па зачыненай уладамі ГА **«Моладзевы цэнтар «Гарт»**.

13 ліпеня Вярхоўны суд пакінуў у сіле рашэньне Менгарсуду пра ліквідацыю рэлігійнай суполкі **«Запавет Хрыста»**: афіцыйная прычына — неадпаведны юрадрас.

15 ліпеня ў аэрапорце Масквы расейскія памежнікі не пусьцілі ў краіну галяндку **Ірэн ван дэр Брок**, чыё імя ёсьць у беларускім «чорным сьпісе».

### 16 ліпеня

Акцыя Дзень салідарнасьці каля расейскай амбасады ў Менску жорстка разагнаная спэцназам. Затрыманыя **Павал Давідовіч, Ягор Віняцкі, Аляксей Ляўковіч, Павал Вараб'ёў, Іван Шаблінскі, Анатоль Аскерка, Зьміцер Бародка, Валянцін Сусла, Ганна Варанец, Аляксей Дземідовіч, Зьміцер Хведарук, Алег Клюшна, Аляксандар Сьцепаненка, Віталь Гаўрыленка, Андрэй Галко, Аляксандар Вайтовіч, Андрэй Бабіцкі** (даставілі ў РУУС зьбітага да крыві), **Аляксей Куксік, Ігар Пандзілаў, Алеся Ясюк, Шаўлюкевіч, Надзея Клімовіч, Сяргей Кулінчанка, Сяргей Міхалькоў, Мікіта Шуцянкоў, Сяргей Ласы, Уладзімер Міхалькоў, Мікіта Красноў, Руслан Мацьвееў, Аляксандар Кушко, Натальля Лявонава, Сяргей Давыдчук, Уладзіслаў Бародка, Міхаіл Кандрашоў, Вадзім Ключнік, Настасься Шашкова, Тацяна Шкраба, Іван Шутко, Тацяна Канкар, Анатоль Лябедзька, Аляксандар Віднікевіч**. Наступнага дня А.Аскерку і А.Лябедзьку асудзілі на 10 сутак.

У Магілёве на акцыі салідарнасьці затрымаая **Крысьціна Шацікава** з 10-гадовым сынам **Мікітам**, а таксама **Сяржук Гіркін, Ірына Качарова** (АГП), **Алег Дзьячкоў** (ТБМ). У Горадні затрыманыя **Юры Істомін, Уладзімер Ларын, Аляксандар Краўцэвіч, Павал Бяланаў, Мікалай Воран**. У Баранавічах затрымалі 7 маладзёвых актывістаў: 6 адпусьцілі, бо непаўналетнія, на **Юлію Харкевіч** склалі адміністрацыйны пратакол.

### 17 ліпеня: затрымалі за беларускую мову

У Цэнтральным судзе Гомелю пачаўся разгляд скаргі актывіста АГП **Васіля Палякова** на аблвыканкам, які ў красавіку не дазволіў правесьці чарнобыльскі мітынг.

У Вялейцы актывіста ПБНФ **Аляксея Сюдака**, затрыманага 15 ліпеня падчас міліцэйскага рэйду, суд аштрафаваў на 1 б.в.

Са словаў **Мікалая Агароднікa**, які вяртаўся з адпачынку, у Баранавічах затрымалі за тое, што адказаў міліцыянту на пытаньне пабеларуску. У пастарунку на яго склалі пратакол, што супраціўляўся міліцыянтам.

**АШ**

# Як здароўе Бураўкіна і Тарасава?



Генадзь Бураўкін.

Гэтай вясной адразу ў двух беларускіх пісьменьнікаў узьніклі праблемы са здароўем. Спачатку ў красавіку інсульт напаткаў аўтара бэлетрычнай «Пагоні на Грунвальд» Кастуся Тарасава. Пасьля 12 траўня падчас разьбіральніцтва ў Мін'юсьце па ліквідацыі Саюзу пісьменьнікаў інфаркт здарыўся з паэтам Генадзем Бураўкіным. Як сёньня пасьля некалькіх месяцаў пачуваюцца майстры слова?

Генадзь Бураўкін, як звычайна, лета праводзіць на ўласным лецішчы ў Крыжоўцы, што блізу Менску. Пра стан свайго здароўя нічога пэўнага сказаць ня можа: «Хутка дактары, магчыма, паведамяць больш падрабязна, як інфаркт адбіўся на здароўі. Пакуль што маюся паціху, адпачываю ў далечыні ад гарадзкога шуму. Вершаў, праўда, пакуль не пішу, бо на мяне заўжды кепска дзейнічала сьпёка, а цяпер яшчэ вось гэтыя праблемы з сэрцам». У голасе паэта адчуваецца стома, але адначасова жаданьне як мага хутчэй вярнуцца да паўнавартаснага жыцьця.

Пра самачуцьце Кастуся Тарасава распавядае ягоная дачка Ганна, якая цяпер жыве ў Маскве, яна настроена аптымістычна: «Бацька пачаў самастойна хадзіць, левая рука стала добра рухацца, правая таксама выходзіць са стану нерухомасьці, лепшае і з гаворкай». Кастусь Тарасаў цяпер таксама знаходзіцца на лецішчы, дачка нядаўна завязла яму кампутар, дык пісьменьнік ужо пачаў выходзіць у Інтэрнэт, ён працягвае цікавіцца беларускімі і сусьветнымі падзеямі. «Можа, ужо хутка вернецца да сваіх творчых справаў», — падсумоўвае аповед Ганна Тарасава.

**Зьміцер Панкавец**

## Гадавіна Грунвальду ў Горадні

14 ліпеня, напярэдадні дня Грунвальдзкай перамогі, ля Каложы адбылася традыцыйная талака. Актывісты прыбралі ля памяткі «Пагоня на Грунвальд».



АЛЯКСЕЙ ШОТА

Супрацоўнікаў міліцыі, што назіралі за «суботнікам», было ўдвая больш за колькасьць удзельнікаў. Яны фільмавалі актывістаў на відэа. На жартам выказаную прапанову дапамагчы, каб усе пайшлі дамоў раней, прадстаўнікі праваахоўнае службы не адрэагавалі. Калі праца была скончана і людзі пачалі разыходзіцца, міліцыянты зьніклі.

На наступны дзень да памятнага знаку былі ўскладзеныя кветкі і павешаны нацыянальны сьцяг. Таксама кветкамі й сьцягамі былі ўпрыгожаныя помнік Вітаўту Вялікаму ды памятны валун Давыду Гарадзенскаму. Позна вечарам ля Каложы са зьнічак быў выкладзены вялікі шасьціканцовы крыж, а на бліжэйшы слуп павешаны сьцяг. Ён правісеў да абеду наступнага дня. Гэтым разам міліцыя не зачапіла актывістам.

**Аляксей Шота, Горадня**

## ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

### Выстава фатографа «НН» Андрэя Лянкевіча

12 ліпеня ў менскай кавярні «Лёндан» (пр.Скарыны, 18, насупраць «Цэнтральнай кнігарні») адкрылася выстава фатографа «Нашае Нівы» Андрэя Лянкевіча. Гэтыя здымкі ён прывёз з Арменіі. На іх — жыцьцё загадкавага народу езыдаў. Выстава мае доўжыцца дваццаць дзён.

Болей пра езыдаў: http://nn.by/index.pl?theme=nn/2005/27&article=sv-aln

Болей пра Андрэя Лянкевіча: www.liankevich.com

### Шатэрнік і краскі

У арт-кавярні «Добрыя мысьлі» адчынілася выстава Алеся Шатэрніка «Беларусь Сьвятая». Нягледзячы на прэтэнцыёзны назоў, гэта вельмі яркая, лёгкая й сьветлая экспазыцыя. Тыя, хто ведае даробак Шатэрніка як грунтоўнага скульптара, будуць шчыра зьдзіўленыя гэтай амаль бязважкай, празрыстай часткай ягонае творчасьці.

Кавярня месьціцца па адрасе Магілёўская, 12 («Фальварак Добрыя Мысьлі», уваход збоку).

Рэцэнзію Сяргея Харэўскага на выставу чытайце ў наступным нумары «НН».

# Божая кара

за маўчаньне ксяндзоў падчас вандальнай рэканструкцыі Горадні? Вэрсіі пажару ў Фарным касьцёле разглядае Ірына Чарняўка.

Найкаштоўнейшы помнік эўрапейскага барока, унікальны 300-гадовы аўтар Фарнага касьцёлу сьв. Францішка Ксавэр'я ў Горадні гарэў у ноч на 13 ліпеня. Імаверная прычына пажару — замыканьне электраправодкі, кажуць спэцыялісты МНС. Гарадзенцы гавораць, што гэта — божая кара за вандальную «рэканструкцыю» Савецкай плошчы.

Пажар заўважыў начны вартаўнік касьцёлу. Каля 3-й ночы ён пачуў трэск у храме — увайшоўшы, убачыў, што агонь зьядае драўляныя скульптуры галоўнага аўтара. Пажарнікі прыехалі празь пяць хвілінаў, але правую частку аўтара выратаваць не ўдалося. Зьнішчаныя калёны і чатыры скульптуры: тры зь дзесяці апосталаў у ніжнім ярусе і сьвяты ў другім ярусе. Некаторыя іншыя элемэнты абгарэлі альбо растрэскаліся.

«Ня ведаю як ацаніць тое, што мы страцілі, ацаніць гэта немагчыма! — камэнтуе краязнаўца Алесь Госьцеў. — Ведаеце, як кажуць: вор крадзе, але пакідае сьцены, пажар не пакідае і сьценаў. Жудасная страта! Добра, што ня ўвесь аўтар згарэў».

Галоўны аўтар загарэўся з правага краю, прыкладна ля другой скульптуры. Людзі кажуць, што выглядала так, нібы полымя імкнецца ад аўтара ў галоўную частку храму. Відавочна, што такі дзіўны эфэкт стварыла сама дугавая форма аўтара, ды і тое, што звод цэнтральнай абсыды быў ніжэйшы за цэнтральны купал — і стваралася своеасаблівая цяга, якая не дала агню ахапіць увесь аўтар. «Бог ратаваў, — гавораць прыхаджане і дадаюць: — Сьпярша пакараў — а затым ратаваў». За тры стагодзьдзі пажар — першы ў гарадзенскай Фары, дагэтуль ніякія катастрофы ды войны не прычынялі яму такой шкоды.

Адносна прычынаў загараньня яснасьці пакуль няма. «Магу вас запэўніць, што гэта не падпал і не тэракт», — заявіў падчас прэс-канфэрэнцыі кіраўнік абласнога ўпраўленьня МНС Анатоль Бабій. Ратавальнікі лічаць, што загарэлася электраправодка, якая праходзіла і каля аўтара. Сьвятары касьцёлу і біскупская курыя ад камэнтароў адмаўляюцца. 80 гадоў касьцёл сілкаваўся праз электраправодку, праведзеную яшчэ за польскім часам. Але чатыры гады таму праводка была зьменена. Праўда, невядома, ці цалкам.

«Калі пажар адбываецца ўночы — ніколі ня верце ў вэрсію замыканьня праводоў», — ва ўмовах ананімнасьці зазначыў спэцыяліст, што абсьледаваў касьцёл пасьля пажару. — Такія выпадкі — гэта альбо падпал, альбо нядбайнасьць».

Разам з аўтаром згарэў слайдавы праектар, зь яго падчас службаў дэманстраваліся тэксты песьняў і малітваў. Знаходзіўся ён якраз каля аўтара, з правага боку. МНС не выключае, што праектар маглі пакінуць уключаным, а ў тыя дні стаяла моцная гарачыня, і перагрэтая тэхніка магла загарэцца.

«На дзіва, за апошні год Гароднявя губляе свае важныя сымбалі», — кажа кандыдат гістарычных навук, супрацоўнік Гарадзенскага ўнівэрсытэту Андрэй Чарнякевіч.

Пажар у гарадзенскай Фары стаў моцным ударам пасьля крадзяжу ў мінулым годзе шахматнай ладзьдзі XII ст., што захоўвалася ў музэі Старога замку. А гэты год прынёс цэлую сэрыю стратаў разам з ініцыяванай гарадзкімі ўладамі рэканструкцыяй Савецкай плошчы. Экскаватары зьнялі культурны слой XVII—XVIII ст., парушылі палацавыя муры і скляпеньні, старажытныя ходнікі, што дагэтуль захоўваліся пад асфальтам і паркамі Савецкай.

«Ёсьць адно слушнае тлумачэньне, — гаворыць Алесь Госьцеў. — Падчас рэканструкцыі Савецкай плошчы я, праходзячы каля Фарнага касьцёлу, адчуваў, якая ідзе па зямлі вібрацыя ад той цяжкой тэхнікі. Пэўна, і па касьцёле пайшлі трэшчыны. Мяркую, гэтыя працы адабралі ў касьцёлу яго 300 год жыцьця».

«Гэта божае пакараньне за тое, што мы маўчалі, калі разбураліся падмуркі на Савецкай», — гавораць прыхаджане.

Спэцыялісты ў дрэве, што дасьледавалі вынікі пажару, прыйшлі да высновы, што скульптуры галоўнага аўтара былі выразаныя зь ліпы. Каб з часам не патрэскаліся, майстар зрабіў іх пустымі ўнутры. Калёны і дэкаратыўныя элемэнты аўтара — з сасны. Знайсьці кваліфікаваных майстроў, каб аднавіць іх — цяжка.

«Я ня ведаю, як касьцёл будзе выходзіць з сытуацыі, — пракамэнтаваў рэстаўратар Уладзімер Кіслы. — Каб гэта ўсё аднавіць — патрэбны час і сродкі».

**Гарадзенская Фара** для Беларусі — гэта як Ісакіеўскі сабор Пецярбургу. Галоўны аўтар касьцёлу паводле каштоўнасьці параўноўваюць з аўтаром Марыяцкага касьцёлу ў Кракаве.

**Храм Францішка Ксавэрыя** — адзіны езуіцкі прыкляштарны касьцёл у Беларусі, які захаваўся ў першапачатковым выглядзе. Яго будаўніцтва стала выкананьнем запавету караля Сьцяпана Батуры, што запрасіў езуітаў у Горадню, а сам казаў — «каб я ня быў каралём, стаў бы езуітам». Храм быў асьвячоны ў 1705 г. у прысутнасьці караля Рэчы Паспалітай Аўгуста Моцнага і Пятра I.

**У саборы месьціцца** вялікая колькасьць аб'ектаў, да якіх цалкам слушна прымяніць слова «ўнікальны»: гэта і цудадзейны абраз Маці Божай Кангрэгацкай XVII ст., каранаваная колькі гадоў таму са згоды Яна Паўла II. І 14 фрэсак з жыцьця Францішка Ксавэр'я.

**Галоўны аўтар** зрабіў у 1737 г. слынны польскі майстар Ян Шміт у 1737 г. 26 скульптур на трох ярусах — сьвяты Францішак Ксавэры, Хрыстос Валадар сусьвету, дзесяць апосталаў, чацьвёра эвангелістаў, чацьвёра сьвятых, фігуры жанчын, што ўвасабляюць чатыры кантынэнты сьвету. Кожная скульптура — анатамічна правільная, адрозьніваецца позай і жэстам, мае асобны выраз твару, на якім адбіваюцца нададзеныя майстрам глыбокай разьбой моцныя пачуцьці.


WWW.SVABODA.ORG

**Парэшткі згарэлых старажытных скульптураў.**

# Залатая дваццатка. Вясна–2006



**Галоўныя беларускія гіты сэзону. West Records, 2006.**

Паслухаць гэты дыск варта ўсім, каму абыякавы лёс айчыннай музыкі.

Гэтая складанка чарговы раз паказвае, наколькі здаровая наша эстрада. Паслухаць гэты дыск варта ўсім, каму абыякавы лёс айчыннай музыкі. Бо тут усе праблемы навідавоку. Першае, што кідаецца ў вушы — безаблічнасьць. Большасьць выканаўцаў немагчыма распазнаць, калі не трымаць у руках вокладкі. Другое — кульгавыя аранжыроўкі. Вунь, Калдун калісь сьпяваў «песьні беларускіх кампазытараў» і зьліваўся з масай сабе падобных. А як руку прыклалі людзі, абазнаныя ў сучасных музтэндэнцыях, дык і перамог на «Фабрыцы». А пра выканаўцу прэзэнтаванай тут песьні «На ўзбочыне кантрольнай паласы» наагул ня будзем казаць — надта ўжо набалелая тэма.

«Залатая дваццатка» са стандартным наборам «аэнтэшных» зорак кшталту Грышанавай, «Топлес», «Черники» — прадукт для ўнутранага спажываньня. У тым сэнсе, што яго сорамна камусьці паказваць, і калі знойдуцца такія, хто захоча падпець, напрыклад, сьпявачцы з модным псэўданімам Проста Марыя, то лепей тое рабіць шэптам.

Карацей, няроўная такая складанка.

# Чарнобыльскі Вецер




**Розныя выканаўцы. VoliaMusic, 2006.**

Другі прадукт кансьпіратараў з «VoliaMusic».

У пэўным сэнсе антыпод «Залатой дваццаткі»: тэматычная складанка «Чарнобыльскі вецер» — другі прадукт кансьпіратараў з «VoliaMusic». Зьбіраць беларускую музыку па такіх ідэйных разьдзелах — задума добрая. Толькі адчуваецца, зь якім нацягам наскрэблася песень на цэлы дыск. Вядомыя ўжо творы «Бонды» («Радыяактыўны блюз»), «Мроі» («Шмат») і «Крамы» («Гомельскі вальс») мяжуюцца тут з рарытэтамі (як песьня польскіх беларусаў з «Кардону»), сьвежымі запісамі (Tav.Mauzer, «Чырвоным па беламу»). Музыкі рыфмуюць радыяцыю з нацыяй, інфармацыяй, правакацыяй. Але лепей выглядаюць без такіх наўпроставых рыфмаў, як у Кастуся Герашчанкі («Чарнобыльскі шлях») ці Яна Жанчака («Нерасказаныя казкі»). У складанцы тоіцца шмат сюрпрызаў і новых імёнаў. З галоўных знаходак — «Песьня Чугайстра» ўкраінцаў «Тінь Сонця», засьпяваная па-беларуску, і нязмушаны «Чарнобыльскі фон» ад «Голай манашкі».

Шкада, што ў дыск не ўвайшла адна з самых кранальных песень пра Чарнобыль канца 90-х — «Радыяактыўны сьнег» ляўрэатаў «Басовішча-98» гарадзенцаў з «КальЯну» — і абяцаны кліп рэжысэра Ягора Хрусталёва, дзе Варашкевіч разам зь Ярмоленкам сьпявае «Гомельскі вальс».

Вокладка аздоблена прароцкім малюнкам Андрэя Плясанава (яго песьня таксама ёсьць на дыску) пад назвай «Саркафаг», зробленым у 1971 годзе.

# Мне гэтага мала



**M'Anzhura. West Records, 2006.**

А па прафэсіі ён юрыст.

Дзіўны пульхнаваты чалавек няпэўнага ўзросту, які пазірае з вокладкі дыску, — і ёсьць новая айчынная поп-зорка Манжура, праўнік па прафэсіі. Немудрагелісты «тымц-тымц» (часам зроблены па-людзку) з рыфмоўкамі «слова — слеза», «губах — руках», сьпеты голасам пасталелага Юр'я Шатунова. Невядома, для каго і навошта зьявіўся на сьвет гэты прадукт, але падзякаваць Манжуры можна хаця б за тое, што ён уключыў у альбом толькі 7 песень — недаальбом ці перасамотнік такі выйшаў. Для айчыннага FM гэта ў пэўнай ступені знаходка. Слаба верыцца ў магчымасьць раскруткі гэтага дыска, але саладжавы галасок сьпевака можа крануць душу *дзяўчонак,* якія будуць заганяць гэтыя песенькі ў свой *Winamp* між Стасам П'ехам і Данкам. На такую аўдыторыю і скіраваны погляд артыста, які так задуменна пазірае з розных бакоў вокладкі дыска.

# Radzima.com



**ZET. Go-records, 2006.**

Геніяльна.

Адзін з самых доўгачаканых альбомаў гэтага стагодзьдзя ад вялікіх кансьпіратараў беларускага року, якіх, зрэшты, ужо даўно ўсе вылічылі. «Людзі ў масках» пяюць пра надзённыя рэчы — пра Айчыну, якая выглядае, як стомленая жанчына, пра Дзяржтэлерадыё, якое высмоктвае ўсе жыцьцёвыя сілы, і зіхоткага анёла, які абавязкова прыляціць. «Людзі ў масках» знайшлі свой ідэальны музычны фармат, і ўсё ў іх на месцы — дзе гітарка з драйвам, а дзе скрыпачка мілая, а дзе ўсё разам. Гэта той выпадак, калі слухаеш дыск некалькі разоў і аніяк ня можаш абраць упадабаную песьню, бо ў кожнай ёсьць нешта такое, што шчэ доўга не адпускае. З асацыяцыйнай трыяды *N.R.M.* — «Крамбамбуля» — *ZET* апошнія вылучаюцца найперш сваёй непрадказальнасьцю. Зэтаўцы могуць выдаць узор бардаўскай песьні, уразіць сацыяльнай чытанкай, закасіць пад «Tito і Tarantula» ці зьдзівіць адарвана-правакацыйным «Я цябе люблю, Я цябе заб'ю».

Добрую палову песень з дыска грамада ўжо пасьпела вывучыць на памяць, а «Белакрылы анёл» пасьпеў адзначыцца ў якасьці галоўнага беларускага гіта-2005, паводле вынікаў на «Тузіне Гітоў».

Рэклямная разынка: кожны, хто набывае дыск, аўтаматычна атрымлівае сьвежы нумар газэты «Радзіма», адрэдагаванай знаным беларускім газэтнікам Х.Ячубовікам. Добра, што выдаўцы пазначылі, што рэдакцыя не адказвае за зьмешчаныя на старонках газэты паклёп і абразу. А то пацягнулі б яе ў суд адразу.

**Сяргей Будкін**



# Інтым з Пуціным

Улюбёная забаўка аналітыкаў — варажыць, ці згадалі сусьветныя гранды беларускае пытаньне». Піша **Аляксандар Класкоўскі.**

У тых, хто рэгулярна чытае адмыслова заточаныя ўэб-рэсурсы, можа скласьціся ўражаньне, што прагрэсіўнае чалавецтва засынае й прачынаецца з думкаю пра дэмакратызацыю Беларусі. Насамрэч заходняга абываталя гэтае пытаньне дапякае ня болей, чым як савецкіх пралетараў, сагнаных у абед на мітынг, хвалявалі праблемы змаганьня з апартэідам у Паўднёвай Радэзіі.

Дый лідэры вялікіх краінаў — людзі прагматычныя. Нават калі б не калатнеча ў Лібане, не свавольствы Кім Чэн Іра ды хворая скула іранскай праблемы, — усё адно містэр Буш з фраў Мэркель у царскім антуражы пецярбурскага саміту ня сталі б як абухом па галаве мясіць сябра Ўладзімера «беларускім пытаньнем».

З энэргетычнай імперыяй варта лічыцца. Дый паразуменьне датычна блізкаўсходняга крызісу, ядравай праграмы Тэгерану, паўночнакарэйскіх закідонаў — усё гэта з пункту гледжаньня Вашынгтону, бадай, вартае таго, каб скрозь пальцы глядзець на пэўныя грахі Крамля. Нейкая згадка пра *Belarus* мо’ й прасьлізнула за чаркай гарбаты, але трэба быць зусім наіўным, каб спадзявацца, што падобнае мерапрыемства прадвызначыць лёс нашай краіны.

Па-свойму гэта разумее і тутэйшая ўлада. Таму так дэманстратыўна выносіцца напярэдадні G8 прысуд Казуліну. Таму ляціць у Менск Уга Чавэс. Таму раз-пораз атрымліваюць дулю пад нос Брусэль ды Страсбург.

Эўрапейскія палітыкі ў разгубленасьці. То кіраўнік дыпляматычнага ведамства Фінляндыі, якая старшынюе ў Эўразьвязе, раптам заяўляе, што беларускай кіроўнай эліце тыя санкцыі бы мерцьвяку прыпарка. То трапляе ў прэсу фрагмэнт канфідэнцыйнае перапіскі галяндзкага эўрапарлямэнтара Вірсмы зь Мілінкевічам. Няма чаго, маўляў, панове апазыцыянэры, шастаць па тых Брусэлях — давайце мацуйце кааліцыю ды заваёўвайце сымпатыі электарату ў сваіх родных палестынах!

Мілінкевічу зрабілі мядзьведжую паслугу. І ён мусіць ламацца ў адчыненыя дзьверы, даводзячы патрэбнасьць як кропкавых санкцыяў, так і міжнародных сувязяў апазыцыі. Сапраўды, было б глупствам адмаўляцца ад магчымасьці, напрыклад, разам з кіроўнымі асобамі замежных краінаў адкрываць праграмы навучаньня для рэпрэсаваных студэнтаў. Дый увогуле ўзровень кантактаў, недасяжны для афіцыйнага кіраўніка, — ці не галоўны піяраўскі козыр апазыцыйнага лідэра. І ня варта заганяць яго ў вадэвільную ролю местачковага карбанарыя.

Пры ўсёй важнасьці вандровак Мілінкевіча па краіне сьмешна было б разьлічваць, што ён вось так возьме ды сваёй харызмаю па чарзе запаліць рэвалюцыйнае полымя ў кожным раёне. У лідэра мусіць быць працаздольная каманда, на плечы якой кладзецца карпатлівая штодзённая праца.

І ўжо сёньня варта дэталёва распрацоўваць кампанію ў зьвязку з мясцовымі выбарамі, што могуць зваліцца як сьнег на галаву. Пакуль тут, у краіне, у грамадзтве, нічога ня зрушыцца, дык і Вашынгтон з Брусэлем не дадуць рады — ні заявамі, ні санкцыямі, ні інтымнымі размовамі з гаспадаром Крамля.



АРЦЁМ ЛЯВА

# Шчыры дзякуй за шчодрасьць

**Г.В., Л.Ж., Паўлу Б., Вадзіму Г., А.П., Андрэю Ф., Марыне П., Н.А., Акіму К., Ірыне М., Юр'ю М., Алегу Т., Генадзю Ц., Андрэю С., А.Л., Алісе Р., М.Р., Н.М., Дар'і С., Т.М., Сяргею Д., Паўлу П., В.Б., А.Б., І.Т., Зьмітру Р., Міхаілу Ж., Валеру К., М.У., Ю.В., Юр'ю В., Уладзімеру С., Тацяне С., Паўлу Н., С.Я., Алегу А., Іне К., І.Ш., Віктару Л., У.Л., Ігару Ж., Пятру Б., Ю.Ф., Анатолю К.** зь Менску.

**Вользе Б., Сяргею Х.** са Століна.

**Ч.В.** зь Ліды.

**Андрэю Е., А.К., Я.Ч., Анатолю Х., Алене М., З.Ж., Ірыне Д., С.Д., Аляксандру А.** з Горадні.

**К.С.** з Горак.

**У.К.** са Ждановічаў.

**Аляксандру Т.** з Лагойску.

**Уладзімеру М.** з Гомельскага раёну.

**Я.С., А.К.** зь Пінску.

**Глафіры Д.** зь Бешанковічаў.

**Міколе Н., Сяргею Л.** зь Берасьця.

**Вячаславу С., Віктару М.** з Баранавічаў.

**Андрэю Ч.** з Рагачова.

**Лізавеце К.** з Маладэчна.

**Антону Б.** зь Верхнядзьвінску.

**Галіне Ю.** з Асьвеі.

**Алене Дз.** з Наваградку.

**К.С., В.С., Юр'ю Б.** зь Віцебску.

**Віктару Л.** з Калінкавіцкага раёну.

**Юр'ю Б.** з Бабруйску.

**П.Б.** з Мастоў.

**Івану З., Тамары К., А.Р.** з Жодзіна.

**Надзеі Р.** зь Вялейкі.

**А.С., Міхасю Б.** з Магілёва.

**В.Г., Зьмітру П., А.С.** зь Менскага раёну.

**В.К.** з Полацку.

**Яну Г.** з Гарадзенскага раёну.

**Аляксандру Д.** з Глыбоцкага раёну.

**Руслану К., Андрэю Г.** з Наваполацку.

**Васілю К., Анатолю Л., В.Р.** з Гомелю.

**Ігару Б.** з Глыбокага.

**Легендарны гурт «N.R.M.», пазбаўлены магчымасьці канцэртаваць легальна, упершыню ў гісторыі даў канцэрт на хутары. Паўнавартасны прыватны канцэрт адбыўся на пазамінулых выходных над Заходняй Бярэзінай у Валожынскім раёне ў прысутнасьці пяцідзесяці сяброў гаспадара маёнтку.**



0402280179

**ИЗВЕЩЕНИЕ**

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521
получатель платежа
МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764
наименование банка

| Счет получателя | 3015 212 000 012 | Лицевой счет | |
|---|---|---|---|

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | |
| | | | Пеня | |
| | | | Всего | |

Кассир

Плательщик

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521
получатель платежа
МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764
наименование банка

| Счет получателя | 3015 212 000 012 | Лицевой счет | |
|---|---|---|---|

(фамилия, имя, отчество, адрес)

**КВИТАНЦИЯ**

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | |
| | | | Пеня | |
| | | | Всего | |

Кассир М.П.

Плательщик

## Са сталецьцем!

«Наша Ніва», у гэтым вершы
Павіншую. Пэўна, першы
Са сталецьцем — важнай датай
Для газэткі найвыдатнай.

Шматпакутная, цяпер
Беларусам ты — павер —
Найпатрэбнейша за ўсё,
Нават, мабыць, за жыцьцё.

Сто гадоў — як дзень адзін,
Прамінула, і, глядзі,
Павярталіся парадкі —
Лу ня любіць праўды-маткі.

Годзе сумнае казаць!

Дай-жа мне павіншаваць
І адзначыць, як патрэбна,
Бо і тэрмін, бач, нязрэбны.

Зычу доўгага жыцьця,
Не трапляй да небыцьця,
Заставайся нашай вольнай,
І праўдзівай, і свабоднай,

І заўжды такою ж ветлай,
Нашай чыстай, нашай сьветлай,
І, канечне, (тут — ня дзіва)
Заставайся «Нашай Нівай»!

**З павагай,**
**Руслан Юсупаў,**
**малады літаратар і**
**проста вольны**
**чалавек**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас:**
**а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@promedia.by.**
**Факс: (017) 284-73-29.**

## МЫ САМІ

### Каб штотыдзень атрымліваць газэту, дасылайце адрасы і прыватныя ахвяраваньні

Каб гарантавана чытаць «Нашу Ніву» цяпер, калі «Саюздрукам» і «Белпошце» забаронена распаўсюджваць газэту:

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць па тэлефоне, факсам, праз пошту ці электронную пошту.** Тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84 e-mail: dastauka@tut.by паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) Просім кожную сям'ю чытачоў **пералічваць на рахунак** газэты ахвяраваньне з разьліку 6 000 рублёў на месяц. Гэтага будзе досыць для выхаду і дастаўкі газэты. **У бланку банкаўскага паведамленьня ці паштовага пераказу, калі ласка, дакладна і разборліва пазначайце ваш адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.** Тыя, хто перакажа 18 000 рублёў за раз, забясьпечаць выхад газэты на тры месяцы. Хто ж мае магчымасьць пераказаць 36 000 рублёў адразу, забясьпечаць публікацыю «НН» адразу на паўгоду.




**Пад мастамі Менску ідзе нябачнае аўтамабілістам жыцьцё. Менскія майстры танцу з агнём зьбіраюцца ля Сьвіслачы, каб практыкавацца пад грукат тамтамаў. Аднойчы іх засьпеў фатограф «НН». Мала якая альтэрнатыўная імпрэза на сьвежым паветры абыходзіцца сёньня без фаер-шоў.**

Апавяданьне пра тое, як яны нас змушалі глядзець «Чэсную размову», канцэрты і хакей і чым гэта для іх скончылася.

# Азіятка і кампанія

## АЛЯКСАНДАР АПОН

Я сядзеў у пакоі, які мы з жонкай называем заляй, у фатэлі і чытаў кнігу, калі невядома адкуль на століку, на якім у нас стаяў тэлевізар, зьявіўся маленькі, памерам з далонь, чалавек і сіплым голасам штосілы закрычаў:

— Ты чаму не глядзіш тэлевізар?

Я вылупіў вочы, кніга паляцела з рук і пляснулася на падлогу. «На табе ёсьць, здурнеў!» — падумаў пра сябе я, але не ўстрымаўся і запытаў:

— Ты хто?

— Я? Хто, хто, вядома хто, — закрычаў ён. — Азіятка-малодшы, вось хто! Уключай тэлевізар!

Ніякіх Азіяткаў, старэйшых ці малодшых, я ня ведаў, хаця, па праўдзе кажучы, недзе і некалі чуў такое прозьвішча, бо хіба мала на сьвеце Азіяткаў, і таму толькі пацепаў у адказ плячыма.

— Ты чуеш, сволач, ці не? — між тым затупаў ён ножкамі, — уключай, кажу!

Я разявіў рот. «Сволаччу» звычайна мяне называла жонка.

«Скуль ён ведае?» — падумаў я і, ня вытрымаўшы, пацікавіўся:

— А навошта?

— Як навошта? — аж задрыжэў Азіятка-малодшы, — каб паслухаць пра наша шчасьлівае жыцьцё!

— А чаму пра шчасьлівае жыцьцё трэба слухаць? — разгубіўся я. — Пра яго трэба ня слухаць, а проста мець.

— Дурань, дурань, — замахаў рукамі Азіятка-малодшы, — быў дурнем і дурнем застанесься! Гэта я буду вырашаць, што слухаць, а што мець! Я! Дык уключыш ці не?

— Не.

— Ах так, ну глядзі!

Ён ухапіўся за шнур ад відэамагнітафона, які матляўся сам па сабе, і, як цыркач па ліне, спусьціўся на падлогу, адкуль, пагразіўшы мне кулаком: «Я табе!» — кінуўся да канапы. На канапе ляжаў пульт ад тэлевізара, і пакуль да мяне дайшло, што яму патрэбна, ён ужо быў каля яго. «Вось зараз я!» — выцягнуў ён у другі раз кулак і ўскочыў на кнопку. Тут жа загарэўся экран.

— Празь пяць гадоў ня меней як па пяцьсот даляраў... — сказаў чалавек у тэлевізары і, зрабіўшы тэатральную паўзу, дадаў: — кожнаму!

Я яго адразу пазнаў, гэта быў Азіятка-старэйшы.

— Ах ты так, так, падла, ну глядзі, глядзі, пашкадуеш! — залямантаваў ён, пасьля таго, як, пстрыкнуўшы пальцам, я зьбіў яго з пульта.

— Вой, не забалела? — занепакоіўся я.

— Нічога, пасьмяесься, пачакай, — заскрыгатаў ён ад злосьці зубамі, затым скаціўся і зьнік пад канапай.

Я падняў з падлогі кнігу і паклаў яе на месца ў шафу.

Азіятка-старэйшы тым часам да таго разышоўся, што наабяцаў, не параіўшыся зь сім-тым, падумаць, і, калі будзем добра сябе паводзіць і слухацца, не па пяцьсот даляраў, а чорт яго ведае — мо і па пяцьсот пяцьдзясят. Але добра сябе паводзіць і слухацца нават і за невядома што я не хацеў. Вось чаму, выключыўшы тэлевізар, пайшоў спачатку ў кухню, дзе наліў сабе з прыхаванай бутэлькі чарку каньяку. Калі стукнула па галаве, зь якой адразу вылецелі Азіяткі, я завярнуў у спальню, лёг на ложак, заплюшчыў вочы і заснуў.

Разбудзілі мяне галасы з залі, адзін зь якіх — яго цяжка было зблытаць зь іншымі — належаў Азіятку-старэйшаму, а другі — невядомай жанчыне.

— Яшчэ было цёмна, калі з варот мэханізаванага двара выйшлі пяць трактароў, якія, стоячы на ганку канторы, строгім, але справядлівым позіркам правёў у дарогу спэцыяліст па ідэалягічнай працы Кандрат Яўхімавіч Сілівончык, — шчыра захапляючыся, апавядаў Азіятка-старэйшы. Незнаёмая жанчына зьнянацку, без усялякай сувязі, перабівала яго:

— Гэта ня проста кладзеж ведаў, частка інтэлектуальнага скарбу чалавецтва, а таксама і культурна-аздараўленчы комплекс. Тут, за дзьвярыма, сярод штабялёў кніг і падшывак «Советской Белоруссии», налева, да прыкладу, казіно, направа — лазьня з масажысткамі, а недзе над галавою, пад дахам, так высока, што замірае дух і займае дыханьне, — трамплін.

— Назаўтра, нягледзячы на залеву, выехалі сем трактароў, і Сілівончык, памахаўшы ім насоўкай з вакна канторы, сказаў: «Яны справяцца!» — і так, справіліся, ёсьць сто сорак гектараў! — не здаваўся Азіятка-старэйшы. Але зноў нахабна лезла жанчына:

— І вось ужо равуць бульдозэры, цераз навалы, па кабіну ў гразі паўзуць самазвалы, недзе грукаюць малаткі і вішчыць піла — гэта пачалося будаўніцтва яшчэ аднаго найунікальнейшага помніка нашай эпохі, а менавіта — мастацка-спартовай галерэі сьпіралепадобнай формы, у якой, паводле задумы праектоўшчыкаў, наведнікі, стаўшы на ролікавыя лыжы...

«Гэта Азіятка-малодшы», — падумаў я і, сунуўшы ногі ў тапкі, ціхенька выйшаў у калідор. Дзьверы ў залю былі расчыненыя. Азіятка-старэйшы, зноў перахапіўшы ініцыятыву, надрываўся на палях, сеючы зь Сілівончыкам яравыя, а малодшы валтузіў на канапе каля пульта такую ж маленькую, як і сам, жанчыну.

— Не чапай, кажу, не чапай! — заламваў ён ёй руку, седзячы ў яе на сьпіне.

— Адпусьці, баліць, — хрыпела яна, дрыгаючы маленькімі нагамі.

— А будзеш лезьці, будзеш? — дапытваў ён, націскаючы мацней.

— Мярзотнік, паскуда, пусьці! — задыхаючыся, не здавалася яна, і не дарма, бо нечакана, падцягнуўшы пад сябе ногі, неяк вывернулася і, ня доўга думаючы, цапнула зубамі Азіятку-малодшага.

— У-у, курва! — завыў ён і, ускочыўшы на ногі, ухапіўся за пакусаны бок.

— Во табе яшчэ! — засіпела яна і ўлупіла яму кулаком у вуха.

Азіятка-малодшы кінуў бок і ўхапіўся за вуха, а яна, глынуўшы паветра, скочыла на пульт. Так і не пасьпеўшы адсеяцца, Азіятка-старэйшы зьнік, а яго месца заняла вельмі прыгожая, векам каля трыццаткі, вядучая.

— Вы глядзелі «Яго навіны», — сказала яна. — Сёньня, як і заўсёды, з вамі была...

Я аслупянеў і, хто быў сёньня, як і заўсёды, з намі, не пачуў: маленькая кабета на пульце была вылітая прыгажуня з тэлевізара.

— Паглядзі, вось ён! — кінуўшы сваё вуха і тыцкаючы ў мяне пальцам, сказаў Азіятка-малодшы.

— Фі, які брыдкі, нягалены, — скры-

вілася яна.

— П'яніца, — сказаў ён.

— Ага, сіняк, адразу відаць, — хітнула яна.

— Ня хача слухаць пра наша шчасьліваe жыцьцё, — намовіў ён.

— Што ты кажаш! — пляснула яна рукамі. — Во гад!

— Хутчэй, вораг народу, зьбіў мяне, — паскардзіўся ён.

— Ад такога можна чакаць чаго заўгодна! — згадзілася яна.

І тут яны мелі рацыю, бо, прыкінуўшы на вока, траплю ці не, я ўхапіў з нагі тапаць і шпульнуў ім, цаляючы ў пульт.

— Бандыт! — закрычаў Азіятка-малодшы і кінуўся пад канапу.

— Ратуйце! АМОН! — загаласіла яна і сiганула ўсьлед.

— Я вам дам АМОН, — раззлаваўся я і як быў, бяз тапця, пабег на балькон за ліхтаром і венікам.

Праз паўхвіліны, ня больш, пляснуўшыся на жывот, я засьвяціў пад канапу, але ні Азіяткі-малодшага, ні яго малюпасенькай сяброўкі там ужо не было.

Потым, здаецца, я нешта пісаў, седзячы за сталом у кухні, прыхапіўшы з сабой пульт ад тэлевізара. Здаецца. Бо, калі затэлефанавала жонка, каб запытаць, што робіць Уладзік, азірнуўшыся, адказаў, што ня ведаю.

— Ты што, у гарачцы? — пачуў я ў слухаўцы, — паглядзі на гадзіньнік!

Я паглядзеў, было шэсьць гадзінаў. Давялося ляцець у дзіцячы садок і потым вяртацца з малым на руках, бо, як і на палях, ішоў дождж. Але больш тым вечарам ні Азіяткаў, ні прыгажунь з тэлевізара я ня бачыў, і толькі калі жонка ўклала Ўладзіка спаць, пачуў ад яе такія словы:

— Ты ведаеш, ну і выдумшчык у нас расьце!

— А што?

— Кажа, бачыў нейкіх маленькіх чалавечкаў.

— Дзе?

— У залі, калі гуляў са сваімі машынкамі.

— Ня можа быць!

— Чаму, хіба ня твой сын?

«Мой, — падумаў я, — але дзе яму такое выдумаць!»

Мы пасядзелі яшчэ ўдвух і пайшлі спаць.

Разбудзіла мяне жонка. Быў шэры ранак, субота.

— Прачніся, чуеш, прачніся, — трасла яна мяне за плячо.

Я разьляпіў павекі.

— Што?

— Ідзі паглядзі!

Адразу заныла сэрца.

«Азіятка, — падумаў я, — нешта вычаўпіў!»


PHOTO.BYMEDIA.NET

І вядома, гэта быў ён, бо проста вывернуць з шафы на падлогу кнігі было мала, тут жа ў кучы валяліся таксама выдраныя і пакамечаныя з кніг старонкі.

— Я ведаю, — сказаў я жонцы, — хто гэта зрабіў, але ты не паверыш.

— Чаму? — спытала яна.

— Бо гэта неверагодна.

— А ты паспрабуй.

— Добра, — згадзіўся я. — Памятаеш, учора Ўладзік казаў, што бачыў маленькіх чалавечкаў?

— Ну?! — насьцярожылася яна.

— Гэта яны, — сказаў я.

— Ты што, мяне за дурніцу маеш? — пырснула яна сьлязьмі й выйшла.

Я ўздыхнуў і, стаўшы на калені, пачаў зьбіраць кнігі, укладваючы па магчымасьці выдраныя старонкі на месца.

— А я ж цябе папярэджваў, папярэджваў, жывёла ты гэтакая, ці не? — нечакана пачуў я за сьпінаю ўжо добра знаёмы сіплы голас.

Я адвярнуўся. Азіятка-малодшы, маленькая прыгажуня і яшчэ адзін, увесь нейкі белы, ад валасоў на галаве да вусікаў пад носам, стаялі на століку каля тэлевізара.

— Чаго маўчыш? — нецярпліва тупнуў ножкай Азіятка-малодшы.

— Глядзеце, зараз заплача, — ухмыльнулася маленькая прыгажуня.

— Што, і «Чэсную размову» не глядзіць? — вельмі зьдзіўлена, нібыта ня верачы, што гэта магчыма, спытаў бялявы тып.

**Працяг на старонцы 30.**

# Азіятка і кампанія

**Працяг са старонкі 29.**

— Не, не глядзіць, — пагардліва адказаў Казіятка-малодшы і патлумачыў: — Яму няма калі, ён кніжкі чытае. — А потым як гаркнуў: — Дзе схаваў пульт, пульт, кажу, нясі, паразыт!

Я кіўнуў, маўляў, ужо лячу, і ўскочыў з каленяў. У гэты момант яны і зьніклі, і ні за тэлевізарам, які я пераставіў на падлогу, ні за столікам, які адцягнуў ад сьцяны, — нідзе іх не было.

Я нічога не разумеў, але што яны яшчэ сябе пакажуць, ведаў напэўна.

Пасьля абеду мы пайшлі да сяброў на Дзень народзінаў і не забавіліся позна толькі таму, што, нагуляўшыся, занатурыўся Ўладзік. Ужо калі падымаліся ў ліфце, я ўзяў яго на рукі. Жонка адчыніла дзьверы, мы пераступілі парог і абамлелі. У залі працаваў тэлевізар.

— Я ж яго, як адыходзілі, выключала! — шэптам сказала яна.

— А я аднёс пульт у спальню, — пацьвердзіў я.

— Мама прыехала? — зрабіла здагадку яна.

— Не, — запярэчыў я, — яна б папярэдзіла.

— Ну ня злодзей жа гэта глядзіць тэлевізар? — зьбянтэжана спыталася яна.

— Не, — адказаў я, — горай, гэта Азіятка-малодшы.

— Які Азіятка-малодшы?

— Зараз убачыш, — я апусьціў Уладзіка на падлогу. — Хадзем.

Яны сядзелі на канапе кружком і грызьлі, цягаючы з надарванага пачка, чыпсы, каля канапы валяўся пульт.

**Бяры, бяры, бяры,**
**Усё тваё, тваё**
**Тваё, тваё, тваё,**
**Усё, усё, усё...**

— пішчэла ў тэлевізары размаляваная, напаўголая дзявуля, падкідаючы ўгару ногі, напэўна, каб лепш было бачна, дзе і за што брацЬ у першую чаргу.

— А, во, прыпёрліся, — сурова сказаў Азіятка-малодшы, заўважыўшы нас у дзьвярох. — Швэндаюцца невядома дзе, замест каб тэлевізар глядзець.

— Ага, такі канцэрт прапусьцілі, — зашкадавала маленькая прыгажуня.

— За бацьку! За бацьку! — дзіка завыў ужо немаладога веку сівы, барадаты мужчына і, ня маючы моцы ўстрымацца, пайшоў па канапе ўпрысядку.

Жонка зьбялела, Уладзік ступіў крок назад.

**Толькі ён, ён, ён,**
**У сэрцы маём!**

— ускочыла за барадатым тая самая, што і ў тэлевізары, толькі маленькая дзявуля.

— Я зараз упаду, — ціха паведаміла жонка.

Уладзік высалапіў язык.

— Але яшчэ будзе «Чэсная размова», — уступіў у гаворку бялявы тып і, зрабіўшы хмуры твар, строга дадаў: — «Чэсную размову» глядзець мне абавязкова, бо...

— Не, спачатку хай дагледзяць канцэрт, — перабіла яго яшчэ адна сьпявачка, таксама, як і першая, размаляваная і без адзеньня, і, улупіўшы нешта, чаго разабраць не было аніякай рады, акрамя слоў: «...рабі...твая... я... як я...» — вылецела з кружка.

## Клюшка і лыжы — браты навек!

«Зараз будзе падкідаць ногі», — падумаў я, але памыліўся, бо, выкрыкнуўшы ў апошні раз «як я!», адвярнулася і затрэсла голым задам.

— О, Божа, — застагнала жонка.

Уладзік хіхікнуў і засунуў палец у нос.

— Стаяць! — раптам раздалося недзе каля ног.

Жонка ўхапілася за вушак. Уладзік дастаў з носу палец і схаваў руку за сьпіну. Я паглядзеў долу. Маленькі, тоўсты, як калабок, чалавек, упіраючыся абедзьвюма рукамі, перакуліў цераз парожак бутэльку да канапы, абярнуўся, выцер з лобу рукавом пот і сказаў:

— Яшчэ наперадзе хакей. Ты будзеш глядзець хакей, га? Цябе пытаюся. Адказваць мне, адказваць, кажу, морда!

Я паглядзеў на жонку, якая сядзела на падлозе, на Ўладзіка, у вочках якога сталі сьлёзы, і, кінуўшыся, схапіў тэлевізар.

— Што робіш, што робіш, гад?! — пазьверску зароў Азіятка-малодшы.

— Трымай яго, трымай! — заекатала маленькая прыгажуня.

— Стаяць! — зароў таўстун.

Але было позна. З калідору, піхнуўшы нагою незачыненыя дзьверы, я павярнуў у сьмецьцеправод і, кінуўшы, ня ведаю, недзе ў кут тэлевізар, пабег назад.

Першым мы злавілі бялявага, які хаваўся пад канапай. Я падцягнуў яго венікам да сябе і схапіў за нагу.

— Вы ня маеце права, гэта самавольства, я буду скардзіцца ў ААН, будзеце адказваць, — матляючыся ў мяне паміж пальцамі, успомніў ён раптам аб правох, хоць і маленькага, але чалавека. Жонка стаяла побач з парожнім слоікам з-пад кампоту ў руках. Я кінуў у слоік бялявага і павярнуў накрыўку з загадзя зробленымі для паветра дзірачкамі. Затым у куце мы ўгледзелі абедзьвюх дзявуль: яны цісьнуліся адна да другой, плакалі, бажыліся, што вось-вось пойдуць замуж за бізнэсоўцаў і больш ня будуць.

Барадатага певуна давялося высмактваць з-пад кніжнай шафы пыласосам.

— Пакутую за бацьку! — заявіў ён, але, апынуўшыся на дне слоіка, адразу пачаў ціскаць дзявуль.

Маленькую прыгажуню заўважыў Уладзік, калі яна бегла калідорам да вешалкі, каб схавацца ў адзеньні. Яна, у адрозьненьне ад дзявуль, не скуголіла, а наадварот, так напрасткі, не саромеючыся, паведаміла, што яе муж і тры ці чатыры (яна ўжо ня памятала дакладна) каханкі — бандыты і са мною пагаворацЬ зблізку.

Таўстуна ж, вядома, знайшлі на кухні, у лядоўні, але як ён туды залез — і да гэтай пары невядома. Калоцячыся ад страху, ён еў сасіску, а калі я паманіў пальцам, раптам ні з пушчы ні з поля закрычэў:

— Клюшка і лыжы — браты навек!

— Добра, хай сабе, ідзі, — папрасіў я.

Ён неяк сумна паглядзеў на мяне, уздыхнуў і, ускінуўшы, як бервяно, на плечы недаедзеную сасіску, ступіў насустрач лёсу.

І толькі Азіятка-малодшы прапаў як у ваду ўпаў. Але ноччу, калі, стаміўшыся шукаць, мы паляглі спаць, выявіўся і ён.

Уладзік спаў з намі, у спальні, на сваім ложку, бо заставацца ў адзіноце яшчэ баяўся, як раптам, праз сон, я пачуў яго крык.

— Мама, мама!

Я падхапіўся і запаліў сьвятло. Уладзік сядзеў на падушцы, падабраўшы пад сябе ногі, а Азіятка-малодшы імчаў да дзьвярэй у калідор. Тут, зьляцеўшы з ложка, я яго і схапіў і, не зьвяртаючы ўвагі на зубы, якімі ён упіўся мне ў руку, пайшоў спачатку на кухню, за слоікам, а потым у прыбіральню.

— І табе не шкада? — спытала жонка, стоячы ў мяне за сьпінай.

— Шкада, але ж трэба нарэшце нешта рабіць, — адказаў я, націскаючы на рычажок унітаза.

Рынула вада, дала фантанам, завіравала і паляцела ў сьцёкавую трубу.

— А тэлевізар? — задала пытаньне жонка.

— Абыдземся пакуль, нічога, — сказаў я і сунуў ёй у рукі пусты слоік.

# Будзь адважны



## ЗЬБІГНЕЎ ГЭРБЭРТ

ДЗЬВЕ КРОПЛІ

палалі лясы —
а гэтыя двое
сплятаалі рукі на шыях
нібы букеты ружаў

людзі ў сховішчы беглі
а ён казаў што ў жонкі валасы
у якіх можна схавацца

накрыўшыся адным пледам
яны шапталі бессаромныя словы
малітву закаханых

а калі было вельмі кепска
з галавой зануралiся ў вочы насупраць
і замыкалі іх моцна

так моцна што не адчулі агню
які даходзіў да веек

да канца былі мужныя
да канца былі верныя
да канца былі падобныя
як дзьве кроплі
на краі твару

**Зьбігнеў Гэрбэрт (1924—1998)**, паэт і эсэіст, аўтар драматычных твораў, пісьменьнік зь вялікім даробкам, выключным мастацкім і маральным аўтарытэтам і біяграфіяй, трагічна ўплеценай у гісторыю XX ст.

ПАСЛАНЬНЕ ПАНА КОГІТА

ідзі куды пашлі тыя да цёмнага краю
па залатое руно нябыту тваю апошнюю ўзнагароду

выпрастаны ідзі сярод тых на каленях
тых павернутых сьпінамі і павергнутых ніцма

ты ўратаваўся не для таго каб жыць
у цябе мала часу а трэба сьведчыць

будзь адважны калі здраджвае розум будзь адважны
па апошнім рахунку толькі гэтае лічыцца

а бясьсільны твой Гнеў хай будзе як мора
кожнага разу як будзеш чуць голас зьняважаных бітых

хай не пакіне цябе сястра твая Пагарда
да баязьліўцаў шпегаў і катаў — яны перамогуць
і на тваім пахаваньні з палёгкаю кінуць жменьку зямлі
а караед напіша палепшаны твой жыцьцяпіс

і не выбачай сапраўды не ў тваёй гэта ўладзе
выбачаць ад імені тых каму здрадзілі на сьвітанку

але сьцеражыся марнае пыхі
глядзі ў люстэрка на свой блазанскі твар
паўтарай: я быў паклікаыны — а ці ж не было лепшых?

сьцеражыся чэрствасьці сэрца любі ранішнюю крыніцу
птаха зь невядомым іменем дуб зімовы
сьвятло на муры раскошу неба
ім непатрэбны твой цёплы подых
яны для таго каб сказаць: ніхто цябе не суцешыць

чуйнуй — калі сьвятло на гарах дае знак — устань і йдзі
покуль кроў кружыць у грудзёх тваю цёмную зорку
паўтарай чалавецтва старыя заклёны байкі й легенды
бо так здабудзеш дабро якога ты не здабудзеш
паўтарай вялікія словы паўтарай іх упарта
як тыя што йшлі ў пустэльні і гінулі ў пяску

а ўзнагародзяць цябе тым што ёсьць пад рукамі
пугаю сьмеху забойствам на сьметніцы

ідзі бо толькі так ты будзеш прыняты ў таварыства халодных
чарапоў у гурт тваіх продкаў: Ралянда Гэктара Гільгамэша
абаронцаў краіны бязь межаў і гораду попелу

Будзь верны Ідзі

**Пераклаў з польскай**
**Андрэй Хадановіч**

# Натальля Гарбанеўская: «Я не дзялюся на дысыдэнтку й паэтку»

Зь легендарнай расейскай пісьменьніцай гутарыць Ігар Бабкоў.



Калі паэтка Натальля Гарбанеўская з аднадумцамі выйшла ў 1968 годзе на Красную плошчу ў Маскве, пратэстуючы супраць уварваньня савецкіх войскаў у Чэхаславаччыну, ёй было 32 гады. Пасьля гэтага былі 3 гады за кратамі (1969—1972), з 1975-га яна выехала на Захад, дзе й асела.

На радзіму яна доўгі час не магла вярнуцца нават пасьля падзеньня саветаў: у ейных уцякацкіх дакумэнтах было пазначана «акрамя СССР». У Расею, якая абвясьціла сябе правапераемніцай Савецкага Саюзу, францускія памежнікі Гарбанеўскую не выпускалі. Толькі цяпер, атрымаўшы польскае грамадзянства (і па-ранейшаму жывучы ў Парыжы), паэтка можа спакойна падарожнічаць на радзіму.

У Францыі спн.Натальля ня толькі ўдзельнічала ў стварэньні слыннага часопісу «Континент», але і супрацоўнічала з нашым земляком Ежы Гедройцам у ягонай «Kultury». Гедройцаў юбілей і прывёў яе ў Менск.

Застаючыся расейскай паэткай, Гарбанеўская ведае і польскую літаратуру (перакладае польскіх паэтаў), і францускую. Зь літаратуры й пачалася нашая гаворка на ўтульным бальконе Дому літаратара.

**Ігар Бабкоў: Якой Вы бачыце сучасную расейскую літаратуру?**

**Натальля Гарбанеўская:** Я яе чытаю пераважна ў часопісах праз «Часопісную залю» ў Інтэрнэце. Нейкія кнігі мне дасылаюць, нешта я чытаю. Увогуле, я б сказала так: сучасную прозу я ведаю сярэдне, сучасную паэзію — лепей... Паэтаў добрых вельмі многа. Я б сказала — больш, як трэба. Хоць, насамрэч, гэта няпраўда: кожны паэт камусьці патрэбны.

«Першага паэта», якім быў Бродзкі, няма. І, відаць, цяпер не патрэбны такі. Але, прынамсі для мяне, шмат паэтаў самай высокай клясы — і старэйшых, і маладзейшых (кшталту Кынжэева і Гандлеўскага). І яшчэ маладзейшых, кшталту Кібірава. І вельмі багата бачу вершаў маладых паэтаў. Магчыма, адразу ўсё не ўзгадаю: нядаўна бачыла добрыя вершы нейкай дзяўчыны, яшчэ зусім маладой. Прычым яна выявілася дачкой паэта, якога ўвогуле ніхто ня ведаў і ад якога яна многаму навучылася.

Шмат добрых паэтаў. Калі браць старэйшых, то цудоўныя вершы піша Іна Лісьнянская. Шмат добрых паэтак. І ўсе розныя! Вельмі шмат цікавага. Я лічу, што расейская паэзія сёньня ў вельмі добрым стане. Вядома, тое, што ў мінулым годзе заснавалі прэмію «Паэт» і не знайшлі на яе лепшага ляўрэата, чым Кушнер, — гэта ганьбішча. На мой погляд, Кушнер — гэта проста нішто. Пры тым, што ёсьць Лосеў, Кынжэеў... Але іх нават ня вылучылі. Вылучылі Кушнера, Кубланоўскага і Чухонцава. Ужо лепей далі б прэмію Чухонцаву!

**ІБ: А да Седаковай як Вы ставіцеся?**

**НГ:** Гэта зусім не майго раману! Мяне яе вершы нудзяць. Але я ведаю, што ў яе шмат прыхільнікаў, якім, імаверна, яе вершы нешта кажуць. Таксама, як я бачу, напрыклад, што вельмі таленавітая Вера Паўлава, але мяне ад яе вершаў з душы верне... Седакова як паэтка мяне нудзіць. А пабачыла я яе летась — сама яна мне хутчэй спадабалася.

**ІБ: А з польскай паэзіі?**

**НГ:** Я ведаю пераважна тое, што мне дасылаюць перакладаць. Я была, праўда, нядаўна на фэстывалі ва Ўроцлаве, дзе, дарэчы, былі і беларускія паэты. Там быў Гэмбіцкі — вельмі цікавы паэт. Ёсьць паэтка, якую вельмі хваляць. Але я паглядзела — зноў не майго раману: Крысьціна Міладэнская. З старэйшых яшчэ жыве Юлія Хартвіг.

**ІБ: А паміж Мілашам і Гэрбэртам каго б Вы выбралі?**

**НГ:** Я рэдкі чалавек, які не выбірае. Для мяне кожны існуе па-свойму — і Мілаш, і Гэрбэрт. Па-чалавечаму, па жорсткасьці — вядома, Гэрбэрт. А па вершах — і той, і другі. Мілаш у сваіх эсэ мяне вельмі многім захапляе, многім раздражняе. Гэрбэрт — чалавек, створаны з аднаго каменя... Большыня палякаў выбіраюць паміж імі. Я думаю, што не выбіраю, бо гэта мне ня родная паэзія. Гэта як па-расейску нельга любіць Ахматаву і Цьвятаеву. Нельга любіць Дастаеўскага і Талстоя. Я як пайшла ў Дастаеўскага... Я часам бяру Талстоя: усё ж такі Леў Талстой! Пачынаю чытаць — не па кані корм... Таксама, думаю, і палякі рэзка дзеляцца паміж Мілашам і Гэрбэртам.

**ІБ: А як бы Вы ацанілі сучасную францускую літаратуру?**

**НГ:** Гэта такая пустэча! Рэч у тым, што француская мова ўжо вельмі амярцьвелая. Калі яе спрабуюць ажывіць, яе расхістваюць да стану зусім хуліганскага хаосу — неразумнага, ня хлебнікаўскага, не! Гэта вельмі жорсткая мова, для вершаў яна наагул непрыдатная. Што да прозы, там ёсьць нейкія паўмаргінальныя зьявы, як быў Рэмон Кено: «Зазі ў мэтро» — цудоўная рэч. Як сёньня Даніель Пэнак: ён піша

сьмешныя дэтэктывы і робіць там дзіўныя рэчы з мовай.

Людзі, якія сапраўды ловяць мову вуліцы, — яны сымулююць. А французы — народ вельмі красамоўны. Я на гэтым лавілася. Напрыклад, мой сябар Андрэ Глюксман робіць якую-небудзь выдатную заяву — па «Салідарнасьці» тады альбо па Чачэніі цяпер. Я пачынаю перакладаць — і бачу, што ўсё гэта пустэча, аратарскія прыёмы, гэта ўсё можна сказаць у двух словах. Сказаць значна больш чалавечна... Пры тым, што мы зь ім аднадумцы, вельмі добра ставімся адзін да аднаго, і ён сапраўды вельмі шмат зрабіў. І, можа быць, французы разумеюць толькі такі тэкст. Але гэта жахліва, што яны разумеюць толькі такі тэкст! Бо я лічу, што гаварыць трэба па-чалавечы.

Француская культура мяне вельмі засмучае. Выяўленчае мастацтва, магчыма, калі-небудзь зноў зьявіцца, але цяпер яно зусім вырадзілася. Памёр чалавек, якога я абвясьціла сваім асабістым ворагам, — скульптар Сэзар, які панастаўляў паўсюдна ў Парыжы жудасных скульптураў: кентаўр, яшчэ штосьці... Адзіны прыстойны ягоны помнік — Восіпу Цадкіну ў Люксэмбурскім садзе: там стаіць скрыпач, а ўнутры ў яго скрыпка. Гэта адзіны ягоны помнік, а так — выверт, выверт, выверт!

**ІБ: Кундэра неяк іранічна выказаўся наконт дыялёгу францускай і расейскай культураў. Да Кундэры Вы як ставіцеся?**

**НГ:** Кундэра таксама мой асабісты вораг. Хаця мы зь ім незнаёмыя. Кундэры яшчэ да знакамітага ягонага эсэ, на якое запярэчыў Бродзкі, у 1978 годзе, да 10-годзьдзя ўварваньня ў Чэхаславакію, даюць вось такое месца (шырока паказвае рукамі. — **АВ**) на другой старонцы *Le Monde*. І ён там піша: у нас была чэская культура, а 10 гадоў таму савецкія танкі прывезьлі нам расейскую культуру. Сумнеўны тэзіс, што савецкія танкі прывезьлі расейскую культуру. Сумнеўны тэзіс, што чэская культура да таго моманту ўвесь час квітнела. У 60-я гады, калі Мілан Кундэра быў маладым паэтам (яшчэ не празаікам), камуністам, друкаваўся, Вацлава Гаўла не прымалі ў інстытут, бо ён быў сынам «буржуя». Каталіцкія паэты сядзелі на ўранавых рудніках, Ян Заградьнічак, найбуйнейшы чэскі каталіцкі паэт, толькі ў 1961 годзе выйшаў (у іх вельмі позна пачалі выпускаць) з уранавых руднікоў і праз пару месяцаў памёр. Таму наконт таго, што чэская культура квітнела, таксама можна паспрачацца. Але калі Кундэра кажа, што чэская культура квітнела, дык каму ж верыць? Вядома, Кундэры, а ня нейкай рэакцыянэрцы Гарбанеўскай!

**ІБ: А ці ведалі Вы Данілу Кіша?**

**НГ:** Ведала! З Данілам Кішам мы сустрэліся, калі неяк аднаго разу дысыдэнтаў паклікалі на прыём да Мітэрана. Я туды пайшла, бо хацела падысьці да Даніелы Мітэран (жонка тагачаснага прэзыдэнта Францыі Франсуа Мітэрана. — **АВ**) і сказаць ёй, каб яна заступілася за Ратушынскую, якая тады сядзела ў лягеры. І тут я сустрэла Данілу Кіша, мы зь ім ужо былі знаёмыя. Ён мне кажа: «Мы тут проста белыя вароны». Нас паклікалі толькі дзеля таго, каб мы ім склалі алібі... Я яго толькі крыху ведала, але ён быў дзівосны, нейкі такі — як пабачыш, так адразу раскрываесься і сэрца радуецца! Вельмі добры быў чалавек.

> Сучасная француская культура мяне засмучае.

**ІБ: А ці ведаеце Вы беларускую літаратуру? Не ў перакладах, а ў натуральным выглядзе.**

**НГ:** Практычна не. Па-ўкраінску, памятаю, я яшчэ ў дзяцінстве чытала Шаўчэнку. Потым ужо, у Парыжы, у мяне былі кніжкі розных украінскіх паэтаў, і я перакладала — і Стуса, і Сіманенку, і Калынца... А вось беларускіх — не. А ў мяне заўжды было нейкае такое шчымлівае пачуцьце да Беларусі. Я заўжды лічыла, што гэта самая жабрацкая рэспубліка ва ўсёй гэтай краіне. А потым выявілася, што — не! Калі наступіла ўся гэтая перабудова і галоснасьць і стала можна друкаваць матэрыялы, якія раней нельга было друкаваць, у нейкім навуковым зборніку я прачытала матэрыялы дыялекталягічнай экспэдыцыі канца 70-х гадоў (іх не дазвалялі друкаваць). Экспэдыцыя была ў Вялікалуцкі раён. І яны запісвалі проста прыклады таго, што людзі кажуць. Шмат такога людзі казалі, за што і не далі надрукаваць. У прыватнасьці, людзі казалі: «А па прадукты мы тут ходзім за мяжу ў Беларусь». І тут я зразумела, што — яшчэ больш жабрацкія: яны ж хадзілі не ў сталіцу, ня ў Менск, а ў нейкую суседнюю вобласьць...

**Адам Воршыч: Ці ўспрымаюць Вас дагэтуль дысыдэнткай у Расеі?**

**НГ:** Успрымаюць! Але ўсё-ткі — ня толькі так. Летась я прыехала ў Расею, восем з паловай гадоў не была, бо ў мяне былі ўцякацкія дакумэнты, і французы мяне не пускалі. А летась я атрымала польскі пашпарт і амаль адразу, як змагла, — паехала. Я была на Міжнародным фэстывалі паэзіі, які бывае раз на два гады, выступала на адкрыцьці й на прэзэнтацыі анталёгіі паэтаў дыяспары. Потым я заходзіла на іншыя выступы й бачыла, што паўсюль было надзіва багата народу. Я думала: усе скардзяцца, што вершы нікому не патрэбныя. Як гэта нікому не патрэбныя, калі поўныя залі? Меншыя, большыя, але — поўныя! На вечарыне паэтаў дыяспары выступала каля сарака паэтаў, працягвалася ўсё гэта тры гадзіны — ніхто не сыходзіў. Магчыма, у кожнага паэта былі свае знаёмыя... І ў мяне было пяць сваіх уласных, асобных вечарынаў, на якіх таксама было поўна народу. Значыць, мяне ўспрымаюць ня толькі як дысыдэнтку. Я заўжды кажу: я не дзялюся...

**ІБ: На дысыдэнтку і паэтку?**

**НГ:** Так, не дзялюся. Я — Натальля Гарбанеўская! Гэта вычарпальна.

**Занатаваў Адам Воршыч**


# 250 АДКАЗАЎ



Кніга Яна Станкевіча «За родную мову й праўдзівы назоў» — сапраўдная энцыкляпэдыя беларускага нацыяналізму XX стагодзьдзя.

**Станкевіч, Ян. За родную мову й праўдзівы назоў.** Выбранае. — Менск, 2006.

# Драма нацыянальнага мэнталітэту

Камэдыі Макаёнка занадта злабадзённыя. І тое, што іх ня ставяць, дыягназ сучаснаму тэатру. Піша **Аляксандар Фядута.**

Сёньня, калі «купалаўцы» ўжо пачалі забывацца беларускую артаэпію, а рэжысэры адмаўляюцца ад рэалізму на карысьць мала каму зразумелага абсурду, Андрэя Макаёнка перасталі ставіць. Ён падаўся занадта камунна-аптымістычным, што трактуецца як ледзьве не ідэалягічнае злачынства.

Насамрэч камэдыі — дый ці камэдыі? — Макаёнка сучасныя настолькі ж, наколькі сучасны мэнталітэт беларусаў.

Толькі вельмі прастадушны чалавек можа паверыць, што дзея «Зацюканага апостала», напрыклад, адбываецца на шчасьліва загнілым Захадзе. Ды які там Захад? Чыста сучасная Беларусь.

Вось крычыць Тата — клясычны ідэалягічны работнік: «Хлусьня мяне корміць! Мая хлусьня і цябе корміць, усіх вас корміць! А стаў бы я гаварыць праўду? Мяне вышпурнуць вон! Маёй фірме ня трэба праўда. <...> Голад навучыць і цябе лгаць. Шчыра і тэмпэрамэнтна будзеш хлусіць, калі жраць захочаш».

Тату можна зразумець: пабунтавалася маладое пакаленьне. Жыць паводля хлусьні яму перахацелася. Сын нават дзеля жратвы ня хоча хлусіць. І крычыць: «Не паддамся-а-а! Лепей на касьцёр! А поўзаць ня бу-у-ду!»

У такім стане Сын вывальваецца з акна на плошчу. Далей у Макаёнка ўсё сканчаецца сумна — Сын, ляснуўшыся галавою аб брук, губляе былы рэвалюцыйны энтузіязм і становіцца «нармальным» — то бок гатовым пагадзіцца на сваю адмераную бацькам пайку.

Сястрычка — усё ж такі да аднаго пакаленьня належаць — здагадваецца: «Ды ён жа ідыётам стаў!.. А ён так хацеў стаць прэзыдэнтам... ці прэм'ерміністрам. І стаў бы. А цяпер...»

Але Дзед — мудры, пагатоў як Дзямянцей, — ставіць кропку ва ўсёй гэтай дыскусіі: «Во цяпер-то ён напэўна стане. Толькі такія і становяцца...»

Гэта — 1969 год. Касыгінская рэформа ўжо затхнулася ў лагоднай цішы камуністычных кабінэтаў. То бок прэм'ерам ён быў і застаўся, толькі вось прэм'ерская «пайка» сталася належнай выключна «ідыёту», а не рэвалюцыянэру. У прэзыдэнты «ідыётаў» — то бок асобаў, што ня ўдзельнічаюць у вызначэньні палітычнага выбару нацыі, — не бяруць, але ў прэм'еры бяруць, і яшчэ як.

Касыгін — не беларус. Ён разумны і адукаваны «савок», якому ўласьцівыя ўсе тыя самыя рысы, што і ўсім постсавецкім (ці нэасавецкім?) беларусам. А што — нашыя Чыгір ці Лінг былі чымнебудзь лепшыя? Горшыя — можа быць і так (у Касыгіна ўсё ж за плячыма быў блякадны Ленінград).

Я не сьцьвярджаю, што Андрэй Макаёнак трымаў дулю ў кішэні і меў наўвеце менавіта савецкую ўладу. Можа, ён і меў яе наўвеце, і ня толькі наўвеце меў, але ён шчыра верыў у тое, пра што пісаў.

Хаця — пра што ён пісаў? Пра што наагул пісалі беларускія клясыкі?

Возьмем самую вядомую п'есу Макаёнка — трагікамэдыю «Трыбунал». Праўдападобна, «Трыбунал» — рэкардсмэн паводле колькасьці пастановак у Савецкім Саюзе, а мо і ва ўсім сацлягеры. Гісторыя вясковага старасты, які выконваў партызанскае заданьне і заплаціў за сваю ўяўную здраду жыцьцём сына,ператварыла Андрэя Макаёнка, паводле чутак, ці ня ў самага заможнага зь беларускіх драматургаў (у Расеі яго апярэджвалі Анатоль Сафронаў, Сяргей Міхалкоў і Апанас Салынскі). Сёньня тая п'еса многім падаецца банальнай і нуднай.

Фройда няма на тых, хто пазяхае над «Трыбуналам»!

Як сьцьвярджае фальклярыст Уладзімер Лобач, «слова «церах» у беларускай мове абазначае «таўкач», «мяла», што, у сваю чаргу, фальклёрнай традыцыяй адназначна інтэрпрэтуецца як сымбалічнае замяшчэньне эрэгаванага дзетароднага органа мужчыны». Так што Цярэшка Калабок — хай і даволі дзіўнай формы (калабок!), аднак — чэлес!

Сям'я, паўсталая проці ўяўнай здрады свайго кіраўніка, саджае яго ў мех. Тут ужо і фальклярыстам ня трэба быць, каб зразумець аналёгію: «рэчы з адтулінай (мех, пярсьцёнак, абаранкі) — жаночы пачатак».

Цяпер перакладзеце на мову родных асінаў саму сытуацыю: Цярэшку саджаюць у мех... Ну?!

І не кажэце, што і гэтага ня меў наўвеце Макаёнак. Моладзевая абрадная гульня «Жаніцьба Цярэшкі», наскрозь прасякнутая шчырым эратызмам, была вядомая ў Беларусі задоўга да стварэньня «Трыбуналу».

**Цярэшка, чаху, чаху,**
**Што ў цябе ў мяху, мяху?**
**І шпілечкі, іголачкі,**
**Залаты пярсьцёначкі,**
**Елачкі ды палачкі,**
**Дзецкія забавачкі.**

І нават бяз гэтай — шчыра фрайдысцкай, то бок прыцягнутай не за вушы, а зусім за «цярэшку» — трактоўкі «Трыбунал» застаецца паказальнай ілюстрацыяй да спрэчак аб сутнасьці беларускага нацыянальнага характару. Бо ў «Трыбунале» паказана трагедыя расколу нацыі — хоць, мабыць, сам Макаёнак, таго не ўсьведамляў у той час (ці не хацеў усьведамляць). Бо поруч з «правільным» Цярэшкам паказаны і «няправільны» — таму што здраднік — таксама беларус, наш, тутэйшы. Яшчэ падчас прэзыдэнцкай кампаніі 2001 году Леанід Сініцын — сто адсоткаў начытаўшыся ці нагледзеўшыся «Трыбуналу» — сказаў: «Кожную нацыю можна ахарактарызаваць паводле таго, як яна зьбіраецца на вайну. Палова беларусаў ідзе ў партызаны, другая палова — у паліцыю, і часам яны файна ладзяць адно з адным».

Бяседа ў доме Цярэшкі, дзе п'яны Сырадоеў пачуваецца зусім ужо гаспадаром, — нібы ілюстрацыя да гэтай сініцынскай тэзы. Толькі вось выходзіць асечка: «Вунь, у зарэчанскім пасёлку Сырадоеў усю сям'ю спаліў. У іх хаваўся наш партызан, камандзір. І ніхто, апроч сваіх, ня ведаў. Значыць, са сваіх і прагаварыўся, пахваліўся. І ўся сям'я загінула».




**Беларускія тэатры баяцца сацыяльнай праблематыкі. Пануе камэдыя становішчаў.**

То бок ладзіць адно з адным не выходзіць. Таксама, як не выходзіць — нават пад страхам гібелі ўсёй сям'і — маўчаць, не пахваліцца сваім учынкам.

Гэта што тычыць вайны. А «Трыбунал» жа — ня толькі пра вайну.

Вось, седзячы ў мяху, пачынае гаворку навасьпечаны стараста Калабок:

— Вот — досталася мне ўлада. А для чаго яна мне? Чаго мне ад яе хацець? Ад пасады маёй? Ад улады ў руках маіх? Ну, што я магу мець ад яе? Есьці дасыта з чужога катла і смачнае магу? Магу! Піць на дармавінку магу? Магу! А што яшчэ? Ну… Пазьдзекавацца з каго-небудзь, хто мне не па носе… Магу? Магу! Дык няўжо людзі… некаторыя… каторыя рвуцца да ўлады, яны толькі гэтага і хочуць? А некаторыя так ірвуцца, так локцямі штурхаюцца, адзін другога грызуць, кусаюць, ліжуць, плююць, апырскваюць духамі і абліваюць гразёю… Дзеля чаго? Каб быць… Абы толькі быў сыты, п'яны і пад носам — табакерка… А чаму я ўсётакі захапіў яе — уладу гэтую, для чаго? На ўсякі выпадак! А раптам ды заўтра яна спатрэбіцца. А? На ўсякі выпадак, хай будзе ў маіх руках. А яна, халера, так пячэцца…

Кажуць, калі ў Расейскім драматычным тэатры паставілі «Разбуранае гняздо» Янкі Купалы, на воклічы «Бацька павесіўся!» заля выбухнула авацыямі. Перачытайце яшчэ раз прыведзены маналёг Цярэшкі Калабка — і падумайце, колькі разоў давялося б залі пляскаць у ладкі, калі б Луцэнка ці Раеўскі сёньня наноў паставілі «Трыбунал»! Як надзённа гучыць кожнае слова Цярэшкі.

Але Раеўскі і Луцэнка занятыя выкшталцонасьцямі: адзін ставіць Поля Кляндэля (няхай, гэта шчэ можна трываць), другі — дык зусім нават Курэйчыка. Драматург, які стварыў цэлы рэпэртуар для нацыянальнага тэатру, дзе аналягам можа быць хіба Астроўскі ў Расеі і Гальдоні ў Італіі, цяпер незапатрабаваны. Хоць вырасла цэлае пакаленьне, якое мае патрэбу ў тым, каб наноў перачытаць Макаёнка.

> Я шчэ памятаю ў «Зацюканым Апостале» бліскучага Аўгуста Мілаванава — таго самага, якога сёньня рэжысэр выпускае на сцэну для трох рэплік і стаяньня слупам у ролі Плюшкіна.

Мне пашэнціла. Я належу да іншага пакаленьня. Я памятаю тэлевізійныя вэрсіі макаёнкаўскіх п'есаў. Я памятаю ў «Зацюканым апостале» бліскучага і гнуткага хлуса Тату — Аўгуста Мілаванава — таго самага, якога сёньня рэжысэр выпускае на сцэну для трох рэплік і стаяньня слупам у ролі Плюшкіна. Я памятаю Генадзя Аўсяньнікава — Цярэшку, які быў больш абмежаваны і трагічны, чым у выкананьні Лява Дурава (і гэтага я памятаю!). І памятаю заключны маналёг Каравая — галоўнага героя «Таблеткі пад язык», сыгранага ўжо нябожчыкам Валянцінам Белахвосьцікам:

— У чым сакрэт нашай цярплівасьці, жывучасьці, неўміручасьці? У тым, што мужык, селянін вечна чакае і надзеецца. Пасее азімыя і чакае — а ці ўзыдзе, а ці выпадзе сьнег, ці пакрые пасевы ад марозу? Вясной — ледзь сьнег з поля — сам ён у полі. Ці ня вымерзла, ці ня вымакла. Пасее яравое — і зноў жа — а як узышло. А потым чакае з надзеяй — а як закаласуе, а як закрасуе, а як наліваецца. Радзілася цялушачка, і зноў жа з надзеяй чакае, калі яна стане кароўкай. Пасадзіць дубчык і чакае — калі ж вырасьце яблынька ці груша. Чакае дождыку, чакае сонейка. Чакае вясны, чакае жніва. Сёньня зробіць, а вынікі ня тут жа на далоні, а трэба чакаць…

Усё праўда. Пастаўце замест слова «мужык» слова «беларус» — і ўсё застанецца на сваіх месцах. Чакаць і спадзявацца — калі нічога, здаецца, ад цябе ўжо не залежыць. Ці не трагедыя гэта нашага нацыянальнага мэнталітэту?!

Бо — ці дачакаемся?

апавяданьне

# Васіль Падва

## АНДЖЭЙ СТАСЮК

Васіль Падва быў бедны. Ён ніколі ня еў гарачага — так казалі тыя, хто яго памятаў. У краме на прылаўку стаялі сьветлажоўтыя вядзерцы з мармэлядам. Два разы на тыдзень прывозілі хлеб. Падва быў адзін ва ўсім сьвеце й пасьвіў дзяржгасаўскія каровы. Летам на досьвітку лугі цяжкія і льсьняныя, нібы ртуць. Сонца яшчэ пахне падземным холадам. Гумавыя боты Васіля блішчэлі як афіцэрскія, калі ён крочыў паўз статак, грэючыся ў воблаку рудога цяпла. Мабыць, менавіта сузіраньне гэтага бязьмежнага срэбра зрабіла Васіля апантаным неадступнай думкай: быць багатым, мець болей, чым меў дагэтуль.

Еў ён штодня меней. Зрэбная вопратка ўсё больш шарэла й вісла на ім так, што ўмясьціла б дваіх такіх, як ён.

* * *

Гарбатая «Варшава» раз на месяц спынялася перад крамай і там, у зіхаценьні слоікаў зь вішнёвым джэмам, у паху грудзінкі, на вачах чалавека ў фэсцы, што пазіраў з кавы «Турак», касір, нясьпешна сьлінявячы палец, выдаваў заробак. Прадавачка гэткім жа чынам гартала пазыковы сшытак і забірала дзяржаўнае ды сваё. Васіль Падва заўсёды стаяў апошні, нібыта баючыся, што хто-небудзь зірне яму цераз плячо, сурочыць яго рост ягонага скарбу або сатрэ позіркам адзін з двух напісаных у яго графе нулікаў.

Банкноты з рыбаком, з рабочым, з шахтарам нагадвалі яму паштоўкі з далёкіх краін. Мора, фабрыка, шахта — гэтыя рэчы ён ведаў толькі з аповедаў. Тыя, хто ад'яжджаў туды, больш ніколі не вярталіся. Зьнікалі, як шукальнікі золата па дарозе ў Эльдарада.

Ён браў свой таненькі пачак, складаў напалам і хаваў у нагрудную кішэню, зашпіляючы яе на гузік, а людзі сьмяяліся, што ён і ўночы не здымае вопраткі. Ён ня піў, не паліў, не гуляў на грошы, на досьвітку выходзіў з каровамі і зьнікаў у белай імгле.

Пакуль у ліпені не прыйшла навальніца. Тыя, хто працаваў на сене, зьбеглі долу, і кожны схаваўся, дзе мог. Васіль застаўся наверсе, там, дзе пачынаўся Салодкі лес. Каровы стаялі пад дажджом, прыгнуўшы лбы, а ён забраўся пад куст ляшчыны. Бліскавіцы, як заўсёды, то тут, то там білі па вяршалінах дрэў, у дамах зьвінелі расхістаныя шыбы, а ў фіялетавым сьвятле маланак твары дзяцей выглядалі так, нібыта нехта сфатаграфаваў страх.

У той час і загарэлася старая адрына з саламяным дахам. Яна стаяла высока ў лугах, ля самага лесу. Людзі апавядалі, што Васіль ляцеў так хутка, быццам яго нёс вецер, ляцеў у той бок праз дождж і маланкі. Але ў навальніцы заўсёды больш агню, чым вады, і не пасьпеў ён дабегчы, як страха ператварылася ў трапяткую чырвань, потым трэснула, разламалася й апала долу. Разам са стрыжовымі гнёздамі згарэў Васілёў скарб, шмат гадоў пханы пад страху. Сотні, якія мелі колер полымя, пяцідзясяткі, зялёныя, як вада, і дваццаткі, бурыя, як дым.

* * *

Але на гэтым аповед не сканчаецца, бо сапраўднага каханьня не кране нават агонь. Васіль Падва пачаў усё нанова. Банкноты ён цяпер абменьваў на манэты. На срэбныя з рыбаком і на тыя, што з Касьцюшкам і з Капэрнікам, колеру палінялае бронзы. Хадзіў, пабразгваў, сьціхаючы на нейкі час, і ўсе думалі што ён недзе закопвае гэтае багацьце. Аднак натуру ён меў простую й ясную і, паколькі пацярпеў ад агню, вырашыў даверыцца вадзе. Пад Банам ручай віецца вужакам і, быццам зялёны кілімчык, сьцякае па шчарбатых сходах. У ім багата цёмных і глыбокіх месцаў. Васіль складаў пятакі й дзясяткі ў слоікі з-пад вішнёвага джэму і асьцярожна апускаў на дно. Мэталёвыя круглякі нагадвалі яму ордэны даўніх войнаў. Часам прадавачка праганяла яго ад прылаўка, і тады ён ішоў пяць кілямэтраў да іншай крамы і там абменьваў папяровыя фантомы на незьнішчальны мэтал.

Пакуль улетку не пачалася такая залева, што за тры крокі сьвету не было відаць. Васілёў ручай, які можна было лёгка пераскочыць, нёс дрэвы, зварочваў камяні, а вада загусла ад бурай твані. Васіль Падва ўдзень і ўночы чакаў на беразе, пакуль ручай вернецца ў сваё рэчышча і зноў набудзе празрыстасьць. Аднак нічога, апрача глею, ён не знайшоў. Да восені ён хадзіў уздоўж берагу, шукаючы сваё багацьце. Каменьне мела колер лінялых Капэрнікаў, а маленькія стронгі зіхцелі на сонцы, як срэбныя пятакі. Да самай восені блукаў ён уверх і ўніз па беразе, а статак кароў, якога ён ня мог пакінуць, стаптаў луг у гэтым месцы на голую зямлю.

* * *

У трэці раз Васіль Падва даручыў свой скарб зямлі. Схованку ён зрабіў недзе ў Салодкім лесе. Гэтая гісторыя найбольш цьмяная. Дакладнае месца ведаў толькі ён і той, хто праз год адкрыў і абрабаваў схованку. Людзі, як заўсёды, сьмяяліся, а Падва, дазваньня стомлены стыхіямі, стаў такім, як усе.

**Пераклала з польскай Марыя Мартысевіч**

паводле Andrzej Stasiuk. Dukla. — Czarne, 1999.



**Анджэй Стасюк** (нар. у 1960 г. у Варшаве) — адзін з самых папулярных сучасных польскіх пісьменьнікаў. Стомлены горадам, з канца 80-х жыве ў вёсцы Чарнэ. Мае выдавецтва і сам выдае свае кніжкі.

# Люба Тарасюк

З палескай вёскі Пінкавічы прыйшла сумная вестка — ня стала Любы Тарасюк. Падупалае здароўе змусіла яе пакінуць сталіцу, працу ва ўнівэрсытэце, апошні год яна жыла ў сваім родным селішчы. Вестка дасягнула Менску са спазьненьнем — сябры і калегі зь філфаку БДУ, дзе Любоў Канстанцінаўна адпрацавала больш за трыццаць гадоў, не змаглі прыехаць на разьвітаньне-пахаваньне. Раздольны палескі краявід ужалобіўся яшчэ адным надмагільным крыжам...

Што адчувалася адразу ў характары Любы Тарасюк — яе цьвёрдая беларуская пазыцыя. Многія філфакаўскія выкладчыкі за дзьвярыма аўдыторыяў непрыхавана размаўлялі па-расейску. Некаторыя, відаць, выконваючы спэцзаданьне, наведваліся да нас на сходкі маладзевага клюбу — адгаворвалі, папярэджвалі, пагражалі. Адзін мовазнавец, ідэалягічны апякун нашага студэнцкага атраду, штоночы здымаў зь вільчыка хаты, дзе жылі студэнты, бела-чырвона-белы сьцяг. Усё гэта помніцца. Ад Любы Тарасюк мы заўжды мелі падтрымку. Шашаль савецкай ідэалёгіі не стачыў ейнай беларускай сарцавіны.

Згадваецца восень 1984 году. Калі ў студэнцкую аўдыторыю зайшла Люба Тарасюк, падумалася, што ёй больш пасавала б выкладаць марксісцка-ленінскую філязофію — гэткай строгай, дысцыплінаванай і ў стылі паводзінаў, і ў манеры апранацца яна выглядала. А чытала Тарасюк беларускую народную творчасьць — уводзіла нас у космас айчыннага фальклёру, расказвала пра песьні і прыпеўкі, казкі і прыказкі, замовы і галашэньні, загадкі і старажытныя павер'і, легенды і паданьні. Учорашнія вяскоўцы, што прыехалі па вялікую навуку ў Менск, спачатку ня вельмі каб пранікаліся сур'ёзнасьцю прадмету («от, падобныя замовы я ад сваёй бабулі чуў...»). Але выкладчыца



праз паўгоду дамаглася свайго, і на іспыт да яе студэнты ішлі з гэткім самым душэўным трымценьнем, як і да карыфэяў мовазнаўства — Паўленкі і Супруна.

Любоў Канстанцінаўна была навуковай кіраўніцай маёй дыплёмнай працы па паэзіі Ларысы Геніюш. Тады, пры саветах, кнігу паэткі «Ад родных ніў» у Беларусі дастаць было немагчыма, і мне прывезьлі скапіяваны асобнік з праскай бібліятэкі (памятаецца аўтограф на ім М. Забэйду-Суміцкаму). Мяне зьдзівіла, што кіраўніца пазычыла ў мяне ўвесь капіяж і акуратна, ад рукі, перапісала ўсе дзевяноста два вершы сабе ў сшытак. Нам, студэнтам эпохі перабудовы, цяжка было зразумець, як праглі старэйшыя дапасьці да недасягальных раней, схаваных за сямю замкамі ў спэцархівах тэкстаў! Пакрыўджаны, на нейкія дробныя заўвагі да дыплёму, я не даўмеўся запрасіць Любоў Канстанцінаўну на абарону. Прафэсар Алег Лойка, выступаючы з уласцівым яму патасам, раз-пораз паглядваў на дзьверы: а дзе ж кіраўніца? Божа мой, як мне да гэтай пары сорамна за тыя даўнія амбіцыі...

Паэтычны зборнік Любы Тарасюк «Смага ракі», што выйшаў у 1983 годзе ў сэрыі «Першая кніга», так і застаўся адзіны. І ў гэтым мне бачыцца яшчэ адно ейнае наканаваньне — насіць у сабе маўчаньне паэта. А Любоў Канстанцінаўна была паэтам. «Як ты ішоў!.. Твая дарога цябе, абветранага, абдымала / і твае ногі ціха цалавала, / у промнях сонца, што ішло з табою, / усьлед салодкім пылам танцавала».

Сваю апошнюю кнігу «Апалёгія красы» (2003) Люба Тарасюк выдала ўласным коштам накладам усяго 100 асобнікаў. У ёй — удумлівыя, тонкія назіраньні над паэзіяй Н.Арсеньневай, Л.Геніюш, М.Багдановіча, А.Зязюлі, К.Сваяка — паэтаў, хто маліўся Красе, хто з падказкі лёсу стаўся добраахвотным палоньнікам бога Апалёна. Пераканаюы: «Апалёгія красы» яшчэ сустрэнецца з варштатам Скарыны.

Felix opportunitate mortis. Шчасьлівы, хто памірае своечасова. Але ці бывае сьмерць своечасовай? У апошнія месяцы, прадчуваючы сваё дачаснае згасаньне, Люба Тарасюк, сама знаўца замоваў і праклёнаў народных, часам жартавала: маўляў, залішне патрабавальна ставілася я да студэнтаў, вось і праклялі, відаць, мяне... Не дадаў жыцьцёвага аптымізму, напэўна, і той факт, што артыкулы Тарасюк пра Арсеньневу і Геніюш у апошні момант выкінулі зь нядаўна выдадзенай энцыкляпэдыі «Беларускі фальклёр». Што ж, у дзяржаўных выдавецтвах і рэзыдэнцыях сёньня гаспадараць дачасьнікі. А апалёгія красы слова беларускага, якому слугавала Люба Тарасюк, — зьява вечная. Дык слухайма голас Вечнасьці, якая ўзяла да сябе таленавітую і адданую беларушчыне паляшучку зь вёскі Пінкавічы.

**Міхась Скобла**

Беларуская палічка
што чытаць?
www.knihi.com
дзе знайсьці?
БЕЛАРУСКАЯ ЭЛЕКТРОННАЯ БІБЛІЯТЭКА

# Дывэртысмэнт для ІК

## СЯРГЕЙ ПРЫЛУЦКІ



ІРЫНА ДАРАФЕЙЧУК

1
Я пішу табе зь цемры — выдаткі работы.
Мой кампутар шалее, пачуцьці — таксама.
Безь цябе пражываю жыцьцё зь неахвотай:
дай, галубка, мне, нью, хаця б тэлеграму,

каб я мог дацягнуць да наступнае дозы,
каб глядзець на людзей не з агідай, а жалем.
Напляваць на выгоды, прыбытак, ролз-ройсы,
абы ты на мае не паклала скрыжалі.

2
Я — арфэй, славаблуд, мацюгальнік заўзяты —
у памежнай правінцыі краю абсурду,
час і розум губляючы ў порна і чатах,
паратунак знаходжу у словах. Заўсёды

ў палюбоўным разладзе з быццём і сабою
ўсё адно пакахаць, нібы лох, цябе здолеў.
Не люблю, маё сонца, здавацца бяз бою:
пагуляйма — памучым сваю неспатолю!

3
Гутэнтак, майнэ кляйнэ вандроўная котка!
У Бэрліне — лагода, а ў нас тут — шыза:
кормяць пернікам і — не шкадуючы — плёткай
(пра яе нехта Фрыдрых цудоўна казаў).

Падарожжы ёсьць ежай душы: азірніся
і спазнаеш дагэтуль нязьведаны драйв.
Нават я тут, у пекле, на дне, самым нізе
сузіраю цікаўна татальны раздрай.

4
Мне няма што сказаць, я маўчу. Ў маім целе
ані кроплі сіл, у душы — распад.
Каб забыцца, нырцую у радыё- й тэле-
акіян. Падкажы мне дарогу назад.

Мой тупік — безаблічныя лёгкія будні,
што мяне прыручаюць, ад жарсьцяў і сноў
адлучыўшы. Мой час — надта брыдкі ды брудны.
Ажыві сваёй явай жыцьцёвае шоў.

5
О, марлен мая, дытрых, зіма ўжо мінула,
а мы ўсё паасобку — ты нешта сьпяваеш,
я ж, па звычцы, — маўчу, ні да чога ня чулы,
акрамя як да словаў ды рымаў. Ці марыш

адрачыся ад слабасьцяў й непастаянства,
што заносяць пад скуру ўтрапеньня хваробу?
Самі пекла сабе й паслухмяная паства;
мы з табою — бадзягі нязнанае пробы.

6
Вось ізноў забухалі сябры ды суседзі,
ў карнавалах сьвяточных знайшоўшы ратунак
ад сябе і ад бліжніх. Ці ты, мая лэдзі,
гэтаксама нявечыш свой розум і шлунак?

Захавайма сваёй бесклапотнасьці лёхі,
дзе — душа, а ня дух забрадзілага збожжа.
Весялосьці і торчу няма ані трохі
ў іхнім ціхім і патрыярхальным бязбожжы.

7
Новы мэр паказаў сябе вельмі прыстойным.
Пані М. падарылі кватэру й каляску.
У Багдадзе й Нью-Ёрку усё неспакойна.
Адчынілася крама *«Кансэрвы й кілбаскі»*.

Вось калаж: ён рэальны, таму й бессэнсоўны.
Бы паштоўка зь любога зь пяцёх кантынэнтаў.

Маёй памяці мех скарбам гэтакім поўны.
Ты ж — зьнішчаеш яго кожнай ночы дашчэнту.

8
Кансьпіратар уласных параз і жаданьняў,
як люблю я прачнуцца адзін у кватэры —
смакаваць цыгарэту гадзінаю раньняй,
слухаць лялечак злых у айчынным этэры;

аддавацца кароткім шчасьлівым імгненьням,
у якія ты човен паўзьверх акіяну;
піць гарбату й сачыць, як паўзуць па калене
і цяплом спавіваюць праменьні-ліяны.

9
Паказальна-узорны ансамбль алькаголікаў,
што ад бару нуды да рыгалаўкі радасьці
несупынна дрэйфуе, мяняючы столікі
й, нібы пляшкі, — гады. Да найглыбшага дна дайсьці,

калі ўсё ўжо *сваё*, — вось уцеха адзіная.
Іраністы, юрліўцы, гульцы апантаныя...
У хмяльным віртуале чароўнай ундзінаю
ты прыходзіш і ўміранасьць дорыш жаданую.

10
Як табе ў Бангкоку, тайляндзкія цуды
ці даюць асалоду вачом, ці ўзрушэньне
робіць вэрхал у думках? Між нашых спарудаў
фіг ты фарбаў такіх сузірацьмеш браджэньне.

Там ты, котка, свабодная ў дзеях і словах,
што тубыльцам тамтэйшым, напэўна, да сракі.
Зрэшты, як і тутэйшым. Вэрбальны мой сполах
не пакінь без адказу — дашлі фатакарткі!

11
Шмат прывабнага маюць былыя каленіі:
сэксуальнасьці слодычы, пошапт архаікі...
Там калі і канаеш, дык толькі ў агоніі.
У далёкіх мясьцінах шалёнай арганікі

заўважаеш на тварах знаёмыя прыцемкі
(іх і ўдома хапае ў вачох суайчыньнікаў).
Занясі ўсё ў свае штовячэрнія зацемкі,
у маленькі ноўтбук падарожнага кініка.

12
Завучыўшы на памяць ўсе сутры і мантры,
ты нарэшце вяртаесься з доўгіх ваяжаў.
Як сустрэне цябе твая родная кантры?
Ці ўсьцешыцца вока знаёмым пэйзажам?

Доўгі сон. За акном — пыл і гул аўтабану.
Ты гатовая здохнуць з нуды або грыпу.
Але гэта мінае, й ты зноў закахана
і з азартам глядзіш на насьценную мапу.

*студзень — сакавік, 2006*

# Штрых-код адзіноты

**СЯРГЕЙ БАЛАХОНАЎ**

Крочыш Лябірынтам эмоцый. Памятаеш, што гэта тваё працоўнае месца? Пусты калідор пусты. У актавай залі гучыць павольная музыка і анёльскія сьпевы.

У цішы над зямлёй
У эфіры начным
Голас чысты гучыць —
Так пяе херувім.

Песьня на словы Зянона Пазьняка. Пасярод зімы, наваротаў дзяржаўнай ідэалёгіі і прыправак да Крымінальнага кодэксу. Ірэальнасьць — наша Радзіма. Нібыта дзяўчынка Аліса, ты хочаш адкусіць кавалачак чароўнага грыба, абы хоць нешта перамянілася — ці то навокал, ці то ў табе самім. Нічога не мяняецца. Толькі ірэальнасьць множыцца ў такіх прагрэсіях, што ня сьнілася ні Фройду, ні Бабкову. Без «Хазарскага слоўніка» нікуды.

Штодзённы шлях праз торжышча. Сёньня ён аздабляецца монаспэктаклем кветачніцы. Яна тэлефануе свайму пэрсанальнаму Чапліну, разоў сорак згадвае ўсходнеславянскае слова на літару «х», спрабуючы пры гэтым дзьверы сваёй крамкі. Манерна стукае ў іх нагой. Мінакі сьмяюцца. Але ты чамусьці пэўны, што празь якіх 18 гадзін у яе з Чаплінам усё будзе добра.

Ці будзе штосьці добрае ў цябе, бадай, ня ведае сам усёмагутны Алаг. Бо ад добрага лепшага не шукаеш. Бо на простыя рашэньні не наважваесься. Дык жа зусім эгаістычна адпрэчваеш тых, хто не спазнаў узаемнасьці, пасьмеўшы займець ласку да цябе. «Давай пасьля Лябірынту сходзім куды-небудзь», — прапаноўвае адна. Што можаш адказаць на гэта? Нічога. Якімі думкамі пра шчасьце падзяліцца? Ніякімі. Бо шчасьце, бо долю ня ў гэтым ты бачаш. А шчасьце, а доля — гэтая прывабная дзяўчынка — глядзіць табе ў вочы, усьміхаецца і дасылае чарговую эсэмэску пра «нармалёк» ці «дасягнуты эфэкт». І большай уцехі душы не патрэбна. Бо ілюзорнасьць, бо ірэальнасьць.

А праўда якая? Шэрая ў бліскаўках. Даведваесься, як двух тваіх шчасьлівых сяброў кідаюць іх дзяўчаты. Кідаюць зьнянацку, дарма што ўсё ў іхніх стасунках здавалася аж занадта стабільным. «Я відзеў душы стабільныя», — уздыхнуў бы на новы лад клясык. Ты ж нават і слоў ніякіх для падтрымкі не знаходзіш. Многага ня скажаш. Асабліва не супакоіш. Вялікія хлопчыкі самі ўправяцца з часовым клопатам адзіноты. Хлопчыкі ня плачуць. Адзін знойдзе сабе чулую студэнтку-старшакурсьніцу, другі — харошую настаўніцу, аматарку карпаратыўных вечарынак. І ўсё будзе супэргут і фантастыш. Пакуль жа фантастыкай глядзяцца раптоўныя кветкі ад іншых маладажонаў ля помніка Кірылу Тураўскаму ў цэнтры твайго гораду. І зайздрасьць даймае з тае прычыны, што падобную традыцыю запачаткаваць давялося не табе. Ты ж знаеш, у каго трэба набываць кветкі, каб ужо дакладна па-ўсходнеславянску выйшла.

# Вялікі трускалкавы шлях


PHOTO.BYMEDIA.NET

Большасьць жыхароў Лунінеччыны жыве з клубніцаў. Рэпартаж Сямёна Печанка.

У Лунінцы, што на Берасьцейшчыне, ёсьць і чыгунка, і прамысловасьць якая-ніякая. Але жывуць тут людзі не з афіцыйных заробкаў, якія хутчэй ёсьць дадаткам да кароткатэрміновага сэзоннага, аднак вызначальнага прыбытку. Зарабляюць тут на ягадах. А таксама на гародніне і бульбе, што родзяць у гэтых мясьцінах выдатна.

## Калгасны пачатак

Лунінец справядліва ўважаецца за трускалкавы край. Трускалкі тут зьявіліся ў 80-я гады. Спачатку імі займаліся мясцовыя калгасы. Новая культура была шматабяцальнай: пясчаныя глебы для яе больш спрыяльныя. Кармавыя ж культуры тут здавён не давалі ўраджаю, таму і жывёлагадоўля ў гэтай мясцовасьці займае далёка ня першае месца. Мясцовыя жыхары ўзгадваюць тыя часы без настальгіі: «Ганялі на поле ўсіх садзіць тыя вусы». Так, без асаблівага энтузіязму, калгасныя трускалкавыя палеткі праліпелі пэўны час. Людзі па старой звычцы расьцягвалі навінку па сваіх гародах. Там справа нечакана пайшла нашмат лепш, і вельмі хутка знайшліся тыя, хто скеміў, што на клубніцах можна нават зарабляць. Калгаснае кіраўніцтва таксама гэта сьцяміла, таму калгасьнікам забаранілі працаваць на ўласных падворках у працоўны час, нават тады, калі рабіць і не было чаго.

## Рэкет

На той час асабістае аўто мела далёка ня кожная сям'я, таму на продаж часьцей за ўсё езьдзілі на цягніках ды аўтобусам. Тым ня менш, геаграфія гандлёвых ваяжоў уражвае: вазілі ў Магілёў, Віцебск, Маскву, Бранск. Зазвычай ехалі двое дарослых, везьлі два корабы ягадаў па 150 кг кожны. З павелічэньнем колькасьці прыватнага транспарту пашыралася і геаграфія продажаў. Лунінецкія гандляры добра вывучылі і беларускі рынак: у буйных гарадох ніхто не стаіць на рынку, адразу едуць у багатыя прамысловыя раёны, дзе людзі, не асабліва таргуючыся, бяруць ягады на сочыва дзясяткамі кіляграмаў.

Зьявіліся і тыя, хто пачаў зарабляць на клубніцах не гнучы сьпіну ў гародзе: хто не дзяліўся — рабавалі ў начных цягніках і на рынках, здымалі ды

рэзалі колы ў легкавіках. Рэкет неўпрыкмет зьнік у сярэдзіне 90-х, калі большасьць гандляроў перасела на ўласныя колы, а іх колькасьць зрабіла зусім не эфэктыўным кантроль за гандлёвымі шляхамі.

## Толькі лянівы ходзіць пешшу

Сёньня каля 90% лунінецкіх сем'яў займаюцца трускалкамі і бульбай, якая таксама няблага родзіць тут і на роўных канкуруе зь ягадамі. Сярэдняя сям'я ўрабляе ад 20 да 50 сотак ягадніка. Ня мець пры двары хоць які ўчастак зь ягадамі — выразная прыкмета дэградацыі альбо сур'ёзных праблемаў са здароўем. Працавітыя людзі маюць тут зусім неблагі прыбытак — толькі за сэзон пры памысным раскладзе можна зарабіць некалькі тысячаў даляраў. Большасьць з тых, хто жыве зь ягадаў, маюць два легкавікі — на кожны дзень і на выезд.



## Кошт самастойнасьці

Амаль усе прадаюць свой тавар самастойна, але з кожным годам расьце доля тых, хто прадае ягады камэрсантам-перакупшчыкам. І гэты рост хутчэй за ўсё будзе на карысьць апошніх. Пра рэкет усе амаль забыліся, аднак, як і ў войску дзедаўшчына, ён набыў іншыя формы. На рынках, куды возяць свае ягады ўласьнікі, найлепшыя месцы раскупленыя, і канкурэнты-перакупшчыкі не пакідаюць ім шмат шанцаў — самыя аддаленыя куты рынкаў застаюцца за тымі, хто ніяк не адмовіцца ад самавывазу. «Калі ўбачыш каго з карабамі ў самым цёмным месцы, ведай, гэта той, хто сам сваю ягаду і прывёз», — кажуць мясцовыя.

Закупачныя кошты ў нарыхтоўчых канторах і ў камэрсантаў адрозьніваюцца ўдвая, як, зрэшты і патрабаваньні да якасьці прадукцыі. Дзяржава прымае дробныя, зь сьмецьцем ягады па 700 рублёў за кілё (кошт не зьмяняецца ўжо каля 4 гадоў), камэрсанты ж даюць 1200—1500 руб., але пераглядаюць кожную ягаду. Да 1995 г. і дзяржаўныя, і камэрцыйныя ўстановы скуплялі ягады па даляры за кіляграм; прадаючы самастойна, можна было выйграць 0,5—1 даляр звыш таго. Надзвычай кароткі тэрмін захоўваньня ягадаў дае нагоду нарыхтоўшчыкам зьбіць цану — нідзе ня дзенецца гаспадар: ноч ягада пастаіць, пусьціць сок, страціць таварны выгляд, і яе ўжо ніхто ня купіць. Сем'і, што займаюцца бульбай, наадварот дыктуюць умовы нарыхтоўшчыкам, пераважная большасьць якіх — расейцы. Аднак бульба патрабуе памяшканьня для захоўваньня і не дае такой хуткай аддачы.

Большасьць ягаднікаў маюць два легкавікі — на кожны дзень і на выезд.

## Зьніклая радыяцыя

Каб здаваць ягады, трэба мець даведку пра ўтрыманьне радыянуклідаў і нітратаў. Здаючы ўраджай на завод, трэба ўлічваць кісьліннасьць сыравіны, якая ня мусіць перавышаць 8,5 адзінкі, чаго на ўзроўні прымітыўных прысядзібных тэхналёгіяў дамагчыся часта немагчыма. І гэта робіцца падставай для розных маніпуляцыяў з боку пэрсаналу пункту прыёму — ягады бессаромна заліваюць вадою, падганяючы кісьліннасьць да патрэбнага ўзроўню, атрымліваючы тое-сёе з гэтых няхітрых апэрацыяў. Сталыя ягаднікі прыгадваюць, як на пачатку 90-х час ад часу даводзілася высыпаць ягады ў прыдарожны пыл, не прайшоўшы радыямэтрычнага кантролю. Дзіўным чынам на гэтую праблему амаль забыліся, хоць пэрыяд паўраспаду 137-га цэзію складае 30 год, а забруджваньне глебаў на Лунінеччыне часам дасягае пяці кюры. Тут на гэта кажуць, што з кантралёрамі, якія таксама ласыя да ягадаў, трэба сябраваць.



## У чаканьні лепшага

Раённыя ўлады спрабуюць кантраляваць трускалкавы бізнэс, вызначаючы аб'ёмы паставак ды турбуючы прыватнікаў зь перакупшчыкамі. Пры гэтым перапрацоўчая прамысловасьць у раёне гібее. Як і адмысловыя памяшканьні для захоўваньня прадукцыі, якія прастойваюць, бо ніхто з прыватнікаў не павязе сюды ўвесь ураджай, каб не афішаваць рэальны памер патэнцыйнага прыбытку. Усе ж трымаюць нібыта невялікія прысядзібныя ўчасткі.

Гадуюць клубніцы, ня надта зважаючы на тэхналёгіі і сэлекцыю: мінімум выдаткаў, ніякай хіміі, пра польскія ці галяндзкія гатункі большасьць і слухаць ня хоча. Кажучы мовай агранаміі, займаюцца масавым індывідуальным адборам — пакідаюць лепшыя кусты, выдаляючы ўсё старое і хворае. Канкурэнцыя між сваімі не выходзіць далей за рэдкія начныя вылазкі ў суседзкі гарод па лепшыя кусты. Неахвотна, нават зусім, ня дзеляцца добрымі месцамі збыту. Непрададзеныя трускалкі кормяць курам.

Праз неразьвітую інфраструктуру і адсутнасьць спрыяльных умоваў раён шмат страчвае. Мясцовыя землі вельмі спрыяльныя для гародніцтва і садаводзтва. Тут добра родзяць і памідоры, і морква. Добрыя растуць маліны ды чарніцы ў мясцовых лясох. Усё гэта, калі дадаць, што ніхто з гандляроў зусім ня ўлічвае сярод выдаткаў кошт ручной працы, такой нятаннай на Захадзе, стварае неблагі эканамічны патэнцыял для будучыні рэгіёну.

**Сямён Печанко**



**Значэньне трускалак у падвышэньні ўласнага дабрабыту знайшло адлюстраваньне на гербе лунінецкай вёскі Дварэц. Залаты колер, на якім разьмешчаныя ягады, сымбалізуе багацьце вёскі, разьмешчанай паблізу міжнароднай аўтатрасы Берасьце-Гомель, з адзіным пакуль у раёне аб'ектам прыдарожнага сэрвісу.**

# Дамавік





Барадаты дамавік
Загубіў свой чаравік.



Пашукаў на ганку —
Выпацкаў фіранку.



У куфэрак зазірнуў —
Жменю пылу праглынуў.





Паглядзеў за печкай —
І рассыпаў грэчку.







Пакуль справы ўсе зрабіў,
Ключ ад хаты загубіў!

Капітан Танака ©

Сюды варта завітаць падчас вандроўкі ў Польшчу.

# Станчыкі



На самай поўначы Польшчы, пры мяжы з Калінінградзкім анклявам, на Сувальшчыне, ёсьць невялічкая мясьціна Станчыкі, якая штогод сьцягвае да сабе тысячы й тысячы турыстаў. З усёй Польшчы, дый з замежжа, людзі едуць паглядзець на канструкцыю чыгуначнага моста з пачатку XX стагодзьдзя, якую некаторыя лічаць будаўнічым цудам, па памерах параўнальным хіба што з магутнымі эгіпецкімі сьвятынямі.

Пабудаваная немцамі і ў асноўным ужываная для перавозу лесу чыгунка не перанесла дзьвюх сусьветных войнаў і прыйшла ў заняпад, паросшы лесам. Калі б ня ўражвальных памераў мост, што маляўніча ўплёўся ў мясцовы пэйзаж, Станчыкі маглі б назаўсёды зьнікнуць з мапаў.

Па дарозе да Станчыкаў зь Беларусі можна праехаць праз заселенае беларусамі Падляшша і Мазурскія азёры зь іх знакамітымі курортамі.

**АГ**



# У Гомелі зь пяску вылупіцца цмок



Арганізатары пленэру абяцаюць незабыўнае відовішча.

Правядзеньне скульптурнага пленэру «Легенда зь пяску» становіцца добрай традыцыяй. Сёлета 21—23 ліпеня адбудзецца ўжо шосты падобны фэст. Гэтым разам месцам яго правядзеньня стане Гомель. Мастак Гэнік Лойка тлумачыць, чаму менавіта горад над Сажом быў абраны для пленэру: «Летась, калі мы ў Крэве выраблялі зь пяску постаць Кейстута, там прысутнічаў гомельскі хлопец Яўген Малікаў, ён захапіўся ідэяй правесьці пленэр у сваім горадзе. Пазьней Яўген самастойна выйшаў на мяне з такой ініцыятывай, таму мы і едзем у Гомель».

За сем гадоў існаваньня пленэру хто толькі ні быў яго галоўным героем: бандыт Машэка ў Магілёве, вялікія князі Міндоўг з Кейстутам, непакорлівая Рагнеда ў сваім Заслаўі. На гэты раз удзельнікі зьбіраюцца стварыць выяву цмока. Гэта тлумачыцца тым, што сп.Малікаў досыць даўно захапляецца гэтымі мітычнымі істотамі.

«Нармальны выбар, — сьмяецца Гэнік Лойка. — Вось нядаўна Ірына Дубянецкая знайшла беларускую лірную песьню, дзе казалася: «Скуль узялося сьвятога Юр'я і нявіннага цмока забіў». Для беларусаў гэта характэрна, што цмок якраз нявінны, а ня злосны і бязьлітасны».

Улады Гомелю ня сталі замінаць у арганізацыі пленэру, а нават далі ўдзельнікам цэнтральны пляж гораду на карыстаньне, абяцаюць таксама дапамагчы зь пяском. Арганізатары мяркуюць, што асноўную ролю ў вырабе цмока адыграюць самі гомельцы, а ня менскія госьці. «Наша справа — толькі даць гамельчукам патрэбны імпульс, — кажа Гэнік. — Таму запрашаем усіх ахвотных».

У нядзелю 23 ліпеня а 18.00 адбудзецца прэзэнтацыя цмока. Арганізатары ўнікальнае акцыі абяцаюць нават невялічкае піратэхнічнае шоў, бо што гэта за цмок без агню!

**Зьміцер Панкавец**

КАІСА

# Гэта была сіла!

Імя першага беларускага шахматнага майстра Ўладзіслава Сіліча, раўналетка «Нашай Нівы», цяпер падзабытае прафэсіяналамі. Міні-апытаньне, зладжанае ў кулюарах Чэмпіянатаў Беларусі — 2006, паказала, што палова шахматыстаў ня чула пра чэмпіёна краіны 1929, 1934 і 1937 гг., а палова — адно «нешта чула».

Папраўдзе, біяграфічныя зьвесткі пра гэтага чалавека скупаватыя. Нават зь імем ёсьць блытаніна: у маскоўскім «Шахматным слоўніку» Сіліч называўся «Ўладзімерам». Аўтар зборніка «Беларускія спартоўцы ў баёх за Радзіму» (Менск, 1985) даў паясьненьне: Сілічава жонка чамусьці не палюбіла імя Ўладзіслаў, і зь цягам часу шахматыст перайшоў на «Ўладзімера».

Нарадзіўся Сіліч у Эстоніі, у сям'і беларусаў, якія неўзабаве вярнуліся на бацькаўшчыну. Жыў у Віцебску, гуляць у шахматы навучыўся, найхутчэй, самастойна. Наведваў шахклюб на рагу Канатнай і Вакзальнай. Ужо ў першым Чэмпіянаце БССР, маючы 18 гадоў, заняў «бронзавае» месца. Пазьней прагрэсаваў нароўні з Гаўрылам Верасавым, Антонам Касьперскім і Абрамам Маневічам, а часам і апярэджваючы іх.

У 1929 г., пасьпяхова згуляўшы ў Чэмпіянаце Саюзу, Сіліч атрымаў годнасьць майстра — для тых часоў дужа рэдкую. Праз колькі год у выніку «чысткі кадраў» быў яе пазбаўлены, але ў 1939-м, падзяліўшы ва Ўсесаюзным турніры кандыдатаў у майстры высокія месцы з будучым гросмайстрам Ісакам Баляслаўскім, аднавіў свае гонар і годнасьць. У вайну стаў радыстам стралковай дывізіі: загінуў у Латвіі, пахаваны ў вёсцы Гудраны.

Апроч выступаў у «клясычных» спаборніцтвах, Сіліч гуляў празь перапіску, даваў сэансы адначасовай гульні, вёў гуртох пры таварыстве «Спартак», рэдагаваў шахаддзел у «Віцебскім рабочым»… Карацей, шмат зрабіў для разьвою шахмат у краіне. Хіба толькі кампазыцыяй не займаўся.

У Беларусі арганізуюцца мэмарыялы Верасава, Кулагі, іншых шанаваных гульцоў. Вось жа, і Сіліч заслужыўся, каб яго імем назвалі турнір. А магчыма, і шахматны клюб у Віцебску.

**Вольф Рубінчык**



**Як бы вы згулялі?**

І.Зубараў — У. Сіліч. Ход чорных.

**Адказ:** 1… b5! 2. Фb5 Сd7 3. Фb3 Тb8 4. Фc2 Тc8 5. Фb3 Фa5. Коштам вернутай пешкі чорныя дабіліся пазыцыйнай перавагі, якую рэалізавалі праз тузін хадоў.

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Кінафармат «4x4»

**Прапанова.**

(Proposition)

Аўстралія—Вялікабрытанія, 2005, каляровы, 104 хв.

**Жанр:** вэстэрн, крымінальная драма.

XIX стагодзьдзе. Аўстралійская пустыня. Банда братоў Бэрнзаў не дае спакою маленькаму гарадку. Шэрыф Стэнлі прапануе Чарлзу Бэрнзу выбар: каб выратаваць ад шыбеніцы малодшага брата, ён мусіць застрэліць старшага…

Жорсткі й крывавы вэстэрн, экзыстэнцыйная аўстралійская драма з брытанскімі акторамі (Рычард Ўілсан, Гай Пірз).

Сцэнар да карціны Джона Гілката склаў яе кампазытар — Нік Кейв, слынны пясьняр рамантычных забойстваў.

Карціна — безумоўны дыямэнт у кінафармаце.

## Куфар продкаў

Кыргызстан—Францыя—Расея—Нямеччына, 2005, каляровы, 104 хв.

**Жанр:** камэдыйная драма.

Пасьля стажыроўкі ў Парыжы Айдар вяртаецца ў родны аул зь нявестаю Ізабэль. Дзяўчына не разумее, чаму Айдар баіцца назваць усім яе як сваю нарачоную. А ў старым ауле, дзе за стагодзьдзі нічога не зьмянілася, рэй вядуць звычаі і старыя легенды. Каханьне Айдара і Ізабэль пад пагрозаю…

Аўтэнтычнае кіргіскае кіно.

Прыз Нурбэку Эгену за найлепшую замежную драму на кінафэсьце «Young Artists Awards 2006» у Лос-Анджэлесе.

## Колькі ты кахаеш?

(Combien tu m'aimes?)

Францыя—Італія, 2005, каляровы, 95 хв.

**Жанр:** іранічная драма.

Франсуа пашэнціла ў лятарэі. Ён выйграў 2 мільёны эўра. Вязунчык адпраўляецца ў клюб, дзе шыкоўная італьянка гандлюе сваім целам. Франсуа прапануе прастытутцы быць зь ім, пакуль у яго ня скончацца грошы. Вось толькі ці спадабаецца гэта бандытам і сутэнэрам?

Тыповы сюжэт Бэртрана Бліе, хаця сёньня рэжысэр не на вяршыні посьпеху. Аголеная Моніка Бэлючы ў ролі прастытуткі й Жэрар Дэпард'ё ў якасьці сутэнэра…

## Кармэн з Каелічэ

(U-Carmen e-Khayelitsha)

Паўднёва-Афрыканская рэспубліка, 2005, каляровы, 120 хв.

**Жанр:** драма.

Паводле аповесьці Праспэра Мэрымэ й аднайменнай опэры Жоржа Бізэ.

Англічанін Марк Дорнфард-Мэй перанёс дзеяньне опэры Бізэ ў найбяднейшы раён Кейптаўну — Каэлічэ. Опэра адмыслова была перакладзеная на мову афрыканскага племені коса, і ўсе акторы — чарнаскурыя.

Першы фільм з Паўднёвыа-Афрыканскай рэспублікі на беларускіх экранах.

Галоўны прыз «Залаты мядзьведзь» Бэрлінскага кінафэсту.

**Андрэй Расінскі**

Фільмы кінафармату «4x4» дэманструюцца ў менскіх кінатэатрах «Перамога», «Аўрора», «Мір», «Цэнтральны» з 20 па 23 ліпеня.

## ВАРТА ПАГЛЯДЗЕЦЬ

### Субота, 22 ліпеня

**«Лад», 10.15**

«Шукайце жанчыну».

Расея (СССР), 1982, рэж. Ала Сурыкава.

Камэдыйны дэтэктыў.

Перад Новым годам нажом у сьпіну забіваюць кіраўніка юрыдычнай канторы (Сяргей Юрскі). Балбатлівая сакратарка вядзе сьледзтва...

Камэдыйны дыямэнт зь неператўзыдзенай Сафіко Чыўрэлі і Леанідам Кураўлёвым.

**БТ, 14.30**

«Маем рэчы».

Беларусь, 2006, аўтар і вядоўца Алесь Матафонаў.

Перадача прысьвечаная налібоцкаму шклу.

**НТВ, 21.50**

«Паварот».

ЗША, 1997, рэж. Олівэр Стоўн.

Карцёжнік Бобі, якому мафія адразае за пазыкі пальцы, трапляе ў маленькі гарадок. Машына зламалася, грошы згубленыя. Гандляр нерухомасьці прапануе герою забіць жонку, якой карціць выбрацца з абрыдлага гарадка.

Ролі выконваюць: Шон Пэн, Джэніфэр Лопэс, Нік Нолт.

**БТ, 23.10**

«Мой найлепшы палюбоўнік».

ЗША, 2005, рэж. Бэн Янгер.

Рамантычная камэдыя.

У 37-гадовую Рафі закахаўся 20-гадовы мастак. Рафі, занепакоеная такім падарункам лёсу, зьвяртаецца да псыхааналітыка Лізы. Доктарка раіць гераіні проста расслабіцца дый адчуць асалоду. Так усё й адбываецца... Але высьвятляецца, што Рафі круціць раман з сынам Лізы.

**АНТ, 00.25**

«Ненажэра».

Францыя, 2003, рэж. Т'еры Біністы.

Драма паводле коміксу Бэнаквіста і Фэрандэса.

Камісар Сэлена — суворы абаронца закону на вуліцах Марсэлю. Але ягоная слабасьць — абжорства. Да таго, расьсьледуючы забойства, Сэлена закахаўся ў Эльзу, якую падазрае ў злачынстве. Ён прапануе дзяўчыне згубіць доказы, калі яна будзе вячэраць зь ім... Ролі выконваюць: Эрык Кантана, Рашыда Бракні, Рышар Барынжэ.

### Нядзеля, 23 ліпеня

**БТ, 12.35**

«Балада пра годнага рыцара Айвэнга».

Расея (СССР), 1983, рэж. Сяргей Тарасаў.

Савецкая экранізацыя слыннага твору. Каштоўнасьць фільму надае Ўладзімер Высоцкі — аўтар і выканаўца балядаў.

**БТ, 22.10**

«Містэр і місіс Сьміт».

ЗША, 2005, рэж. Даг Лайман.

Камэдыйны баявік.

Джон і Джэйн Сьміт стомлены сваім шлюбам. Каханьне аджывае, калі героі даведваюцца пра сапраўдныя прафэсіі адно аднаго. Джон і Джэйн — наёмныя забойцы, кожнаму замовілі супруга… Уздымае над будзённасьцю.

У галоўных ролях Брэд Піт і Анджэліна Джолі.

**Андрэй Расінскі**

## КІНО НА DVD

### MASTER RECORDS

**Пасека.**

Трымценьнік-казка, Расея, 2002, сцэнар і пастаноўка **А.Кагадзеева і Н.Капейкіна.**

У ролях: **Л.Лівер, І.Паламодаў, К.Мілер.**

Героі анэкдотаў, казачныя пэрсанажы і кіношныя пачвары ў адным фляконе...

Праект андэграўнднай студыі «НОМ-фільм».

**Менск, Кісялёва 12, 643-21-08**

## КАНЦЭРТЫ

**Birthday Party Вайцюшкевіча**

**20 ліпеня** а 19–й у малой залі канцэртнай залі «Менск» можна паслухаць Зьмітра Вайцюшкевіча зь сябрамі. Даведкі: 206–66–38, 608–9–608.

**Басовішча-2006**

21—22 ліпеня ў Гарадку (Польшча) пройдзе 17–ты фэстываль музыкі маладой Беларусі «Басовішча–2006».

Хто мае візы, калі ласка на Беласточчыну!

**Ракуцёўскае лета — 2006**

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Маладэчанскі райвыканкам і Літаратурны музэй Максіма Багдановіча запрашаюць на Сьвята паэзіі і песьні «Ракуцёўскае лета — 2006», што адбудзецца 30 ліпеня 2006 году а 12–й гадзіне. Сьвята адбудзецца ў філіяле «Фальварак Ракуцёўшчына», вёска Ракуцёўшчына.

## ТЭАТАР

**Купалаўскі тэатар**

**27, 28** (чц, пт) — «Маэстра».

## ВЫСТАВЫ

**Неафіцыйныя дні Мэксыкі ў Менску**

З 13 ліпеня па 5 жніўня ў Музэі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр. Скарыны, 47) пяцёра розных беларускіх мастакоў — Дзіна Даніловіч, Леанід Мядзьведзкі, Вольга Хахлова, Максім Восіпаў, Сяргей Сотнікаў — паказваюць менскаму гледачу свае ўяўленьні пра Мэксыку: праз жывапіс, фатаграфію, скульптуры, інсталяцыі, а таксама жанры, якія цяжка вызначыць.

Аўтары праекту ніколі не былі ў Мэксыцы і не хаваюць гэтага, але яны чыталі артыкулы ў турыстычных брашурах, кнігі пра індзейцаў і глядзелі мэксыканскія сэрыялы. Выстава працуе з 11.00 да 19.00.

## СПОРТ

**Футбол. Чэмпіянат Беларусі. 14-тур**

21 ліпеня

«Дынама» (Менск) — БАТЭ (Барысаў).

Стадыён «Дынама». Пачатак а 19–й.



Данчык.
«Мы яшчэ сустрэнемся»

Упершыню на CD!

Нацыянальныя гімны «Пагоня», «Магутны Божа» і іншыя.

# Да Купалы зь вершамі



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Ужо другі год запар у Ляўках на Аршаншчыне адбываецца Сьвята вольнай беларускай паэзіі. Паэтычныя чытаньні ладзяцца ў форме народнага сьвята — безь вядоўцаў, без заўважнага падзелу на паэтаў і слухачоў. А куды яшчэ прывозіць вершы, як не да Купалы ў Ляўкі? Пагатоў што і сьвята прымеркавана да паэтавага дня нараджэньня.

Пра «выпяканьне» першага леташняга «бліна» дбалі ў тым ліку і ўдзельнікі літаратурна–мастацкага пленэру імя Уладзімера Караткевіча. Але сёлета ў Ляўкі не прыехалі ні маладыя гадаванцы літсуполак, ні прызнаныя паэты, якія каторы месяц скардзяцца, што ня маюць магчымасьці сустракацца з чытачамі. І дарма! Тут іх зь вялікім задавальненьнем ноч навылёт слухалі б ня менш за два дзясяткі слухачоў: сёньня столькі часам і ў Менску не зьбярэш. Паэзія жыве тут у сваім натуральным выглядзе — у жывым гучаньні ад аўтара да слухачоў, не карыстаючыся мёртвым пасярэдніцтвам паперы.

Адсутнасьць гучных імёнаў, аднак, ня сталася для ляўкоўскага фэсту вялікай перашкодай: тым ярчэй зьзялі зоркі маладых талентаў. Так, сапраўдным адкрыцьцём сёлетніх чытаньняў стаў студэнт Беларуска–расейскага ўнівэрсытэту з Магілёва Віталь Рыжкоў. Ягоныя вершы з жорсткай вулічнай паэтыкай (дзе зрэдзьчасу адчуваецца ўплыў ранньяй творчасьці Маякоўскага) упрыгожылі б любы часопіс.

Магілёўцы ўжо другі год запар прыяжджаюць у Ляўкі вялікай прадстаўнічай дэлегацыяй, складаючы каля паловы ўдзельнікаў сьвята. Сёлета на сьвяце была практычна цалкам беларускамоўная дэлегацыя (каля 10 чалавек) зь Беларуска–расейскага ўнівэрсытэту.

Летась сапраўднай прымадоннай фэсту была аўтарка «НН» Тацяна Барысік з Магілёва, чые вершы й аповеды з настаўніцкага жыцьця выявілі сур'ёзнага канкурэнта заезным Жванецкім ды Задорнавым. Год таму Тацяна вытрымала важкую аўтарскую трохгадзінную сатырычную праграму. Сёлета яна прыехаць не змагла, бо гадуе дзіця. Аднак ейныя творы ўсё ж гучалі сярод іншых. Удзел у сьвяце могуць узяць ня толькі паэты, але і проста аматары паэзіі: адзін зь іх і чытаў сёлета Тацяніны вершы.

З сваімі новымі вершамі прыехаў Сяржук Семянюк зь Менску — паэтычнае адкрыцьцё леташняга фэсту. У сваіх творах ён спрабуе знайсьці мову сёньняшняй паэзіі, збліжаючы інтымную лірыку з гучаньнем штодзённасьці. Прывезеныя вершы Сяржук пасьля прачытаньня спальвае на вогнішчы.

Аршаншчына паціху займае нішу паэтычных фэстаў на вольным паветры. Да традыцыйнага бардаўскага крапівенскага фэсту цяпер дадаецца чыста паэтычны ляўкоўскі. Думаецца, яго чакае ня менш слаўная будучыня.

**Адам Воршыч, Ляўкі**

# лІтаратурНы сшытак «НН»

*ліпень 2006*


Андрэй Лянкевіч. З жыцьця пад мастамі ..... 27
Апавяданьне Аляксандра Апона «Азіятка і кампанія» ..... 28
Зьбігнеў Гэрбэрт. Будзь адважны ..... 31
Ігар Бабкоў гутарыць з Натальляй Гарбанеўскай ..... 32
Аляксандар Фядута перачытвае Андрэя Макаёнка ..... 34
Апавяданьне Анджэя Стасюка «Васіль Падва» ў перакладзе Марыі Мартысевіч ..... 36
Міхась Скобла разьвітваецца зь Любай Тарасюк ..... 37
Сяргей Прылуцкі. «Дывэртысмэнт для ІК» ..... 38
Сяргей Балахонаў. «Штрых-код адзіноты» ..... 39


## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

З цыклю «Старая спадчына». САНЭТ

*А.Л.Пагодзіну*

Паміж пяскоў Эгіпецкай зямлі
Над хвалямі сінеючага Ніла
Ўжо колькі тысяч год стаіць магіла:
Ў гаршчку насеньня жменю там знайшлі.
Хоць зернейкі засохшымі былі,
Ўсё ж такі жыцьцёвая іх сіла
Збудзілася і буйна ўскаласіла
Парой вясеньняй збожжа на ральлі.

Вось сымбаль твой, забыты краю родны!
Зварушаны нарэшце дух народны,
Я верую, бясплодна не засьне,
А ўперад рынецца, маўляў крыніца,
Каторая магутна, гучна мкне,
Здалеўшы з глебы на прастор прабіцца.

**Максім Багдановіч, Яраслаўль**
**«НН», 1911, №25-26**

# А ты падпішыся!



**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,**
проста паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас. Адначасова Рэдакцыя зьвяртаецца з просьбай ахвяраваць на выданьне. Дэталі — **старонка 26.**

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Аўтару «А што далей?».** На пытаньне, выведзенае ў загаловак, Ваш тэкст і не адказвае. Вы свой боль выліді, а мусім глядзець за даляглад, у прышласьць.

**Маладым паэтам.** Каб добра пісаць — трэба перадусім быць добра адукаваным чалавекам з багатым унутраным сьветам. Таму найперш цяпер — жыць, пасьля — вучыцца і толькі пасьля — пісаць. Гэта першае. А другое — калі пісаць, ня варта абмяжоўваць сябе паэзіяй (прынамсі, да 40 гадоў). Спрабуйце ў розных жанрах, вучыцеся ў найлепшых пісьменьнікаў, прычым вельмі важна, каб у іншамоўных сучасных таксама.

**Р.Ю.** Вершы да 100-годзьдзя «Нашай Нівы» надрукуем, астатнія вершы слабейшыя.

**Стасю Н. зь Менску.** Сэрца Ваша палае, а вершы тэхнічна слабыя.

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІНШАВАНЬНІ

**Віншуем бацьку** Сямёна з 60-годзьдзем. Зычым моцнага здароўя. Мы з табою. Сыны

**Дзядзьку Аляксандра** віншуем з народзінамі. Добрага здароўя, вытрымкі і аптымізму. Печанкі

### ДАВЕДНІК

**Падрыхтаваны энцыкляпэдычны даведнік** «Рэпрэсаваныя сьвятары». Калі вам вядома што пра пакутнікаў або ёсьць магчымасьць паўдзельнічаць у праекце, тэлефануйце: 753-82-12, (017) 211-09-53. Леанід Маракоў.

### ВАНДРОЎКА

**Зьміцер Касьпяровіч запрашае** ў падарожжа па маршруце: Альбярцін—Сынковічы—Слонім—Нянадавічы—Раготна—Дварэц—Дзятлава. Тэл.: 292-54-58, 622-57-20 («Вэлкам»), 509-12-16 (МТС)

### ЛЕЦІШЧА

**La Brasłava zdamo lecišča** sapraŭdnym bielarusam z 3 pa 14 zniŭnia. Mabilny: 590-48-22 (Iryna). Dziakuj!

### ТРАКТАР

**Куплю трактар** МТЗ. Тэл.: (029) 164-93-85


**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі Наста Бакшанская
галоўны рэдактар Андрэй Дынько
фотарэдактар Арцём Лява
нам.галоўнага рэдактара Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар Сяргей Харэўскі
выдавец і заснавальнік Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**


© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220030, г. Менск, вул. Калектарная, 20а-112. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.
Наклад 2471. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 19.07.2006.
Замова № 3966.
Рэдакцыйны адрас: Калектарная, 20а-112.